

**юры станкевіч**

# БРАМНІК ЗАЎЖДЫ САМОТНЫ

**Юры Станкевіч**

# Брамнік заўжды самотны

*Аповесць,*
*апавяданні*

Мінск
"Галіяфы"
2014

УДК 821.161.3-32
ББК 84(4Беи)-44
С76

**Станкевіч, Ю. В.**

**С76** Брамнік заўжды самотны: аповесць, апавяданні / Юры Станкевіч. — Мінск: Галіяфы, 2014. — 144 с.
ISBN 978-985-7021-25-3.

Новая кніга Юры Станкевіча разлічана на тых, хто любіць спорт, прыгоды, актыўнае, здаровае жыццё. Дзеянне прадстаўленых у зборніку мастацкіх твораў адбываецца як у сучаснасці, так і ў далёкім або блізкім мінулым; часам яно нясе прытчавую ці фантастычную афарбоўку.

Аповесць "Брамнік заўжды самотны" распавядае пра маладога і вельмі таленавітага футбаліста, брамніка па прызванні, які хоча стаць такім самым вялікім галкіперам, як Луіс Чылаверт.

Псіхалогія юнакоў і дзяўчат, тэмы мужнасці і кахання — усё гэта складае змест кнігі.

**УДК 821.161.3-32**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-7021-25-3**

© Станкевіч Ю. В., 2014
© Афармленне ПВУП "Галіяфы", 2014

# Змест

**Брамнік заўжды самотны. Аповесць ................ 5**

**Апавяданні ................................................. 49**

Заручыны ................................................. 51
Сіцыліянская партыя ................................. 56
Тэрыторыя шчасця ..................................... 65
Кармушка для сініц .................................... 70
Праснакі на выбар ..................................... 79
Восы ........................................................... 83
Жалезны госць .......................................... 90
Мой дурнаваты старэйшы брат ................... 97
Лаўцы верхаводак .................................... 102
Заданне для стажора ................................ 123
Рытуальнае сэппуку наборшчыка Гутара ...... 130



# БРАМНІК ЗАЎЖДЫ САМОТНЫ

*Аповесць*

## Замест уступу

Ён нягучна пастукаў у дзверы і на Максімава "не зачынена" ўвайшоў у сціснуты куток, дзе ледзь месціліся ложак, падрапаны стол і рыпучае крэсла. На выгляд яму было каля сарака гадоў: сярэдняга росту, у чорным плашчы, вакол галавы з гладка зачасанымі назад валасамі колеру саломы нібы гайдалася вузкае кола святла. Каб не гэта, дык, адным словам, дзядзька з вуліцы.

— Вы хто такі? — здзіўлена спытаў дванаццацігадовы Максім Гудаў. — Калі да бацькі, то ён спіць.

— Я да цябе, Максім, — сказаў незнаёмец і дадаў сарамяжліва: — Я — анёл. Імя — Херувім. Прыйшоў, каб выканаць тваё адзінае жаданне. Заўваж — адзінае.

— Нешта не верыцца.

— Нікому не верыцца.

— А што ад мяне трэба? — крыху памаўчаўшы пацікавіўся хлопчык.

— Загадаць. Толькі і ўсяго. Да кожнага чалавека ў дзяцінстве прыходзіць нехта з анёлаў. Заўваж, толькі аднойчы. Хто што просіць. Адзін — цукерак, другі — ровар, трэці... Але... Што жадаеш ты? Хвіліну на роздум. Больш часу не маю.

— Не трэба хвіліну, — хлопчык па прозвішчы Максім Гудаў паказаў рукой на сцяну, дзе вісеў плакатны аркуш з выявай футбаліста. — Хачу быць галкіперам. Варатаром. Такім жа вялікім, як ён.

Анёл падышоў да сцяны, угледзеўся ў плакат і сказаў:

— Такім ты быць не здолееш, бо яму, калі ён яшчэ выступаў, не было роўных. А ўсё вялікае —

непаўторнае. Але — тваё жаданне я занатоўваю. Ты не пашкадуеш. Вось я тут, на аркушы, стаўлю подпіс. Цяпер бывай.

— Бывай і ты, — развітаўся хлопчык і... і прачнуўся. У пакойчыку нікога не было. Максім Гудаў перавёў позірк на сцяну. Знаёмая постаць у карычневай футболцы з выявай тыгровай галавы. Мужны квадратны твар, кароткая стрыжка.

"Хасэ Луіс Фелікс Чылаверт Гансалес, — прачытаў ён у які ўжо раз. — Парагвайскі галкіпер. Нарадзіўся 27 ліпеня 1965 г. у г. Лука. Рост 1 м 92 см. Удзельнік двух чэмпіянатаў свету. Аўтар адзінага ў свеце "хет-трыка" сярод вратароў. Выключны пенальціст і выканаўца штрафных удараў. Забіў за спартыўную кар'еру 62 галы."

...Але што гэта?

Хлопчык ускочыў і ўсутыч наблізіўся да плаката на сцяне.

Знізу нешта высвечвалася, нейкі надпіс.

І раптам ён прачытаў: "Згода. Херувім".

## I
## "Гранд-стадыён". Францыя. Ліён

Са свайго месца на "банцы" — лаўцы запасных — васямнаццацігадовы Максім Гудаў убачыў, як іх асноўны варатар — трыццацігадовы Сяргей Румаш — выскачыў на перахоп і ў паветры, у скачку сутыкнуўся з абаронцам супернікаў з "Ліёна", які незаўважна, з-за спіны, падключыўся да атакі. Цемнаскуры, мажнага целаскладу "лібера" ішоў на "набяганне" з выстаўленым каленам, што і вырашыла лёс Сяргея Румаша ў гульні.

Збіты з ног, ён памкнуўся ўзняцца, але спробы, адна і другая, былі дарэмныя. Суддзя на полі, англічанін Стайлз, у жыцці паліцэйскі, паказаў цемнаскураму абаронцу ўсяго толькі "гарчычнік" і спыніў матч. Выклікалі ўрача і адразу "брыгаду". І не паспелі яшчэ пакласці асноўнага варатара Румаша на насілкі, каб вынесці з поля, як "коўч", галоўны трэнер — Пал Палыч Грак — схапіўся спачатку за галаву, спадзяваўся, можа, што будзе выдаленне, але хутка апамятаваўся і змрочна кінуў яму: "Размінайся ў тэмпе і — на паляну".

Замена. І калі ўжо выбягаў, нацягваючы пальчаткі, да сваёй штрафной, пачуў услед: "Пацярпі да перапынку, не прапусці".

Пакуль бег, падумаў сам сабе, што вось ён, галкіпер з дубля, якога лічы што выпадкова павезлі за іх каманду — "Рэйду" — на адну шаснаццатую Лігі Еўропы, нечакана (верагодна, толькі на гэты матч) будзе стаяць за "аснову". І ўсё з-за таго, што атрымаў траўму другі варатар, а цяпер, выцякае, — і першы, Румаш. Менавіта яму зараз давядзецца выцягнуць за ўсіх увесь цяжар, і на які момант ён жахнуўся, але думаць ужо не было ні часу, ні магчымасці, тым больш — баяцца. Толькі прыгадалася: а як зрабіў бы на яго месцы вялікі Луіс Чылаверт, яго кумір?

А вось і яго "гаспадарка". Вароты, як і паўсюдна, памерам сем трыццаць два на два сорак чатыры метра, ды штрафная перад імі. Ды яшчэ мяч. Ён выбіў яго далёка наперад — няхай адчуюць яго ўпэўненасць.

Стадыён загудзеў. Увогуле цяперашняя гульня — па сутнасці суцэльны для гаспадароў гандыкап. Каб выйсці ў чарговы раўнд, яго камандзе трэба альбо

нічыя з нулявым вынікам (і тое ў залежнасці ад таго, як згуляюць у групе), альбо перамога. Але, паводле настрою, па ўнутранай перакананасці (а ён адчуваў яе) гатоўнасці, імпэту да перамогі — не было. Не "каціў" у іх тэму і так званы "аўтобус" — звышабаронная тактыка. Каб стварыць сапраўдны "бетон" у абароне, рэальных сіл не хапала. І спадзявацца ім заставалася хіба толькі на ўдачу.

Хаду матча ён прадбачліва чытаў. Гульню "Ліёна" вёў іх плэймейкер Бурэ — паходжаннем з Метраполіі, белы, вопытны распасоўшчык і дырыжор. Крайнія нападаючыя, часта мяняючыся месцамі, раз-пораз разрывалі абарону. Урэшце, адзін з гэтых "аўтсайдаў", Фаркон, выскачыў на ўдар, і ён толькі на ўзроўні падсвядомасці выцягнуўся ў струну і адбіў мяч кончыкамі пальцаў. Стадыён расчаравана выбухнуў тысячамі галасоў. "Сэйв! — падумаў ён сам сабе. — Выдатны сэйв!" — і, падымаючыся, убачыў краем вока, як "коўч" Палыч далёка за броўкай ускочыў з лаўкі і ўскінуў угору вялікі палец. Толькі цяпер ён унутрана супакоіўся. Гэты ўдалы сэйв надаў яму ўпэўненасці. Ён стаў адрозніваць ігракоў з каманды сапернікаў, успамінаў урыўкамі іх характарыстыкі з прагляду фрагментаў гульняў, з перадматчавай разборкі, якой так усякі раз надаваў значэнне Палыч. «Толькі б не "праваліліся" абаронцы, — мільгала ў яго галаве. — Вытрымаць і не прапусціць». Да перапынку, між тым, яшчэ заставалася хвілін трыццаць.

Але ўжо праз хвіліну іх "вінгер" — ігрок, які любіць прарывацца да чужых варот па броўцы, падманным фінтом праскочыў абаронцу Жалкевіча (гэх, Жэня, Жэня!) і зрабіў хітрую і дакладную

перадачу, якой і пачалася знакамітая чатырохходовая камбінацыя — нібы з навучальнага фільма, і замкнуць яе ўжо набягаў усюдыісны Бурэ.

— Я! — закрычаў тады ён, як звычайна крычаць галкіперы, калі бяруць на сябе адказнасць за небяспечны эпізод, і рвануўся таму насустрач, па магчымасці закрываючы цэлам сектар варот. Але ўсё той самы Жэня Жалкевіч, тупа раззлаваны і ўзбуджаны сваім папярэднім пралікам, літаральна скасіў Бурэ проста ў пачатку штрафной. Тут як тут бег ужо да іх рэферы Стайлз са сваёй знакамітай з'едлівай усмешкай на твары.

Лысы яго чэрап блішчэў ад поту. Масіўныя скіўіцы сціскалі свісток. Не марудзячы, ён крыважэрна паказаў на "кропку" — адзінаццаціметровую адзнаку.

Пенальці.

Стадыён падняўся і зароў.

"Што ж, — падумаў ён. — Такія моманты для галкіпера непазбежныя. Гульня ёсць гульня". Толькі не расслабіцца, узважыць усё: хто будзе біць, які спакваля кіне позірк і ў які вугал варот, біць з якой нагі і, адпаведна з тым, як пачне разбег? Пачуццё самоты раптоўна нахлынула на яго і гэтаксама імгненна адступіла. Так, ён адзін, і гэта нармальна.

Дык усё-такі — хто? Мяч, тым часам, забраў Стайлз і сам панёс і паклаў яго на "кропку". Урэшце, як і чакалася, да яго "скіраваў" пацярпелы.

Дык вось — Бурэ. Ён і будзе выконваць. Цяпер варта сачыць за ім, за кожным рухам. Так, паправіў мяч, уладкаваў яго на самы кончык адзнакі — усё-такі на некалькі сантыметраў бліжэй да варот. Знаёмая хітрасць. Кінуў імгненны позірк

у адзін вугал, у другі. Панізу. Так, хутчэй за усё будзе біць нізам у адну з "шасцёрак" — ніжніх зон створа варот ля штангі. Пэўна, ужо прыгадаў, што рост галкіпера, яго, Максімаў рост, больш за сто дзевяноста, і значыць, ён можа выцягнуць верхні мяч, калі, вядома, прыгадае вугал. А вось ніжні — наўрад. Пайшоў і спыніўся для разбегу.

Што рабіць? Узяць пенальці — для варатара першая і ганаровая справа. Але ж зрабіць гэта заўсёды вельмі цяжка: прыкладна адзін шанец з дзесяці. Кожны з галкіпераў у такіх непажаданых выпадках выкарыстоўвае свае асабістыя напрацоўкі і хітрасці. Ён раптам успомніў адну з парадаў трэнера Палыча на гэты кшталт — збіць праціўніка з панталыку, і падумаў: а раптам спрацуе?

Максім хіснуўся ў правы бок, нагнуўся і зрабіў выгляд, што падымае з зямлі ці то каменьчык, ці то страчаны кімсьці шып ад бутсы. Той, хто будзе біць, вырашыць, што варатар кінецца менавіта ў гэты правы ніжні вугал, дзеля чаго цяпер і рыхтуецца, а каб не атрымаць траўму, нешта падбірае з зямлі.

З іншага пункту гледжання — гэта можа быць псіхалагічны падман. Але ў выканаўцы няма часу думаць. Яго падсвядомасць хістаецца ад супрацьлеглых маланкавых памкненняў, і... хутчэй за ўсё, ён выбірае менавіта супрацьлеглы вугал, а не той, адкуль нешта падабрана.

Варатар Максім Гудаў прыгнуўся і на які момант замёр у чаканні.

Чым будзе біць Бурэ? "Пад'ёмам"? "Пырам"? "Шведкай" — гэта значыць знешняй паверхняй ступні, альбо ўнутранай — "шчоткай"? А то яшчэ "паненкай" — знакамітым ударам па навеснай

траекторыі даўняга вядомага чэшскага іграка Паненкі?

Урэшце, як бы ён ні біў — галоўнае, угадаць, у які бок паляціць мяч. Дакладней — у які вугал? Сачыць за разбегам. Так, свісток Стайлза. Разбягаючыся, Бурэ ледзь змясціўся ў правы ад яго бок. Значыць... будзе біць нізам і ў левы вугал. Верагодна, усяго толькі верагодна. Але...

І ён, на якое імгненне раней, апераджаючы ўдар Бурэ, кінуў цела і правую руку ў ніжні левы вугал, і... мяч, адчувальна драпнуўшы кісць, змяніў напрамак, чыркнуў па бакавой стойцы і — вылецеў за вароты.

Стадыён зашумеў, закрычаў.

— Так! — закрычаў і ён разам з ім, і радасць выбухнула ў ім, і, высока падскочыўшы, ён сekануў рукой паветра. — Так! Я ўзяў пенальці! Так! Выцягнуў з самага вугла!

Упэўненасць спакваля авалодала ім. І хоць пачуццё самоты засталося, амаль што знікла боязь прапусціць недарэчны гол, якога так прагнуў цяпер увесь саракатысячны натоўп тутэйшых заўзятараў ды яшчэ ў сто разоў большая іх колькасць перад экранамі тэлевізараў. І не меншая колькасць прыхільнікаў яго каманды там, на радзіме, спадзявалася зараз на яго спрыт і ўменне авалодаць сабой і сітуацыяй і, адпаведна, спадзявалася, што ён не прапусціць.

Валодаць сабой — вось за што ён увесь час змагаўся. Максім часам небеспадстаўна лічыў, што з нараджэння надзелены, хоць і ў малой ступені, зародкамі аўтызму, гэтай хваробай стагоддзя, пра якую раней амаль нічога не ведалі, але цяпер, дзякуючы распрацоўкам вядомых псіхааналітыкаў,

азнаёміліся многія. Ва ўсялякім разе ён зноў і зноў перасільваў у сабе падсвядомае жаданне схавацца, зрабіцца непрыкметным, незаўважным ад усіх. Тым больш у такія адказныя моманты, як гэтая лёсавызначальная для іх усіх гульня.

Між тым гульня набывала своеасаблівую ўнутраную напружанасць. У гаспадароў пляцоўкі не атрымаўся "хуткі" гол, якога, пэўна, дабіваўся на ўстаноўцы перадусім іх трэнер, і каманда па ходзе матча змяняла рытм. Барацьба цяпер ішла пераважна ў цэнтры поля, дзе асноўная нагрузка прыходзілася на паўабаронцаў. Тут ужо амаль усё вырашала тэхніка прыёму і адпасоўкі мяча ў адзіны рух, пра што ім бесперапынку даводзіў патрабавальны Палыч і што яны дзень у дзень адпрацоўвалі на трэніроўках.

Хвілін за пятнаццаць да перапынку ён ужо двойчы выходзіў на перахват пры падачы карнераў і абодва разы паспяхова. Але расслабляцца не выпадала. Метрах у дваццаці ад яго штрафной пляцоўкі абаронца Віталь Шаўцоў (гэх, Віталь, Віталь!) неабдумана "заваліў" форварда сапернікаў, вопытнага, хітрага і, як ён ведаў, схільнага да сімуляцыі Анры Базэна. Штрафны. І вельмі небяспечны за нападзенне на іграка ў атацы. У дадатак, як і чакалася, Стайлз палез у кішэню і выцягнуў "гарчычнік".

Максім захваляваўся, паказаў абаронцам, каб правільна і хутчэй паставілі сценку, сачыў за тым, што адбывалася ля мяча. Намер біць выказалі двое, яшчэ адзін адцягнуўся крыху назад. Хутчэй за ўсё ён будзе біць верхам і пад распасоўку. Наіграная камбінацыя. Стайлз адступіў убок і свіснуў.

Мяч, хітра закручаны "шчоткай", імкліва вылецеў з-пад удару і пайшоў па крывой у левы верхні вугал варот. І цела яго па загадзе нервовых клетак, якія імгненна аддалі каманду мышцам, ірванулася ў той самы левы верхні, туды, у "дзявятку".

У скачку ён адчуў, як пальцы рукі ў пальчатцы сутыкнуліся з мячом, і той пайшоў уверх, за перакладзіну, на вуглавы.

Сэйв!

Стадыён расчаравана зашумеў.

## II
## Пяццю гадамі раней

Спякотным летнім вечарам — а ў наваколлі стаяла ўстойлівая гарачыня — у кватэры дырэктара і адначасова трэнера абласной дзіцячай футбольнай школы Міхаіла Катовіча прагучаў званок. Катовіч зняў слухаўку. Званіў дзіцячы трэнер з раённай спартшколы, яго даўні знаёмы Пётр Сманцар.

— Міхась! — сказаў ён пасля некалькіх дзяжурных фраз. — Я знайшоў у пасёлку Лаўніца — гэта тэрыторыя нашага раёна — цікавага хлопчыка. Яму трынаццаць год, і ён гуляе ў незвычайны футбол. Табе варта залічыць яго да сябе — не пашкадуеш.

— Што ж у ім такога незвычайнага, Пётра?

— Гэта — будучы варатар ад Бога. Я выпадкова паглядзеў адну мясцовую дзіцячую гульню. Ён адзін варты ўсёй каманды. Заўтра ў іх фінал на мясцовай "паляне". Ты б даслаў каго са сваіх скаўтаў .

— Не магу. Сам ведаеш — час адпачынкаў. Схадзі, калі здолеш. За мной, як кажуць, не прападзе.

— Атлусцеў ты там у вобласці. Ведаеш жа, што і я — у адпачынку, і футбол — не мой профіль. Бывай!

І трэнер Пётр Сманцар раздражнёна кінуў слухаўку на рычаг.

Але назаўтра, калі крыху астыў, ён, быццам нехта штурхаў, усё-такі пайшоў на Лаўніцкі мясцовы стадыёнчык, занядбаны і неўпарадкаваны, дзе пачыналася ўжо традыцыйная летняя фінальная гульня дзіцячых каманд. Гульня амаль без заўзятараў праходзіла спачатку даволі вяла. Варатар Максім Гудаў, які і быў мэтай яго інтарэсу, высокі, гнуткі хлопец, узяў пару мячоў, адзін з якіх, на думку трэнера Сманцара, быў стоадсоткава галявы, потым засумаваў, але неўзабаве стаў выяўляць сваю незвычайную актыўнасць: камандаваў абаронцамі, гнаў іх наперад, выбягаў з варот далёка за штрафную і, урэшце, выканаў пенальці — сам забіў гол.

***

Трэнер Сманцар, між тым, вырашыў давесці сваю добраахвотную місію да канца, вылавіў пасля гульні хлопчыка, прадставіўся і прапанаваў:

— Не супраць, калі я пагавару з тваімі бацькамі? Пара табе, братка, рэалізавацца ў жыцці.

Высокі, пад сто восемдзесят — вызначыў Пётр Сманцар — хлопчык зацікаўлена агледзеў незнаёмага дзядзьку шэрымі вачыма, нерашуча правёў далонню па коратка стрыжанай светлавалосай галаве.

— Навошта? І пры чым тут бацькі?

— Табе варта пачаць ездзіць на трэніроўкі ў абласную футбольную школу. Упэўнены — цябе залічаць.

— Праўда? — вочы хлопчыка ўспыхнулі радасцю.

— Зуб стаўлю, — пажартаваў трэнер Пётр Смансцар. — Там у мяне сябра дырэктарам — Міхась Катовіч. Былы футбаліст. Можа, чуў пра такога?

— Чуў, — памаўчаўшы сказаў хлопчык, — ён калісьці гуляў за "Дынама". Так?

— Добра, што ты ведаеш. Дык згода? Тады паехалі. Вунь і мая тачка стаіць.

Але адказам на прапанову была нечаканая зацятасць. Максіма нешта турбавала.

Усё высветлілася, калі трэнер Сманцар разам з хлопчыкам зайшлі да таго ў кватэру. Яшчэ ў кутку, у вітальні, ля вешака, ён мелькам убачыў сетку з пустымі бутэлькамі, убогую мэблю, пашарпаныя шпалеры, пачуў пах тытуню. І ўвогуле, пах неўладкаванасці і галечы.

Максімаў бацька, азызлы, з нездаровым тварам, сядзеў на кухні і паліў. Ад яго да таго ж ледзь улоўна несла алкаголем.

— У спартыўную школу? — спытаў ён. — Ну, дык у чым праблема? На здароўе. Няхай трэніруецца.

Трэнер Пётр Сманцар сеў на зэдлік, які яму прапанавалі, і пачаў тлумачыць. Да школы адсюль каля пятнаццаці кіламетраў. Туды ходзіць аўтобус. Трэніроўкі спачатку па тры разы на тыдзень.

— Аўтобус бясплатны? — перапыніў яго бацька хлопчыка.

— Не. Білеты і ўзмоцненая пайка — гэта ўжо ваш клопат.

— Тады я — пас. Вам трэба — вы і аплачвайце.

Нічога акрэсленага не сказала і маці хлопчыка, якая вярнулася з працы (бацька, як аказалася, быў увогуле часова беспрацоўны), крывіла вусны ў няшчырай усмешцы, таксама запаліла. Ёй было відавочна цяжка ад прысутнасці незнаёмца.

Трэнер Пётр Сманцар развітаўся і сышоў.

— Не крыўдуй на нас, Максімка, — адразу звярнулася да сына маці. — Прысядзь, паеш. Вось бацька ўладкуецца на працу — адразу замовім табе, што трэба.

— А пакуль тое, можа за бутэлечкай для вас збегаць? — з'едліва спытаў ён. — Ці пустую тару здаць? — І, грукнуўшы дзвярыма, выскачыў з кватэры.

Так, ён крыўдаваў на бацькоў. І не за тое, што не знайшлі сябе ў жыцці, а за тое, што пачалі піць. З іншага боку — бацькоў не выбіраюць. Вось вырасце крыху — і ўсё будзе інакш. Гэ-х-х, як яму хочацца паступіць у тую знакамітую школу, стаць футбалістам! Галкіперам. Такім, як вялікі Луіс Чылаверт. Напісаць бы яму ліст, спытаць парады. Але...

Максім спыніўся ў роспачы. Сонца перайшло ў зеніт. У двары было пуста. Пагаварыць з кім? Няблага б з Юляй, дзяўчынкай з паралельнага 6 "Б", з якой зусім надаўна пачаў сябраваць. Дык яна, пэўна, на лецішчы. Пайду да цёткі — урэшце вырашыў Максім.

***

— Заходзь, — абрадвалася пляменніку цётка Люба. — Абедаў сёння? Гавары праўду.

— Не паспеў.

— Нешта ты змрочны. Зноў з бацькамі дрэнна? Ну, можаш не адказваць, і так усё бачна. Сядай за стол — будзеш есці.

Праз гадзіну ён выклаў цётцы ўсё. Любіў яе. І што бацькі п'юць, і што ён вельмі хоча трэніравацца ў спартыўнай футбольнай школе, і што няма грошай на праезд. І ўвогуле — у яго дома няма нават якога таннага камп'ютара і таго горш — ён не мае мабільніка. А ён так хоча глядзець у запісу матчы з удзелам свайго ўлюбёнага Луіса Чылаверта. І што надакучыла і сорамна прасіць, каб яму далі гэтых запісаў-праглядаў, асабліва чэмпіянатаў свету, у сяброў аднакласнікаў, калі заходзіць да тых у госці.

Цётка Люба слухала, ківала, думала нешта сваё.

А праз дзень уручыла яму мабільны тэлефон і грошы — на праезд.

— Месяцы на тры хопіць, — дадала яна, — а потым разбяромся. Не згубі мабільнік. Гэ-х ты, сваяк мой гаротны. А камп'ютар, ужо прабач, пабагацееш — дык купіш сам. Ахвярую — што магу.

Ён горача дзякаваў. Абяцаў цётцы дапамагаць, чым можа. Ведаў і ўвесь час памятаў, што цётчына дачка Вольга захварэла на анкалогію і памерла ў дзіцячым узросце, а муж сышоў да маладой, і што цётка Люба ўвесь час адна. І не сказаць, што заможная.

## III
## "Гранд-стадыён". Францыя. Ліён

Корнер — гэта заўсёды вялікая небяспека для галкіпера. Не раз і не два Палыч, як трэнер, паўтараў яму, што асцярожнасць — не загана, і кожны

выхад з варот на перахват мяча павінен быць маланкава і з матэматычнай дакладнасцю пралічаны на адпаведнасць, інакш ствараецца рэальная рызыка прапусціць крыўдны мяч. У кожнай камандзе існуюць засакрэчаныя найграныя камбінацыі на падачу вуглавога ўдару. Выконвае такі вуглавы звычайна адзін і той самы ігрок, альбо два. Перадусім ён калі-некалі сігналізуе, як будзе біць, у якую кропку ля варот, каб туды набягалі паўабаронцы, форварды ці падкраўся хто з высакарослых бэкаў, альбо проста разыгрывае мяч кароткім пасам на выхад у штрафную саперніка.

...Цяпер гаспадары "паляны" спяшаліся, і чарговы вуглавы, не раздумваючы, разыгралі кароткім пасам у адзін дотык. Мяч падхапіў паўабаронца Нумба — увішны мурын з шапкай заплеценых валасоў на галаве — дрэдамі, і пачаў змяшчацца да цэнтра, неблагім дрыблінгам абышоў паўабаронцу Віталя Шаўцова, а пасля аднаго з бэкаў — Максім нават не паспяваў заўважыць каго, пракінуў мяч сабе пад удар, пад левую нагу. Знаёмы яго фінт для варатара. Максім памятаў гэта з папярэдняга прагляду відэазапісу. Тым не менш удар заспеў яго знянацку. Мяч пайшоў верхам, у правую дзявятку. Менавіта туды, захапіўшы, як рэзерв на паратунак, некалькі дзясятых доляў секунды, і кінуў ён у скачку сваё цела. Ад рукі мяч зрыкашэціў у перакладзіну і непрадказальна вылецеў назад, у штрафную, куды ўжо набягалі і форварды гаспадароў, і свае бэкі. У мітусні апошнія і выбілі мяч за бакавую.

"Сэйв!" — падумаў ён, падхопліваючыся з зямлі.

Стадыён зноў расчаравана ахнуў. Напруга крыху аслабела, але пільнасць, як ён адчуваў, не варта

было губляць нават на імгненне. Недарэмна, як ён ведаў, за дзевяноста хвілін матча варатар губляе ў вазе ад трох да пяці кілаграмаў.

Між тым, час хоць, на яго погляд, вельмі марудна, але няўмольна для гаспадароў, бег да перапынку. Няўмольна, бо ісці ў распранальню, не забіўшы гола, яны, гаспадары пляцоўкі, не жадалі. Пэўна, на гэта і была ўстаноўка іх трэнера. Забіць. Хоць бы адзін мяч. Тады і з'явіцца ўпэўненасць у сваіх сілах, і наадварот — пачуццё прыгнечанасці ў гасцей. Як ужо ведаў Максім — у спартыўнай прэсе прагназавалі вынікі дзвюх сустрэч. У мясцовых сродках масавай інфармацыі ў спартыўнай прэсе цалкам аддавалі перамогу сваёй камандзе, і наадварот — лічылі іх, футбалістаў з невядомай Беларусі, аўтсайдарамі, вартымі памяркоўнай паблажкі, ледзь не пагарды. Успрымалі трэцеразрадным заводскім клубам, які цудам прасачыўся ў плэй-оф Еўралігі, і тое, дзякуючы зніжцы ўзроўню асабістага складу каманды, жаданнем даць адпачынак "асноўнікам" перад адказнымі матчамі. Букмекеры цалкам нібы змовіліся — прымалі стаўкі на карысць гаспадароў пляцоўкі з максімальна завышаным каэфіцыентам.

***

Мяч зноў упарта затрымліваўся на іх палавіне поля. Максім бачыў, як паўабаронцы раз-пораз памыляліся і прайгравалі адзінаборствы. Хапала і тэхнічнага браку. «А што, калі ў гаспадароў выкінуць на замену, нібы чорцікаў з партабачкі, пару сваіх найлепшых форвардаў, так званых "джокераў"?» — думаў ён.

Але да замены пакуль не даходзіла. Пару разоў яму білі з-за штрафной, метраў з дваццаці пяці. Максім даволі ўдала адбіў абодва ўдары. Прадчуваў, што самае цяжкае чакае яго наперадзе. Пачуццё адзіноты зноў ахапіла яго, але ненадоўга.

Надзея ўспыхнула ў ім, калі раптам пабачыў, як завабіліся атакай гаспадары і "праваліліся" іх абаронцы — адразу двое. Нападаючыя, нашыя хлопцы, праскочылі іх і апынуліся проста перад варотамі Жуля Дзюпона — галкіпера гаспадароў, але на іх ужо набягалі, вярталіся бэкі. Не зусім падрыхтаваны ўдар хоць і з цяжкасцю, але выцягнуў з ніжняга вугла іх варатар. "Сэйв! — з павагай падумаў ён пра Дзюпона. — Выдатны майстра".

У сектарах нядобра загулі заўзятары. Да броўкі паляцелі фаеры, пацягнуўся дым. Удалечыні, метрах у сямідзесяці ад яго, Стайлз незадаволена засвісцеў, на некалькі секунд прыпыніў гульню. Фаеры патушылі і выкінулі з поля. Адначасова Стайлз праверыў свой гадзіннік, і Максім зразумеў, што вось-вось скончыцца гэты бясконцы для яго першы тайм.

Жуль Дзюпон, раз'юшаны тым, што ледзь не прапусціў, вымаўляў сваім бэкам нешта не вельмі для іх прыемнае. Выбіў мяч. І зноў на вароты Максіма пасунулася чарговая атака. Ігракоў рашуча падганяў наперад іх трэнер, што выбег да броўкі. Гол у раздзявалку! Гол! Забіце гол! — крычалі самі за сябе яго красамоўныя жэсты.

Пачалася сапраўдная навала. Нападаючыя, а за імі і абаронцы саперніка пачалі гнаць мяч наперад, да штрафной Максіма, там-сям уступаючы ў жорсткія адзінаборствы. У адзін з такіх момантаў ён літаральна "зняў" мяч з нагі Мбваны,

атрымаўшы моцны ўдар нагой у жывот. Наўрад ці справакаваны. Перахапіла дыханне. Але ён падняўся на ногі.

І ў той самы час прагучаў свісток Стайлза на перапынак.

## IV
## Трыма гадамі раней

Пасля чарговай трэніроўкі дырэктар школы папрасіў Максіма крыху затрымацца.

— Размова ў нас з табой будзе сур'ёзная, — пачаў ён. — Ты адзін з нашых найлепшых маладых футбалістаў, але гэтую школу ты ўжо пераўзышоў. На маю думку, табе больш мэтазгодна перайсці ў спартыўны інтэрнат. Там поўнае дзяржаўнае забеспячэнне, і табе варта ўжо вызначыцца, каб з часам пачынаць гуляць за які сур'ёзны клуб, але ты ўжо гэта збольшага вырашыш сам. Да таго ж ты, лічы, уключаны ў юніёрскую зборную рэспублікі. І, як я ведаю, многія старшыні праўленняў клубаў, трэнеры, шматлікія "скаўты", як кажуць, паклалі на цябе вока.

Хачу цябе, Максім, у гэтым сэнсе вельмі сур'ёзна папярэдзіць. На працягу сваёй спартыўнай кар'еры (калі ты, вядома, і далей будзеш займацца футболам) цябе будуць чакаць не толькі слава і захапленне заўзятараў, магчыма неблагія грошы, якія ты станеш зарабляць, калі трапіш у рукі больш-менш сумленных футбольных агентаў, трэнераў, але і цяжкія трэніроўкі, пераезды, якія будуць выматваць цябе ды, як правіла, адна адказная гульня ў тыдзень, зборы і матчы за рэспубліканскія

каманды. Будуць падпільноўваць траўмы — ад іх нікуды не дзенешся. На жаль, і сямейная неўладкаванасць. Запомні, што я табе кажу. Будзь абачлівым, як станеш падпісваць кантракты. Памятай, што ты талент, але за спінай у цябе няма падтрымкі ўплывовых бацькоў, сваякоў. Толькі ты адзін будзеш адказны за сябе. Але кажу гэта ўсё не дзеля таго, каб ты падумаў, што вось — я амаль што майстра, і кропка. Табе яшчэ далёка да сапраўднага майстэрства, у цябе яшчэ няма вопыту, і многія таленты, не меншыя за цябе, спыняліся і драбнелі, бо не хацелі расці далей, пераставалі працаваць, а то, яшчэ горш, і збочвалі на крывую дарожку. І дзе яны цяпер? Хто спіўся, іншы пайшоў, да слова, "па базару", яшчэ нехта "даў нырца" ў крымінал і цяпер адпачывае "на шконцы". Я вельмі хачу, каб ты абмінуў усё гэта і стаў сапраўды вялікім варатаром — такім, напрыклад, як Леў Яшын, датчанін Петэр Шмейхель, італьянец Джанлуіджы Буфон ці твой улюбёнец Луіс Чылаверт. Тым больш, што ты ўсім сэрцам любіш футбол. А футбол ужо даўно стаў не толькі асобным, самым папулярным відам спорту на планеце, а і своеасаблівым пластом культуры, мастацтвам, калі хочаш. Прыйдзе поспех, і ты станеш не толькі славутым, а і заможным. Але ўмова ўсё тая ж: працаваць. Дарэчы, як у цябе з бацькамі? Мне давядзецца размаўляць з імі.

— Так, па-рознаму.

— Бацька ўсё яшчэ зазірае ў чарку?

— Здараецца, — засмучана пацісну́ў плячыма Максім. — Але ён быццам знайшоў працу. Уладкаваўся, кажа, на завод.

— А маці?

— Таксама працуе. На швейнай фабрыцы. Ды мне цётка Люба дапамагае больш за іх.

— Так, так, — думаў услых дырэктар. — З бацькамі, бадай, мы дамовімся, і цётка, вядома, не будзе супраць. Усё гэта вырашым у бліжэйшы час. А пакуль тое, табе варта расці не толькі побач з мячом, а і ў сэнсе інтэлекту. Чытаць кніжкі, глядзець цікавыя стужкі, не злоўжываць сецівам. Ты што чытаў апошнім разам?

— Уладзіміра Караткевіча. “Дзікае паляванне караля Стаха”. Настаўніца параіла.

— Добра. Нават выдатна. Але зараз усе пераключаюцца на карцінкі, так бы мовіць. Больш глядзяць на дысплеі. Такі час. Якую апошнюю стужку ты ўпадабаў?

— Прагледзеў праз Сеціва. Найлепшы футбольны матч усіх часоў і народаў, як палічылі яшчэ ў мінулым стагоддзі.

— І што за матч? Хоць я ведаю, але... Ну-ка...

— “Бразілія — Вугоршчына”. На чэмпіянаце свету тысяча дзевяцьсот шэсцьдзясят шостага года. Ды яшчэ так званую “Бітву пры Бёрне”, на чэмпіянаце свету ў тысяча дзевяцьсот пяцьдзясят чацвёртым годзе — самую драматычную бойку ў гісторыі футбола.

— О-о, гэта была гульня! Я і цяпер пад настрой гляджу раз на год.

— А яшчэ чэмпіянаты свету з удзелам Чылаверта.

— Дарэчы, пра твайго куміра. Многія спецыялісты лічаць яго гульню занадта рызыкоўнай, а самога — апантаным, вар’ятам, які па хадзе матча штурхаў за сабой у гэтую своеасаблівую апантанасць і ўсю каманду. А ягоныя рэйды да чужых

варот? Вар'яцкія, інакш не скажаш, галы, якія ён забіваў? Але, чаго не адымеш, дык гэта таго, што ён сапраўды быў геніяльным галкіперам. Геніяльным вар'ятам. І яшчэ. Брамніку заўсёды варта быць гатовым ахвяраваць сабой. У тысяча дзевяцьсот пяцьдзясят шостым годзе, у фінале Кубка Еўропы, немец Берт Траўтман атрымаў траўму, але працягваў гуляць да канца, бо замены яму не было. Яны выйгралі 3:1. Пасля гульні аказалася, што ў яго зламаная шыя.

***

Яшчэ па дарозе дамоў Максім патэлефанаваў з мабільніка Юлі і дамовіўся сустрэцца. Апошнім часам ён рэдка бачыў дзяўчыну, хіба што калі праводзіў яе са школы. Яны сябравалі ўжо гады два. Юля за год неяк раптоўна вырасла і расквітнела. Бацька дзяўчыны быў галоўным інжынерам на мясцовым крухмальным заводзе, а маці — загадчыцай пашывачнага атэлье. Максім ведаў, што Юліны бацькі ўвогуле нічога не мелі супраць іх сяброўства, але лічылі гэта часовай падлеткавай з'явай і, як прагаварылася аднойчы са смехам яму Юля, былі радыя і таму, што ён, Максім, хоць і з неўладкаванай, небяспечнай сям'і, але хлопец прыстойны, прытрымліваецца здаровага ладу жыцця, не ўжывае спіртнога, не паліць і, крый божа, не "шыраецца". А што прысвяціў сябе спорту і хоча стаць футбалістам — дык гэта таксама ўсё падлеткавае. Вось скончыць школу, і пачнецца сапраўднае жыццё. З пытаннямі іншага парадку: вучыцца далей альбо адразу служыць у войску, кім і дзе працаваць, як зарабляць грошы, каб утрымліваць сям'ю і дзяцей.

Некалькі разоў Максім заходзіў да дзяўчыны на кватэру. Не ў параўнанне, яе бацькі былі заможнымі і ўсяляк песцілі дачку. Юлін брат Кірыл заканчваў школу і хацеў паступіць у прэстыжны прыватны сталічны інстытут. Было ў яго, як ведаў Максім, і тайнае захапленне: ён іграў на гітары, збольшага спяваў і складаў музыку. Зухаваты, са срэбранай завушніцай, моднай прычоскай і апрануты на поўны прыкід, ён выклікаў у Максіма дваістае пачуццё: з аднаго боку — павагу да творчай, як ён лічыў, рысы ў таго ў характары, а з другога — прыхаваны недавер да яго здольнасцяў. Спяваў Кірыл то па-англійску, то па-руску, і неяк, на яго думку, з чужых галасоў. І тэксты песняў былі, на яго погляд, слабаватыя. Папса. “Ты б на роднай мове паспрабаваў”, — параіў ён яму аднойчы, але Кірыл зняважліва адмахнуўся: “Несучасна, зараз усе па-англійску бацаюць”.

***

...Максімаў бацька сядзеў за бутэлькай піва, быў не ў гуморы. Маці яшчэ не прыйшла з работы.

— Ты б не паліў у хаце, — зрабіў заўвагу Максім.

У адказ бацька ўзняўся з зэдліка і адчыніў фортку. Хлопец заўважыў раптам, што той ужо на галаву ніжэй за яго.

— Чаму не на працы? — з’едліва пацікавіўся Максім.

— Не падышла, значыць. Шукаю лепшую.

— Маці пашкадуй.

— Уладкуюся. Абяцалі на днях. Паеш, там маці табе пакінула тое-сёе. Сам і разагрэй.

Максім хацеў расказаць яму пра размову з трэнерам, пра інтэрнат, але чамусьці перадумаў, вырашыў адкласці да вечара, калі прыйдзе маці.

Трэніроўка патрабавала адпачынку, але жаданне пабачыць Юлю было мацнейшае. Хлопец зайшоў да сябе ў пакойчык, пераапрануўся і выцягнуў з паліцы кніжку, між старонкамі якой ляжалі грошы, якія яму ахвяравала цётка.

Паловы грошай... не хапала. З хвіліну ён шукаў іх, але дарэмна. Урэшце, усё было і так зразумела: піва на стале, пад ім – пустая бутэлька з-пад гарэлкі. Ад крыўды перахапіла дыханне.

— Грошы браў? — спытаў ён у бацькі, ледзь стрымліваючыся.

— Пазычыў крыху, — не стаў той адмаўляцца. — На днях вярну, не сумнявайся.

Максім моўчкі агледзеў яго постаць, пакамечаную вопратку, непаголены твар і, праглынуўшы камяк у горле, выскачыў за дзверы. "У інтэрнат, — вырашыў канчаткова. — І неадкладна".

***

З Юляй сустрэліся на цэнтральнай плошчы, ля помніка. Дзяўчына прыйшла крыху пазней, ён ужо хацеў тэлефанаваць ёй на мабільнік. Раптам, як ужо не аднойчы было ў апошні час, заўважыў, што яна амаль зусім дарослая: раздаліся па-жаночаму клубы, афарміліся грудзі. Толькі з твару была падлетак, і ад таго яшчэ больш мілавідная і пекная.

Бралася ўжо на вечар. Сонца на даляглядзе занырнула ў хмары, частка з тых хмар апынулася проста над галавой. Пырснула дробным летнім дажджом.

— Пайшлі ў кафэшку, пасядзім, пагаворым, — прапанавала дзяўчына.

— Згода, — падтрымаў яе Максім і абмацаў у кішэні — праверыў, ці захапіў з сабой грошы. Цётчыны грошы былі пры ім: усё, што засталося ад бацькоўскага наведвання.

У кавярні селі за свабодны столік. Дзяўчына замовіла каву і марозіва. Максім ад марозіва адмовіўся, сказаў, што толькі паеў дома. У цеснаватым памяшканні было няшмат наведвальнікаў, хіба што за здвоеным сталом у куце ўладкавалася шумная кампанія моладзі. Былі сярод іх і дзяўчаты. З музычнага аўтамата звыкла гучала расійская папса, якая даўно набіла аскоміну.

— У мяне навіна, — адразу пачаў Максім. Ён вырашыў не адкладваць размову на потым. — Палавіна яе — добрая, другая — дрэнная. З якой пачынаць?

— А ты яе раздзялі на дзве часткі. Дрэнную — выкінь.

— Не выпадае. Карацей кажучы, я буду залічаны ў інтэрнат спартыўнага профілю. На поўнае забеспячэнне. Жыць буду ў абласным цэнтры, трэніроўкі амаль штодня. Там і школу давядзецца заканчваць. Гэта — першая палавіна.

— А дрэнная?

— Тое, што будзем рэдка бачыцца.

— А я адразу і не падумала, — крыху памаўчаўшы сказала дзяўчына. — Дык не ўвесь час ты будзеш у свой футбол ганяць. А то тут на мяне ўжо, як кажуць, запалі.

— Гэта хто яшчэ? — насцярожана спытаў Максім.

— Ды так. Да Кірыла заходзіць той-сёй.

— Спадзяюся ты мяне ў архіў не здасі?

— Не здам, Максімка. Супакойся.

Яны доўга гаманілі ні пра што — перайшлі на іншыя тэмы, гаварылі пра настаўнікаў, дырэктара школы па мянушцы “Цыркуль”, пра тое, як паедуць на выхадныя на возера, але ў душы хлопца ўжо засяліўся цьмяны неспакой, і зноў на нейкія імгненні ён адчуў сябе самотным.

— Хіба я падобны на аўтыста? — спытаў раптам ён у дзяўчыны.

— Што так?

— Нешта не зусім мне файна бывае часам сярод людзей. Калі іх зашмат. Калі шуму многа. І бацькоў сваіх я не паважаю. Навошта жывуць? Ні сэнсу, ні мэты.

— І ў мяне дома не ўсё гладка. Кірыл арганізаваў па-за школай рок-гурт. Прыходзіў у хату пад кайфам. Сябры ў яго такія: “на шмаль” ці на “калёсы” могуць падсадзіць.

— Танэлі ў вушы ці ў губы яшчэ не паўстаўлялі? — нядобра з’яхіднічаў Максім. — Дрэды не заплялі?

— Ну, такіх прыдуркаў я побач не пацярплю, ты ж мяне ведаеш.

Між тым, за кутным сталом рабілася ўсё больш неспакойна. Афіцыянтка аднесла пустыя бутэлькі з-пад віна, прынесла новыя. Адтуль збегалі ўжо да музычнага аўтамата, зрабілі музыку грамчэй. Пачалі танчыць, але не сур’ёзна, а з прыхаваным сцёбам, па-дурному крыўляючыся і перацвельваючы адзін другога.

Адзін з іх — скуласты, чарнявы, доўгавалосы, з дэгенератыўнымі рысамі твару — падышоў да іх століка.

— Не супраць, калі я запрашу вас на танец? — хіснуўшыся, спытаў у Юлі, знарок не зважаючы на Максіма.

— Супраць. Вы — п'яныя.

— Ты б спачатку патлы свае падстрыг ды пазногці пачысціў, — прапанаваў Максім.

Усталявалася нядобрая паўза.

Доўгавалосы нейкі час абдумваў.

— Што, не "даганяеш"?

— Ды ты чё, апух внатуры? — нібы схамянуўся і зароў доўгавалосы. — Праблему хочаш? Будзе зараз табе праблема. — І ўжо зрываючыся на істэрыку, закрычаў: — Пацаны! Мяне гэтыя смаркачы пакрыўдзілі!

Да іх століка заспяшаліся яшчэ двое. Максім ужо і так зразумеў, што бойкі не пазбегнуць. «Тупалобцы, — мільганула ў галаве, — нідзе ад іх няма спакою. Каб толькі гэты "воласагалоў" не зачапіў Юлю».

Але доўгавалосы пасунуўся ўсутыч да яго і памкнуўся ўхапіць за каўнер кашулі. Максім ухіліўся, адкінуў нагой крэсла, аказаўся на галаву вышэй і ўляпіў таму ў твар кулаком. Падбеглі двое, бязладна замахалі рукамі, адпіхнулі дзяўчыну ўбок. Юля крыкнула нешта, кінулася на дапамогу. Столік абрынуўся долу, разбіўся посуд. Адразу выбегла афіцыянтка, выхапіла мабільнік, каб выклікаць міліцыю.

Максім круціўся вужом, адбіваючыся ад звярэючых з кожнай хвілінай нападнікаў. У пэўнай ступені яго ратавала тое, што яны былі ўжо на добрым падпітку і таму перашкаджалі адзін аднаму.

— Заб'ю! – зароў між тым доўгавалосы, кінуўся да свайго століка, ухапіў пустую бутэльку, разбіў

аб край і, утрымліваючы за рыльца так званую “ружачку”, марудна пайшоў назад, да яго.

— Сцеражыся, Максім! – пачуў ён усхваляваны крык Юлі.

— А як адзін на адзін? Слабо? – гучна спытаў ён доўгавалосага.

Адразу ўсе спыніліся. Чакалі.

— Тым горш табе! – рынуў на яго той.

Максім паспеў адскочыць у бок, падхапіў з падлогі крэсла і з размаху абрынуў на галаву доўгавалосага. Той пахіснуўся, рука з разбітай бутэлькай апусцілася, марудна асеў на падлогу.

Праз некалькі хвілін бойку спынілі міліцыянты. Гарадскі аддзел быў амаль побач. Апыталі афіцыянтку. Усіх удзельнікаў адвялі ў пастарунак. П’яных задзірак зачынілі ў “малпачнік”, а Юлю з Максімам, як непаўнагадовых, праз нейкі час адпусцілі дамоў.

Максім правёў дзяўчыну да пад’езда, хацеў адразу пайсці да цёткі, але Юля павяла яго з сабой.

— Што здарылася? — убачыўшы Максімаў твар з набухлым вокам, устрывожана запыталася Юліна маці. Выйшаў са свайго пакойчыка і Кірыл.

— Няслаба падмаладзілі, — адно пракаментаваў ён.

Максіму зрабілі халодны кампрэс. Ён пасядзеў крыху і хутка развітаўся.

Начаваць ён пайшоў да цёткі. Пабачыўшы яго твар, цётка Люба ахнула і замітусілася: прапанавала нейкія лекі, знайшла і прыклала да вока бадзягу, каб хутчэй сышла гематома.

— А галава не баліць? Можа, да лекара варта звярнуцца?

Максім, як мог, супакоіў жанчыну. Давялося і коратка расказаць ёй пра тое, што з ім здарылася.

— Ну, няхай, — урэшце згадзілася тая. — Такая ўжо ваша мужчынская доля: бараніць свой дом, жанчыну, сям'ю.

Раніцай Максім сабраўся, пацалаваў цётку Любу і заспяшаўся на аўтавакзал.

Праз тыдзень ён ўжо ўладкаваўся на новым месцы, у інтэрнаце спартыўнага профілю. Пачалося новае жыццё. Многае ў ім яму спадабалася: цікавыя, прафесійныя трэніроўкі, непахісны распарадак дня, зусім па-іншаму, больш цікава і мэтаскіравана праходзілі і заняткі ў школе.

Усё радзей і радзей даводзілася сустракацца з Юляй. На гэта ён звычайна скарыстоўваў напоўніцу адзіны выхадны дзень. Аднойчы дзяўчына сама прыехала да яго. Максім паказаў ёй інтэрнат, месца, дзе жыў, стадыён. На развітанне Юля моцна пацалавала яго і адразу заспяшалася ў аўтобус.

Неасэнсаваная трывога і сум пасяліліся ў Максімавай душы. І зноў усё часцей яго ахоплівала пачуццё адзіноты. Прадчуваў, што наперадзе чакаюць вялікія, але пакуль яшчэ не зусім для яго акрэсленыя змены.

## V
## "Гранд" стадыён. Францыя. Ліён

Перапынак Палыч выкарыстаў творча і ад пачатку да канца. Намаляваў на планшэце некалькі імклівых схемаў з камбінацыямі, заклікаў не аддаваць сярэдзіны поля, ні ў якім разе не "правальвацца" ў абароне, як здарылася ў першым

тайме, і лавіць саперніка на контратацы. Так — яны на чужой “паляне”, але вырваць перамогу, і тым больш нічыю, цалкам рэальна. Мы чаго сюды ехалі — апынуцца ў якасці “дрэваў”? І ўжо на выхадзе спытаў Максіма:

— Ну як, не прапусціш? — А ў самога задрыжэў голас, і ён толькі ласкава падштурхнуў хлопца ў спіну рукой: — Зрабі, што здолееш!

І адразу пачалося сапраўднае пекла. Стадыён кіпеў незадаволеным гулам. Ліёнцы, нібы машына, якой дадалі хуткасці, хваля за хваляй накатваліся на вароты. Настырныя цёмнаскурыя крайнія, атакі якіх пачынаў усё той самы плэймейкер Бурэ (не забіў пенальці і таму быў вельмі раз’юшаны), раз-пораз небяспечна забягалі ў штрафную, і толькі іх паспешлівасць, ігнараванне вугла абстрэлу і рэакцыя яго, брамніка, зноў і зноў выцягвалі пагрозлівую сітуацыю. Гол наспяваў, усе гэта адчувалі, але... але яго не было.

Дабавілася працы лайнсманам, бо абаронцы гублялі сілы і пачалі рызыкоўна ствараць штучныя афсайды. Урэшце нехта з суддзяў непазбежна затрымаўся з адмашкай, і варатар Максім Гудаў зноў аказаўся адзін на адзін з нападаючым сапернікаў. І зноў на нейкае імгненне пачуццё адзіноты ахапіла яго, калі раптам убачыў, што бэкі “праваліліся”, а проста па цэнтры ў штрафную ўрываецца цемнаскуры паўабаронца сапернікаў Мбвана і ніхто са сваіх бэкаў ужо не здолее яго спыніць. Кароткія, ліхаманкавыя думкі прабеглі ў галаве Максіма. Самае важнае ў такі момант для галкіпера — гэта з хуткасцю камп’ютара перабраць усе варыянты далейшага, адгадаць напрамак удару, бо выскачыць на перахват ён ужо

не паспяваў, і не даць падмануць сябе абводным фінтом, на якія быў асабліва здольны цёмнаскуры хаўбэк, што ён ужо ведаў з папярэдняга прагляду відэазапісу.

Між тым Мбвана, які апынуўся метрах у пяці ад варот, нахіліў корпус улева, а ён, безумоўна, быў "праўша", і, значыць, будзе біць правай нагой, па ўсім бачна — "шчоткай". Вось яго нага ўжо заносіцца для ўдару, і напрамак палёту мяча і яго будучая траекторыя склаліся ў Максімавай галаве ў адно. І адразу мозг аддаў загад мышцам і целу, якое ва ўсю даўжыню з усёй магчымай хуткасцю распласталася над зямлёй, закрываючы сабой той адзіна магчымы сектар перад варотамі для трапнага выніку.

Удар! Мяч, нібы выштурхнуты з гарматы, сутыкнуўся з яго целам і — зрыкашэціў убок, дзе яго ўжо падхапіў Жэня Жалкевіч і, ад граху, выбіў доўгай "свечкай" падалей ад сваіх варот.

Стадыён незадаволена ахнуў і загудзеў.

Сэйв! Яшчэ адзін сэйв! І ён перамог. Максім убачыў, як у роспачы паваліўся на зямлю проста перад ім Мбвана і біў яе кулаком. А пасля падняўся і закрычаў, звяртаючыся да Бурэ:

— Ты бачыў, што ён зрабіў?! Не — ты бачыў?

Максім крыху разумеў французскую — вучыў у школе — і таму разабраў.

Чаму так заўсёды марудна цягнецца час? — між тым, думаў ён. — Колькі там да фінальнага свістка? Хутчэй бы. Як гуляюць у гэтыя ж хвіліны ў групе? Ці дастаткова нам будзе нічыёй, якую яшчэ трэба неяк выпакутаваць, вырваць у гаспадароў пляцоўкі? Постаць Палыча мітуслівa мільгала за броўкай. Ён павінен быў ужо ведаць

папярэднія вынікі групавых першых таймаў? Павінен ці не?

Мяч, між тым, доўгі час не пакідаў сярэдзіны поля. Са сваёй штрафной Максім нервова назіраў, як адчайна змагаліся за яго паўабаронцы, урэшце адабралі, адпасавалі назад бэкам, а тыя ўжо яму — усё правільна, цяпер важна збіць тэмп, пацягнуць час. Як там пачувае сябе "асноўнік" — Сяргей Румаш, у якога, пра што коратка паведаміў у раздзявалцы трэнер, верагодны пералом рабра. Што ж, у галкіпераў такія траўмы не рэдкасць. Знакаміты варатар Чэх увогуле пасля аперацыі гуляе ў спецыяльным шлёме на галаве.

Максім паволі зрабіў разбег і выбіў мяч як мага далей — больш цягнуць час не выпадала, бо пунктуальны Стайлз мог адразу сунуць у нос "гарчычнік".

## VI
## Годам раней

У нядзелю Максім прачнуўся рана, бо з вечара ўключыў будзільнік на мабільным тэлефоне. Апрануўся ў найлепшае і паехаў на аўтавакзал, узяў білет на маршрутны аўтобус. З сабой вёз падарункі для цётцы Любы (атрымаў грошы за зборы і першыя выступленні за юнацкую каманду краіны) і ў кішэні — чырвоную аксамітавую каробачку, у якой ляжаў заручальны пярсцёнак для Юлі.

Дзяўчына сустрэла яго на плошчы. Паводзіла сябе даволі дзіўнавата. Выйшла з цёмна-сіняй "мазды", скіравала да камерцыйнага шапіка, азірнулася,

памахала рукой кіроўцу іншамаркі, якая адразу і ад'ехала. Толькі тады заспяшалася да яго.

Юля была ў шыкоўным летнім строі, высокая, смуглявая — паспела загарэць на чэрвеньскім сонцы. Яна днямі, таксама як і Максім, скончыла школу. Месяцы два яны ўвогуле не бачыліся, і Максім быў цяпер вельмі рады і ўсхваляваны. Нават не спытаў, хто яе падвозіў.

Дзяўчына стрымана пацалавала яго.

— Ну ты і расцеш, — сказала, белазуба ўсміхаючыся.

Сапраўды, юнак, які стаяў перад ёй, ужо пераваліў за сто дзевяноста сантыметраў, раздаўся ў плячах, узмацнеў.

— Хто гэта цябе сюды прывёз? — раптам адразу ўспомніў Максім.

— Ды так, адзін знаёмы. Праехалі, як кажуць, — І дадала рассеяна: — Куды мы зараз? Што прапануеш?

— А пайшлі ў кавярню. Памятаеш, дзе мы пабіліся з гопнікамі?

— Ну, а што — прыкольна. Пайшлі.

У кавярні мала што змянілася. Працаваў музычны аўтамат. Гучала папса. Яны выбралі столік, незнаёмая маладая афіцыянтка прыбегла з меню, круцілася побач, назвала Максіма "дарагім госцем".

— Што гэта яна? Запала на цябе? — здзівілася Юля. — Хоць што тут дзіўнага? Ты — відны. Дзеўкі цябе любяць.

— Мяне пазнаюць. Заўзятары. Паўсюль цікавяцца футболам. Але чакай, вось. — Максім выцягнуў з кішэні аксамітавую каробачку, пасунуў да дзяўчыны.

— Табе.

Юля марудна раскрыла яе, выцягнула пярсцёнак.

— Ты сур'ёзна, Максім? — яна чамусьці разгубілася, нават пабляднеў твар.

— Больш чым. Прапаную табе разам з гэтым сімвалам сваё сэрца. Як ты — згодная?

— Дзякуй. Я расчулена. Але, але... з'явіліся новыя абставіны.

— І што за яны, Юля? — праз паўзу спытаў Максім. Ён ужо зразумеў: нешта пайшло не так, як варта было. Быццам падзьмуў халодны паўночны вецер. Даўняе пачуццё самоты на кароткі момант ахапіла яго.

— Паслухай, Максім. Мне думаецца, ты варты нечага большага. Ну, чым гэты твой футбол цябе ачмурыў? Вядома, ты становішся папулярны, нават мясцовыя гопнікі цябе ведаюць і быццам паважаюць, але ў свеце столькі магчымасцяў. Няўжо табе так важна, што тысячы няўдачнікаў на стадыёне — ты толькі паглядзі на іх твары буйным планам — будуць, як кажуць, "ташчыцца" ад таго, што ты ўдала зловіш нейкі мячык ці адаб'еш яго? Ты мог бы стаць якім адвакатам, урачом, акцёрам, спеваком, мала кім яшчэ...

— Па-твойму, які-небудзь дурапляс на сцэне робіць для людзей больш? Я не ўпэўнены. І потым, футбол — маё прызванне. Тут ужо нічога не пераглядзіш. Я сам захацеў гэтага.

— І твой анёл, які назваўся Херувімам, адобрыў? Так?

— Так.

— І ты верыш у такую лухту?

— Я толькі выказаў жаданне. А ён дапамагае яго здзейсніць. Я буду вялікім галкіперам. Можа, нават такім, як Чылаверт.

— Ну, спорт — гэта не тая мэта, да якой, на мой погляд, трэба імкнуцца. Большасць тых спартняжак пад старасць проста вартыя жалю. Гаротныя, нікому не патрэбныя людзі. А дзе гарантыя, што ты не станеш такім? У той большасці?

— Так, я лічу, што ў тваіх словах ёсць нейкая рацыя. Але — толькі частка яе. Бадай што, пасля таго, як скончу выступаць, ці ў выніку якога няшчаснага выпадку, траўмы мне давядзецца застацца сам-насам з цяжкасцямі, і, магчыма, нікому з тых, хто цяпер апякае мяне, мае праблемы не вельмі будуць патрэбныя. Але брамнік, як я даўно зразумеў, часам адзінокі. Нават — заўсёды самотны. Бо ён вартаўнік, і на ім адным адказнасць за тую браму, якую ён сцеражэ. Неістотна — якую. Прабач за рыторыку, але гэта па жыцці. І я пастараюся сустрэць пераход да новага жыцця падрыхтаваным. Буду вучыцца, магчыма, стану трэнерам. Урэшце, тое, што я здолею зарабіць за дзесяць — пятнаццаць год выступленняў, столькі я наўрад ці атрымаю як адвакат, доктар, інжынер. Хіба што знакамітыя дураплясы маюць больш. Але які з мяне дурапляс?

— Па-мойму, гэта не зусім сур'ёзна. Не крыўдуй, але... але я пакуль не змагу прыняць тваю прапанову, — дзяўчына адсунула карабачку. — Яшчэ раз — не крыўдуй. Ты ўвесь час далёка, раз-пораз бяруць на спартыўныя зборы, цябе могуць забраць і ў войска, а дзеўка з узростам, як кажа маці, "заляжалы тавар". Прабач.

Максім скамянела маўчаў. Ніколі б не падумаў, не чакаў такога. Раптам успомніў, спытаў:

— У цябе нехта з’явіўся? Гэта ён цябе падвозіў на “маздзе”?

— Так.

— І хто гэты шчаслівец, калі не сакрэт? Ці не з яго голасу ты зараз гаворыш?

— Хаваць не буду. Ён паспяховы бізнесовец. У сталіцы мае дзве крамы. На дзесяць год старэйшы. Але цікавіцца музыкай. Спявае. Кірыл нас пазнаёміў. Ну, я — такая вось аказалася. Не ідэал. Сцерва. Думай што заўгодна. Застанемся сябрамі? Хочаш — я табе і ўсю ноч ахвярую? Толькі скажы.

Слёзы нечакана з’явіліся на вачах дзяўчыны. Нешта ў яе словах было штучна нацягнутае, нейкі душэўны надрыў — ён гэта добра адчуваў. Ці кажа яна яму праўду? Нешта было не так.

— Я не супраць, — вырвалася ў яго пасля працяглага маўчання.

— Не думала, што ты згодзішся. Меркавала — “сядзеш на крыўду”, і расход... Але... але я таксама не магу так лёгка з табой разысціся. Мы так даўно разам. Ну, што за жыццё такое клятае?

Максім задумаўся на секунду.

— Сёння цётка Люба паехала на лецішча. У яе там чатыры соткі. Вернецца праз суткі, не раней. Асобны пакойчык у яе кватэры мой, ты ж ведаеш, — прапанаваў ён.

— Тады вядзі. Куды хочаш. Толькі патэлефаную сваім, скажу, што затрымаюся ў сяброўкі.

***

Ключ ад цётчынай кватэры заўсёды быў з ім. Максім адчыніў дзверы, прапусціў дзяўчыну наперад. І адразу нібы нейкая сіла кінула іх адно

да аднаго. Не было ўжо ніякіх думак, спадзяванняў, крыўдаў — толькі спрадвечнае жаданне поўнай блізкасці.

Праз нейкі час, калі яны, урэшце сцішыўшыся, ляжалі ў спусташальнай цішыні, Максім спытаў:

— Дык што здарылася, Юля?

Дзяўчына доўга маўчала, пасля чаго парушыла паўзу.

— Мяне прайгралі ў покер.

...Паўза.

— Ты хоць у тэму? А сур'ёзна?

— Куды ўжо сур'ёзней. Атрымалася наступнае. Кірыл па дурноце сеў за картачны стол з "каталамі" ці нейкімі шулерамі са сталіцы. Ён і раней часта пагульваў і даволі ўдала, але ж, як аказалася на гэты раз, да пары. Прагуляў вялікія грошы. А іх трэба было неадкладна вяртаць. Бандосы адразу паставілі яго "на лічыльнік". Намалявaліся, як кажуць, больш "рэальнымі", чым ён мог сабе ўявіць. Бадай, яго б маглі і забіць. Ён кінуўся туды-сюды — ніхто не даў яму і стольніка. Патлумачылі папулярна: час такі, што пазычаць больш за пяць умоўных адзінак нікому не варта. Брат брата "кідае". Вось тады ён і звярнуўся да... ну, таго самага сябра, бізнесоўца. Той даў грошы, але з умовай, што сястра, я значыць, пайду за яго замуж. Высветлілася, што даўно ўжо выглядзеў мяне, спакваля прасвятліў, як рэнтгенам, і чамусьці вырашыў, што я яму, як кажуць, у масць. Кірыл стаў перада мной на калені і... папрасіў. Я... я не жадала, каб ён памёр. Я бачыла тых бандосаў — гэта вельмі сур'ёзна.

— А калі падключыць міліцыю?

Дзяўчына горка ўсміхнулася.

— Не будзь такі наіўны. Што ім мянты прад'явяць? Пустату? Патрэбныя ж доказы махлярства, ашуканства, шантажу. Іх няма. А тое, што нехта з нейкімі гуляў у покер, дык які тут крымінал?

— Твой брат — ідыёт. Нікчэмнасць. Як ён мог падстаўляць цябе?

— Вось так і падставіў. Ён лічыць, што да ўсяго робіць мне вялікую паслугу. Уладкоўвае жыццё. І што ты са сваім футболам — звычайны няўдачнік. Несамавіты. Без падтрымкі. Без перспектываў на будучыню.

— І аніяк нельга адпасаваць назад?

— Нельга, Максім. Я не жадаю. Каб ты ведаў, як мне цяжка.

***

Па дарозе дадому — варта ж было паказацца бацькам — Максім выняў з кішэні каробачку з пярсцёнкам, размахнуўся і закінуў далёка ў прыдарожнае кустоўе.

"Каму Бог пашле", — з горыччу ўсміхнуўся сам сабе.

## VII
## "Гранд" стадыён. Францыя. Ліён

Максім Гудаў, вядома, разумеў, што каманда не здолее змяніць манеру гульні адразу, як чалавек, які не можа нацягнуць на сябе іншую скуру. Стыль той самай гульні — гэта тое, што назапашваецца гадамі і ўкараняецца назаўсёды. Прадбачліва вывучыць асаблівасці гульні саперніка —

значыць выведаць яго планы і ў выніку — перамагчы.

Канцоўка матча яўна збівалася на шэраг істэрычных эпізодаў. Гаспадарам пляцоўкі была неабходная перамога, і не ў адных прызавых грашах тут была справа. Дзясяткі тысяч заўзятараў чакалі, няўмольна патрабавалі яе ад сваіх пестуноў. Дзеля чаго яны прыходзілі сюды, на стадыён, гублялі асабісты час? Пэўна, яшчэ і таму, што кожны з іх пасвойму любіў футбол, гэтую самую папулярную гульню ў свеце, і цяпер хацеў ад сваіх улюбёнцаў поўнай аддачы. Чаго яны, урэшце, сюды і зараз прыйшлі, купілі далёка не танныя білеты? Каб усцешыцца перамогай — вось чаго.

Максім, між тым, усё часцей выходзіў на перахват, бо мяч падоўгу затрымліваўся на яго палавіне поля, крычаў з-за таго на сваіх абаронцаў. Ушчуваў іх. Як ні дзіўна, хоць ён, лічы, і выпадкова заняў месца Сяргея Румаша, яму бездакорна падпарадкоўваліся. Палыч ужо нічога не мог зрабіць. Ні парадай, ні дапамагчы чым іншым. Ды яго б і не пачулі. Няўмольны Стайлз, дарэчы, зрабіў яму папярэджанне за залішнюю актыўнасць ля броўкі.

Прыкладна хвілін за пяць да канца матча Бурэ выскачыў з ім адзін на адзін, але далёка адпусціў мяч, і Максім літаральна "зняў" яго з нагі форварда. Бурэ, якому ў гэты дзень яўна не шанцавала, тым не менш каварна скарыстаў момант і адчувальна заехаў яму бутсай у грудзі. Што ж, прамільгнула ў галаве ў Максіма, гэта балюча, але і гэта можна выкарыстаць з выгодай для сябе, пацягнуць час. Дзесяць, дваццаць, трыццаць секунд могуць вырашыць усё. Тым больш, Стайлз

усё бачыў і не будзе яго вінаваціць. Дарэчы, колькі хвілін ён дадасць да асноўнага часу?

Максім урэшце падняўся на ногі, зрабіў супакойвальны жэст сваім і выкінуў мяч у поле свабоднаму хаўбэку. Гульня працягвалася. А яшчэ праз паўхвіліны гаспадароў пляцоўкі ледзь не злавілі на контратацы. Толькі жорсткі знос за дзясятак метраў ад штрафной выратаваў іх ад гола. Стайлз у чарговы раз узняў угору жоўтую картку. А потым зноў выдатны сэйв выдаў іх варатар Жуль Дзюпон — выцягнуў мяч з-пад перакладзіны. Асістэнты, між тым, высвецілі табло — рэферы дадаў тры хвіліны дадатковага часу.

Напруга матча дасягнула, між тым, найвышэйшай адзнакі. Час быццам цягнуўся бясконца. Гаспадары ліхаманкава атакавалі і зноў ледзь не пацярпелі ад контратакі, хіба што вынеслі мяч на вуглавы.

“Корнер”, — за хвіліну, максімум за дзве да фінальнага свістка падумаў ён і кінуў позіркам да “банкі”. Там, за броўкай, ужо ліхаманкава ўздымаў угору рукі Палыч. Значыць, справы ў групе для іх — не вельмі, і нічыя ўжо нічога не вырашае. Хвіліна да свістка Стайлза. Так, хвіліна, не больш. “Пара”, — падумаў зноў, скінуў пальчаткі і імкліва рушыў наперад, пакідаючы сваю штрафную, да цэнтральнага круга і за яго, насустрач здзіўленаму гулу стадыёна — туды, да чужых варот. Што будзе там, ён не мог і не здольны быў прадугледзець, але нешта неасэнсаванае гнала яго туды. Так іншым разам рабіў яго кумір, вялікі Чылаверт. І няхай трэнеры, спецы ад футбола, журналюгі лічылі і лічаць таго апантаным, вар’ятам, праўда, з агаворкай — геніяльным

вар’ятам, — ён быў найлепшы з найлепшых — і гэта ўжо і ёсць сапраўдны футбол, у які той гуляў і ў які варта гуляць і яму.

Падаваць вуглавы пабег правы хаўбэк, нястомны Алесь Саковіч, але і здалёк было бачна, як ён стаміўся. У штрафной сапернікаў — мітусня, разборка па персонах, звыклы прэсінг. На яго, варатара з чужой штрафной, які ўзнік за спінамі, у той момант ніхто асабліва не зважаў. Яшчэ не разабраліся. Ужо ўкліньваючыся ў гэты гармідар, ён ускінуў руку, даваў знак Саковічу, каб падаваў на далёкую стойку, і адначасова рвануўся туды, на свабодны пятачок, не губляючы бакавым зрокам палёт мяча, няблага закручанага Алесем, і, урэшце, у падзенні “злавіў” яго галавой ля самай стойкі.

Стадыён ахнуў у адзін голас, і — наступіла цішыня. Мяч праслізнуў у сетку варот.

Ён убачыў, як Стайлз паказаў на цэнтр, як потым перавёў позірк на свой судзейскі гадзіннік, і што было сіл, быццам на стометроўцы, ірвануў назад, да сваіх варот: яшчэ заставаліся хоць і лічаныя, але з дзясятак секунд, і магло здарыцца ўсё, што заўгодна, а на броўцы падскокваў, радасна крычаў нешта і трыумфаваў Палыч.

Вароты ўжо на ўсялякі выпадак страхаваў абаронца Дзіма Гуркоў, але раптам зухавата ўхапіў рукамі перакладзіну і павіс на ёй, дэманструючы сваё захапленне, забоўтаў нагамі, і тут жа ззаду прагучаў свісток Стайлза аб заканчэнні гульні. Да яго, брамніка, ужо беглі, абдымалі, павалілі на траву.

Перамога. Яны выйшлі з групы.

***

Пасля мітусні дарожных збораў у самалёце “БелАвія” ўсёй камандай вярталіся дамоў. Максім уладкаваўся ля ілюмінатара на ганаровае месца побач з трэнерам. Палыч свяціўся ад радасці. Краявіды з вышыні раз-пораз прыцягвалі Максімаў позірк сваёй маляўнічай дасканаласцю.

Маўчалі.

Маладзенькая сцюардэса прынесла на разносе каньяк, шакалад.

— Гэта ад экіпажа. Яны ўчора глядзелі тэлерэпартаж.

— Не адмовімся.

“Коўч” Грак, ён жа Палыч, згодна кіўнуў. Радасная ўсмешка не пакідала яго твар.

— Дзякуем. Усім вам і пілотам прывет ад нашых пацаноў.

— І вось яшчэ газета. Ліёнскія спартыўныя экспрэс-навіны. Тут у асноўным пра вас, Максім. Я крыху ведаю мову. Перакласці? Не ўсё, але паслухайце:

“...Гэтая яшчэ год-два таму малавядомая каманда з Беларусі, сябры якой у большасці гуляюць у ахвотку, за невялікія грошы, сенсацыйна ўвайшла ў плэй-оф. Але самае сенсацыйнае — тое, што каманда прывезла з сабой невядомага галкіпера, які ў будучыні, магчыма, стане побач з легендамі сусветнага футбола, і чый клас гульні напомніў нам вялікага Луіса Чылаверта... Дэбют Максіма Гудава — адкрыццё матча і ўвогуле групавых гульняў...”

***

У Мінскі аэрапорт прыляцелі запозна, але іх чакалі. Журналісты, той-сёй са сваякоў. Пасыпаліся радасныя воклічы, усе загаманілі. Нават пануры "асноўнік" Румаш (разумеў, што яго месца ў асноўным складзе каманды пахіснулася) заўсміхаўся насустрач жонцы.

Максіма Гудава асабіста не сустракаў ніхто.

## Замест эпілога

З ліста:

"...Ведаю, што табе, Максім, у гэтыя дні не хапае часу, каб наведаць наш пасёлак, бацькоў, мяне, але веру, што хутка пабачымся. Сачу за тваімі выступленнямі, хвалююся і за цябе, і за каманду. Хоць і мала што разумею ў футболе. Хацела паехаць у аэрапорт, каб пабачыць цябе, але пасаромелася: старая. Дый яшчэ прычына. Спаткала неяк Юлю. Не ведаю, што там у цябе з ёй адбылося, але... але дзяўчына цябе не забыла. Яна нават абяцала, што паедзе цябе сустракаць. Казалі, што быццам раней ледзь не выйшла замуж, але нешта ў яе не склалася, да таго ж загінуў яе брат Кірыл. Знайшлі раніцай забітым у скверы на вакзале. Дзяўчына яна, на маю думку, вартая. Прыязджай.

*Твая цётка Люба*".

*Люты 2013 г.*



# Апавяданні

# ЗАРУЧЫНЫ

Апоўдні ў прасвет паміж аблокамі раптам выплыла веснавое сонца. У сакавіку яно ўжо добра-такі прыгравае, падумаў Максім Януш. Хлопчык сядзеў на лаўцы ў гарадскім скверы непадалёку ад свайго дома, рассеяна назіраючы заўсюдыіснымі абачлівымі галкамі і рэдкімі прахожымі. І таму не адразу ўбачыў дзяўчынку з паралельнага класа, якая жыла, пэўна, таксама дзесьці паблізу, бо ён заўважаў яе тут і раней. Хударлявая, яна з цяжкасцю несла за спінай няйначай даверху набіты падручнікамі рукзак.

За некалькі крокаў ад яго дзяўчынка выслізнула з лямак рукзака і пашукала вачыма, куды б яго паставіць: зямля была вільготная і ў лужынах.

— Нясі сюды, — прыйшоў ёй на дапамогу Максім. Узняўся з месца, паднёс рукзак і паставіў на лаўку. — Цэгла ў цябе там ці што?

— А я цябе крыху ведаю, — аддыхаўшыся сказала дзяўчынка. — Ты з 7 "В". Так? Ты яшчэ летась выйграў нейкія, не памятаю якія дакладна, спаборніцтвы па дзюдо. Мы хадзілі глядзець.

— Так, — згадзіўся Максім, і спытаў: — А цябе як зваць?

— Вера.

— Ну, а я — Максім.

— Ты што, сёння ў прагуле?

— Ды не, я ўжо і дамоў забягаў, але там п'яны бацька. Цяпер дні тры піць будзе. Як маці памерла два гады таму, дык ён і пачаў у бутэльку заглядваць. А я гэтага не люблю, заўсёды з дому сыходжу. Тады ў яго тэрмін запою скарачаецца, мусіць, ад сумлення пакутуе, увесь кайф прападае.

— А дзе ты начуеш?

— Па-рознаму. То ў сябра заставаўся, то на аўтавакзале, што паблізу, у крэсле падрамлю. Але зараз да сябра нельга. Дый няёмка перад яго маці: што яна падумае? Што я — дваранін?

— Чаму дваранін? — здзівілася Вера.

— Ну, той, хто ў двары жыве.

— А-а.

Дзяўчынка па імені Вера села побач і адкінула з галавы капюшон курткі. Цёмныя яе валасы былі коратка падстрыжаныя, шчокі запалыя, вочы зялёныя, нос крыху ўзняты — звычайны выгляд, на вуліцы за гадзіну можна сустрэць і прыгажэйшых, падумаў ён.

— А сёння ты куды? На аўтавакзал?

— Напэўна, так.

— А чаго паесці — ёсць?

— Гэта не праблема. Я ў "пахана" сёе-тое з грошай канфіскаваў, пакуль ён не прапіў.

— Ён што, зусім з разьбы з'ехаў? — спытала дзяўчынка, падладжваючыся пад яго слэнг.

— Ды не, ён бывае і добры, — сказаў Максім Януш і раптам усміхнуўся ёй. — Не прападу! Толькі сёння я яго ненавіджу. А хіба можна бацькоў ненавідзець?

— Не ведаю, — сказала дзяўчынка. — Мае не п'юць.

— Вось-вось. А мой патрабуе ўжо матулін заручальны пярсцёнак, кулон, завушніцы. Ты, кажа, забраў.

— А ты ўзяў?

— Вядома. Схаваў так, што ніхто не знойдзе, — ад абурэння ён сціснуў рот.

Хлопчык быў высокі, шыракаплечы, з-пад шырокага лба глядзелі адкрытыя шэрыя вочы. Апрануты сціпла, але прыстойна: чорныя джынсы, куртка "кобра", простыя, моцныя чаравікі. "Не які-небудзь брудны рэпер з нямытымі доўгімі валасамі і бутэлечкай піва ў руцэ", — падумала яна. З ім ёй чамусьці спакойна.

Памаўчалі.

— Мне трэба ісці, — урэшце паднялася Вера.

— Рукзак цяжкі для цябе. Я дапамагу.

— Я раней нейкі час хварэла, — шчыра патлумачыла яна. — Вось і не ў форме. Цяжка цягаць столькі падручнікаў адразу.

— Я чуў, што ў Францыі ў школу ўжо ходзяць з электроннай кніжкай, зусім лёгкай, на якую спампаваны ўсе падручнікі, — паведаміў Максім.

— Няўжо? — здзівілася Вера. — Вось бы мне такую.

Яны падышлі ўсутыч да яе пад'езда, і дзяўчынка спынілася.

— Дзякуй, — сказала яна, узяла з яго рук і, павагаўшыся, расшпіліла рукзак, выцягнула ручку, аркуш паперы і пачала таропка пісаць. — Пачакай секунду!

Потым працягнула яму паперку.

— Трымай. Тут адрас майстэрні непадалёку, дзе працуе мой бацька, але яго цяпер няма.

Ён мастак і паехаў распісваць храм. Яго запрасілі. Гэта далёка, і ён прыедзе дзесьці праз месяц. Там ёсць канапа і нават лядоўня. Варыянт значна лепшы за вакзал, праўда?

Хлопчык здзіўлена маўчаў.

— А вось і ключ, — дадала яна. — Я там нядаўна палівала кветкі. Жыві колькі трэба.

— Але ж ты зусім не ведаеш мяне, — праз паўзу ашаломлена сказаў ён. — Мы толькі пазнаёміліся, а ты мне ключы ад кватэры, дзе, магчыма, і грошы ляжаць.

— Я табе давяраю.

Максім узяў ключ.

— Ты... Гэта... Калі хто на цябе "наедзе", дык адразу мне скажы. Згода?

***

Прайшлі тры дні. Пасля заняткаў кожны раз Максім чакаў Веру і нёс яе рукзак дадому.

— Бацька спыніўся піць, — неяк сказаў ён дзяўчынцы. — Заракаецца, што апошні раз, але я не вельмі гэтаму веру. Вось, забяры, тым не менш, ключ. Ты правільная цётка, сапраўдная сяброўка.

Яна радасна ўспыхнула, аж шчокі заружавелі.

...Назаўтра ён не прыйшоў. Яна панура ішла дамоў, і рукзак за плячыма быў на гэты раз асабліва цяжкі. І дома, і ў школе на другі дзень усё валілася з рук, а ў вачах стаялі слёзы.

Але пасля заняткаў, як толькі яна выйшла на ганак школы, дык адразу заўважыла Максіма. Хлопчык чакаў менавіта яе. Ён забраў у яе рукзак, і абое моўчкі пайшлі па вуліцы, што вяла ў іх жылы квартал, а потым праз скверык.

Каля знаёмай лаўкі Максім спыніўся, і яны прыселі.

— Мне трэба табе нешта сказаць... — раптам, саромеючыся, пачаў хлопчык.

— Што, бацька зноў запіў?

— Не.

— Дык што?

— Я ўчора ездзіў на могілкі, дзе пахавана маці. Я з ёй быццам параіўся, і яна адобрыла.

— Адобрыла што? — здзіўлена спытала дзяўчынка.

— Вось, — ён выцягнуў з кішэні невялічкую каробачку, раскрыў яе і працягнуў Веры залаты пярсцёнак. — Надзень. Яго калісьці насіла...

— Мне? Навошта?

— Гэта называецца заручыны. Як мы вырасцем, то пажэнімся. А пакуль насі. Ты не супраць?

Яна доўга маўчала, упершыню адчуўшы подых даросласці і складанасці таго свету, у які вымушана цяпер уступаць.

— Але ж я магу цябе расчараваць. Я не люблю шумныя кампаніі, дыскатэкі, нават у школе іх прапускаю, а люблю чытаць кнігі. Да таго ж, я шмат хварэла. Мажліва, ты расчаруешся ўва мне.

— Не, — запэўніў ён і спытаў: — Ты будзеш насіць гэты пярсцёнак?

— Так, — урэшце адказала дзяўчынка па імені Вера. — Я буду яго насіць.

# СІЦЫЛІЯНСКАЯ ПАРТЫЯ

Ад сярэдзіны ракі, дзе працаваў земснарад, на поплаў цягнуўся пульпаправод. Пульпа, заціснутая ў жалезныя трубы, глуха шумела, неўзабаве вырывалася на волю і з булькаценнем утварала вір. Грукала ўнутры дробнае каменне.

Нізкае хмарнае неба вісела над вільготнай зямлёй. Наводдаль па пяску марудна хадзілі чайкі, вышукваючы малюскаў. Далей, за ракой, у дымцы смогу ледзь згадваўся ўскраек горада.

На камені, ля ўзмутнелага віру, сядзеў хлопец і назіраў, як імчыць ля ног вада з пяском. У шуме ён не адразу пачуў голас бульдазерыста.

— Гэй, вартаўнік! — крычаў той. — Дапамажыка, га?!

Трубаўкладчык, ля якога мітусіўся бульдазерыст, відавочна правальваўся ў твань, асядаў на адзін бок. Пэўна, вадзіцель не разлічыў, пад'ехаў занадта блізка, а на дамбе пясок быў яшчэ слабы, напалавіну з вадой.

Хлопец нават не варухнуўся на словы бульдазерыста. Той крыкнуў яшчэ раз, потым махнуў рукой, выцягнуў з кабіны трос, зачапіў яго ззаду за фаркоп, а потым абышоў трубаўкладчык і ўпэўніўся, што гусеніцы павольна засмоктвала ў багну. Бульдазерыст агледзеў далёкі бераг: рэдкія чэзлыя дрэвы, напаўзасыпаныя белым рачным

жвірам, ледзь бачныя дахі будынкаў на тым баку ракі — сумны пейзаж, і пайшоў да перасоўнага вагончыка, дзе быў тэлефон. Праз хвіліну ён выйшаў адтуль і звярнуўся да хлопца:

— Кран выклікаў на дапамогу. Абяцалі праз гадзіну выцягнуць.

Так яны табе і разгоняцца: праз гадзіну перапынак на абед, а пасля яшчэ што-небудзь неадкладнае з'явіцца, а там і канец рабочага дня.

Каб працаваць на будоўлі, трэба быць стоікам або мець нервовую сістэму чарвяка. Тут звычайныя справы, калі сотні метраў ацынкаваных труб проста спіхваюць у ямы і засыпаюць зямлёй. Гэтаму свежаспечанаму бульдазерысту і даручаць. У ямы ж кладуцца "лішнія" блокі, шкло, уцяпляльнік, а раствор стыне, бо людзей не хапае, а за вярсту яго чакаюць, як манны нябеснай...

Хлопец скептычна ўсміхнуўся. У яго быў вузкі, хваравіты твар у зморшчынах і змрочны позірк глыбока схаваных вачэй. Худыя плечы ахінала выцвілая клятчастая кашуля з кароткімі рукавамі, картовыя штаны былі падперазаныя салдацкай дзягай. На нагах — зношаныя кірзавыя боты.

— Позна лямантуеш, — хлопец глядзеў на бульдазерыста. — Мо заўтра і выцягнуць. Раней не чакай.

— Засмокча ж па трубу.

Хлопец паціснуў плячыма, працягваючы разглядаць румяны твар бульдазерыста. Таму было гадоў дваццаць, не больш.

— Цябе як завуць? — наіўныя дзіцячыя вочы ўтаропіліся на суразмоўцу. — Мяне — Фёдар.

— Алесь.

— Падабаецца вартаўніком?

— З дзяцінства марыў.

Фёдар хіхікнуў, дадаў:

— Гэта ж цябе, здаецца, прараб у чэрвені аформіў... Ты што, бічуеш?

— Мая справа.

— Сам адкуль?

Алесь толькі ўсміхнуўся.

— Можаш не адказваць, — пакрыўдзіўся бульдазерыст. — Але тут усе цікавяцца: што ты за шпак? Робіш спраўна, не п'еш... Дзіўна. Такіх, кажуць, вартаўнікоў не бывае, так вось. А днём усё сядзіш ды ваду разглядаеш... А чаго на яе глядзець?

Вось-вось. Спачатку цікаўнасць, потым непаразуменне, а там, глядзіш, і нянавісць прарэжацца. Не такі, як я, значыць, — іншы; іншы — значыць, чужынец, а чужынец — дык і прэч з вачэй, так жыць лягчэй. Рыфма з'явілася. Толькі не хапала запіць і кайф штодня лавіць. Тады, пэўна, усё было б, на іх погляд, нармальна. Шклянку гарэлкі, а потым — цыгарэту. Чарз. Не, пра чарз не варта. Гарэлка і чарз чакаюць вас. Не, не тое. Шкада, што хутка адсюль давядзецца зліняць. Зімой жа ім вартаўнік не патрэбен. А так, можна сказаць, збольшага ўладкаваўся. Ноччу тут добра: неба зорнае і цішыня. "Цішыня — ты лепшае, што я чуў у свеце", — сказаў калісьці паэт. Дый рака побач. Рыба надосвітку боўтне, вада цячэ і цячэ, а калі гаварыць штовечар у ваду адно і тое ж, то гэта можа здзейсніцца. Вада, калі падумаць, увогуле рэч містычная. У ёй, напрыклад, можа захоўвацца "адбітак" пры разбаўленні аднаго да

дзесяці ў сто дваццатай ступені. Дзіўна, га? Для параўнання: колькасць часцінак у Сусвеце — дзесяць у шасцідзясятай ступені.

От жа пашэпча якая бабулька ў ваду і дасць папіць хвораму дзіцяці, а праз нейкі час дзіцё перастае хварэць…

Я скажу нешта сваё той жа вадзе, і гэта назаўсёды застанецца ў Сусвеце. Няўжо застанецца?

— Я ж нарадзіўся пад знакам Вадалея, — кінуў досціп Алесь. — А Вадалею каля вады самы кайф.

— Жартуеш, — меланхалічна адзначыў Фёдар. — Табе кайф, а мне гарбець. Бачыш, пульпа добрая ідзе, чорная. А калі з глінай — дрэнна… Трыста пяцьдзясят кубоў пяску ў гадзіну — гэта ж семдзесят пяць самазвалаў — пакуль раскатаеш. Потым палі ўваб'юць, дамы на гэтым месцы ўзвядуць. Мікраараён будзе.

Так, будзе мікрараён. А на карце, што нядаўна ў газеце з'явілася, на гэтых месцах штрыхі дробныя — значыць, тут ад аднаго да пяці кюры. Што ні крок — то праблема, што ні дзень — то чалавечае гора. Не, пра гора не трэба. Занадта яго паўсюдна. Зноў жа пульпу з ракі перакачваюць — гэта добра ці дрэнна? Месяц таму вышэй па рэчцы, дзе раней земснарад стаяў, дзяўчынка патанула. Напярэдадні маці ёй красовачкі купіла. Вось і пайшла яна пасля заняткаў у школе тыя красовачкі памыць, бо забрудзіліся, а дома ж спытаюць: чаму не беражэш, дэфіцыт жа… А там, дзе пульпу выкачваюць, берагі падмытыя, часам і самі абвальваюцца. Падышла тая дзяўчынка

бліжэй і ў раку сарвалася разам з зямлёй, а там жа глыбіня да дваццаці метраў. Мікрараён будзе, але ніколі не будзе той дзяўчынкі, дзяўчыны, жанчыны, маці, дзяцей яе не будзе.

Парушыцца пойма ракі, пад пластом пяску загінуць мільёны казюрак, птушаняты кнігавак, што павыводзіліся ў гнёздах, загінуць два вожыкі, якіх днямі бачыў у зарасніку, і вуж, што жыве ў балотцы. А ўчора падлеткі ўжо неслі качанят і качку з адкручанай галавой. Вось ужо колькі пытанняў.

Алесь яўна не меў ахвоты да размовы, і бульдазерыст памкнуўся быў да трубаўкладчыка, ды нечага раптам махнуў рукой, дастаў пляскатую скрыначку, раскрыў яе — кішэнныя шахматы — і прапанаваў:

— Згуляем?

— Не хачу.

— Ну ты, піжон... Глядзі, расстаўлена ўсё. Я хаджу. — Ён зняў і перасунуў на дзве клетачкі маленькую белую пешку. — Е-чатыры.

— Цэ-пяць, — машынальна адказаў Алесь.

— Конь эф-тры, — узрадаваўся Фёдар, прынёс пустое вядро, перакуліў і сеў на яго. — Давай бліжэй. Табе ж не відно...

— Конь цэ-шэсць.

Бульдазерыст перасунуў чорнага каня з бэ-восем на цэ-шэсць, спытаў:

— Ты, можа, на дошку і глядзець не збіраешся?

— Угм.

Пульпа па-ранейшаму вырывалася з трубы. Воддаль некалькі варон асцярожна далучыліся да чаек і корпаліся ў глеі. Было не холадна.

— Нічога, я не ганарысты, — прамармытаў Фёдар. — Праз два хады павернешся і пачнеш макітрай варушыць: у мяне ж другі разрад.

— Дэ-два — дэ-чатыры.

— Ну ты даеш, — Фёдар забраў чорную пешку сваёй пешкай. — Дэ-пяць узяла дэ-чатыры.

— Конь бярэ дэ-чатыры.

— Сіцыліянскую абарону разыгралі, — пракаментаваў Фёдар узрушана. — А ты — мацак.

— Ага, мацак. Быў.

Быў дзіцячы гурток у Доме піянераў і чорнабелыя фігуркі: сланы, ферзі, коні, ладдзі, пешкі, якія аднойчы ўвогуле зніклі з жыцця. А потым з'явіліся зноў, калі трапіў да добрага чалавека і добрага трэнера. Той сапраўды хацеў мне ўдачы, ну і сабе крыху. І нічога благога тут няма. За якія два гады ў горадзе з'явіўся вундэркінд.

Першы разрад, кандыдат у майстры, майстра. Вы думаеце, у шахматах лёгка выканаць норматыў майстра спорту? Паспрабуйце. Вялікія шахматы адбіраюць у чалавека ўсё: час, звычкі, сяброў, каханне...

Але мне яны выратавалі жыццё. Бо той звар'яцелы маёр, наш камбат, які паслаў аддзяленне ў баявы дазор (ха!), як раней казалі, у разведку боем, а што гэта такое, можна здагадацца, — паслаў іх на смерць. Той маёр пакінуў мяне пры сабе: загадаў, і ўсё, загады ж не абмяркоўваюць — ніяк не мог паверыць, што я выйграю ў яго ўсляпую.

Мы сядзелі там у зямлянках па вушы ў вошах і не маглі нават вытыркнуцца, бо абстрэльвалі з гармат, а які хабар давалі, каб толькі не трапіць

у наш полк! Грашыма і золатам — хто меў, той у нас не сядзеў.

Ён гуляў дзесьці па першым разрадзе — увесь час п'янаваты наш камбат. За тую ноч ён згуляў са мной адну партыю, адну-адзіную. Дарэчы, сіцыліянку таксама. Я сядзеў, замкнёны ў капцёрцы, а маёр за дошкай праз сцяну. Штабныя яму дапамагалі. Я выйграў, бо знарок не спяшаўся тады, — пэўна, у падсвядомасці спрацаваў інстынкт самазахавання, а можа, я баяўся, — у рэшце рэшт з часам пачынаецца і гэта, і застаўся жыць, а яны загінулі. Спалены "бэтээр" знайшлі потым.

...Партыя працягвалася. Яны зрабілі яшчэ па некалькі хадоў. Алесь гуляў усляпую. Сонца выглянула з-за хмар. Пацяплела ўжо як мае быць. Трубаўкладчык нястрымна завальваўся набок. Самотная варона курацапа хадзіла амаль побач, раз-пораз насцярожана пазіраючы на людзей. Глуха грукала па трубе каменне: пульпа залівала поплаў.

— Ферзь жэ-сем і праз тры хады — мат, — сказаў Алесь.

— О-о, — пасля працяглага роздуму з павагай выдахнуў Фёдар. — Прабач, маэстра... Мяне тут ніхто ў кут не мог загнаць. Нават ітээраўцы... Дык без дурняў: хто ты такі?

— Вартаўнік. Ты ж ведаеш.

Фёдар недаверліва фыркнуў і пахваліўся:

— Каб не восем стольнікаў штомесяц, я сам на дно залёг бы. У мяне галава варыць, у палітэхнічны завочна паступіў... А тут і кватэру паабяцалі... Згуляем яшчэ?

Алесь устаў з каменя і моўчкі, крыху кульгаючы, паволі пайшоў да вагончыка.

— Зноў званіць? — помсліва кінуў яму наўздагон Фёдар. — Прараб толькі ўчора лаяўся. Табе ж забаранілі. У бухгалтэрыі сварыліся, што шмат грошай на міжгароднія размовы ідзе.

— Апошні раз.

— Тэлефануй, я ж так, да слова, — нечакана памякчэў Фёдар.

Алесь зайшоў у вагончык, агледзеў брудныя, шурпатыя сцены, зашмальцаваную падлогу, запэцканы мухамі плакат над сталом і набраў нумар. З плаката на яго глядзеў радасны рабочы ў камбінезоне і касцы.

Далёкі званок. Паўза. Потым трубку там знялі.

— Гэта я, мама, — сказаў ён.

— Нарэшце, — прагучала ў трубцы, а то я ўжо хвалявалася.

— Ну што ты, у мяне ўсё добра. Купаюся ў моры, загараю. Кормяць выдатна. Курорт, адным словам.

— А я і не ведаю ўжо, каму верыць... — чулася ў адказ. — Заходзілі твае сябры: Віця, Арцём, Саша. Яны казалі, што тэлефанавалі ў Сочы, ды цябе там не знайшлі...

— Лухта, мама... Тут шмат санаторыяў... Якія навіны?

— Яшчэ паведамілі, што сустрэлі на вуліцы Жэню, і Арцём сказаў ёй у вочы дрэннае слова. За тое, што не дачакалася цябе.

— Дарэмна гэтак. Кожнаму — сваё.

— Саша ў інстытут паступіў... Яшчэ пыталіся хлопцы, ці будзеш вяртацца на другі курс.

— Мне добра пакуль так, мама. Потым.

— Табе нага не баліць, сыночак?

— Не баліць... Танцаваў вечарам у рэстаране. Усё — клас... Я ў шахматы гуляю... Тут у нас турнір.

— Твой трэнер сустрэў мяне аднойчы і сказаў, што, каб не тая праклятая вайна...

— Годзе, мама. Усё будзе добра.

— Яшчэ яны пыталіся, ці бачыла я тваю пуцёўку ў санаторый, быццам ты без пуцёўкі паехаў... Калі ты вернешся, Алесь?

— Мама, я пазваню.

— Можа, табе трэба што?

— Не, — сказаў ён. — У мяне ўсё ёсць. Бывай.

У мяне сапраўды ўсё ёсць пакуль, дый многа і не трэба. Мо крыху цішыні ноччу. Нічога, мама, я яшчэ вярнуся ў наш домік. Хаця назусім — ужо ніколі. Прыйдзе зіма, і паеду куды: месца хопіць, потым напішу, што прапанавалі работу, а то проста паведамлю праз тэлефон. Так лепш за ўсё.

Алесь паклаў трубку і выйшаў з вагончыка. Дзверы рыпнулі за ім. Ён зірнуў у бок ракі, дзе працаваў земснарад, на бульдазерыста, які па-ранейшаму сядзеў на вядры, на трубаўкладчык, што яшчэ больш пахіліўся набок, і пабрыў да будаўнічай пляцоўкі. Пульпа мякка асядала ў яго пад нагамі.

*1990 г.*

# ТЭРЫТОРЫЯ ШЧАСЦЯ

Падкоп быў няглыбака пад зямлёй, але ўсё роўна цесны, брудны і цёмны. Дыхалася цяжка.

Паўзлі, як чарвякі, моўчкі. Першым, асвятляючы шлях ліхтарыкам, поўз Праваднік, за ім адразу юнак.

— На клаўстрафобію не пакутуеш? — урэшце парушыў маўчанне Праваднік.

— Быццам не.

— Добра, але гэта не самае істотнае.

— А што — самае?

— Ворагі. Усе варагуюць з усімі. Як казаў старажытны філосаф: "Цяпер надзей няма нідзе. І прывяло нас да такога вучэнне пра шчасце і дабрачыннасць"... Хаця і сто год таму — якая тут была надзея? Гэта пры першым жа Вялікім Выкідзе?

Праваднік спыніўся і на слаба асветленым твары бліснулі кроплі поту.

— А я дык пад зямлёй не вельмі, — дадаў ён. — Хочацца крыкнуць і ўскочыць на ногі, а — нельга. У тым вось і справа. Хаця — ужо хутка выхад.

Абодва асцярожна вылезлі з падкопу. Ярка асветленая паласа з некалькімі шэрагамі калючага дроту і кібаргамі-ахоўнікамі на вышках апынуліся ззаду. Яшчэ далей неба зрэдку асвятлялася далёкімі агнямі Мегаполіса. Там ноччу на вуліцах

палілі вогнішчы. Урэшце яны адтуль і прыйшлі: Праваднік і яго падапечны.

— Вось мы і на Тэрыторыі Шчасця, — сказаў Праваднік. — Праз гадзіну развіднее, а пакуль адпачнём. Потым ты мне заплаціш і — расход. Можаш любавацца сваёй радзімай хоць да скону.

У Праваднiка быў безвалосы, гладкі, як у старажытнага акцёра Юла Брынера, чэрап. Тонкая кашуля не хавала яго мускулістае тулава, а вопытнае вока заўважыла б, што касцяшкі рук былі ў наростах ад пастаянных практыкаванняў. На поясе вісеў доўгі нож у скураных похвах, а за плячыма арбалет. Праваднік выпраменьваў прыхаваную пагрозу і сілу.

— Вазьмі зараз, — сказаў яго суразмоўца і выцягнуў пулярэс. — Дарэчы, час расплаціцца. Дзякуй.

Гэта быў даволі малады чалавек, амаль хлапчук. У адрозненне ад Праваднiка, густыя, коратка стрыжаныя валасы колеру зямлі тапырыліся на яго круглай галаве. Шэрыя вочы сведчылі пра розум і спрыт. Як і Праваднік, ён быў аперазаны нажом у похвах.

— У цябе багата крэдытак, — асцярожна адзначыў Праваднік.

— Ну, не так і багата. Застаецца, хіба што, на ежу і білет на карабель, каб даплыць дадому.

— Калі ты на яго трапіш, — пасля роздуму заўважыў Праваднік.

— Не суроч, — юнак перажагнаўся.

— Пабачыць Радзіму? — Праваднік не хаваў здзіўлення. — Ты не пабаяўся з`явіцца з-за акіяна? Сюды, на Тэрыторыю Шчасця?

— Так.

— Хіба там больш не Радзіма?

— Не. Мае продкі адсюль.

— А-а, — зморшчыўся Праваднік. — Я ўжо чуў. Ты з гэтых... як іх... бульбашоў?

— З тых самых, — сказаў юнак. — Толькі жыву за Акіянам.

— І там бульбашы перавяліся? Чаму паўсюль так? Навокал жывуць кітайцы, цюркі, татары, арабы, афрыканасы, гукі ці в'етнамцы, мурыны і ўсякія іншыя. А бульбашы — хіба што тут, на Тэрыторыі Шчасця. Дый іх засталася жменька.

Юнак сціснуў сківіцы.

— Прадзед казаў дзеду, дзед — бацьку, бацька — мне: не было нам на нашай зямлі паратунку. Спераду адзін "брат" стаяў з наганам, збоку — другі з наркатой, а за спінай — трэці з нажом. Як мы падымаліся, дык і біў ззаду. Вось наша гісторыя.

— Бач ты, усе вінаватыя. А трэ было біць у адказ. Ствараць атрады смяротнікаў. Быў хоць адзін смяротнік? Дзіўна. Яшчэ сто гадоў таму бульбашоў налічвалася дзесяць мільёнаў. Дык няўжо аднаго не знайшлося?

— Прадзед казаў дзеду, дзед — бацьку, бацька — мне: смяротныя атрады былі ў час бітвы пад Крутагор`ем.

— Нешта я не чуў пра такую бітву.

— Яна адбылася дзевяцьсот год таму.

— Ну, рассмяшыў.

Кудлы туману плылі ў іх над галовамі. Крыкнула нейкая птушка, але змоўкла.

— Урэшце, усіх нас чакае адно, — сказаў Праваднік. — Жор ідзе. А вось цікава: жывое можа існаваць толькі паядаючы такое ж жывое. Чарвяк паядае лісце, рыба — чарвяка, чалавек — рыбу,

кібарг — чалавека, усіх — вірусы, ланцуг бясконцы... Ты павінен ратаваць сваё цела, каб не разабралі на органы.

— Так небяспечна?

— Тут гэта распаўсюджана. Выкралі чалавека і — разабралі. Канібалізм. Так што сачы за сваім целам.

— Ну, а ты, — спытаў юнак, — ты хіба шмат забіваў?

— Вядома. Каго толькі я не мачыў: мурынаў, цюркаў, арабаў... Быў тут такі час пасля Трэцяй Сусветнай — Вялікая Мачылаўка і Вялікі Галадамор.

— Дык што — тут няма законаў? — спытаў юнак. — Якія тут законы, на Тэрыторыі Шчасця?

— Звычайныя. Як і паўсюль. Асноўных тры: не прагульвай лішняга (гэта значыць, больш таго, што маеш), не "стучы" і не паводзь сябе як жанчына — у сэнсе педэрастыі. Хіба ў вас там, за акіянам, — іншыя законы?

— Не зусім.

— А ты не баішся, што я "кіну" цябе ці ўвогуле пазбаўлю жыцця? — раптам спытаў Праваднік. — Чалавек слабы, і тут усякае здараецца — асабліва пасля Другога Вялікага Выкіду. Разборкі па зонах, па масці, па крыві...

— Не зарэжаш жа, як павярнуся спінай? — падумаўшы над яго словамі, сказаў юнак.

— Не зарэжу, — меланхалічна паабяцаў Праваднік.

Яны замаўчалі, назіраючы, як першыя слабыя промні сонца працінаюць туман, выяўляючы кволае кустоўе, зеляніну неўміручых дзьмухаўцоў і рэдкія травы на асмужаным даляглядзе.

— Чаму такая назва — Тэрыторыя Шчасця? — спытаў юнак. — Хіба тут можна гаварыць пра якое шчасце, удачу ці поспех? У стокіламетровай “зоне”? Колькі тут кюры?

— Так празвалі. Пэўна, у сэнсе іроніі. Урэшце, сам пабачыш, — пакрывіўся Праваднік. — Я ўсё-такі хачу ў цябе спытаць іншае, — дадаў ён, — ты прыбыў сюды сапраўды дзеля таго, каб пабачыць Радзіму? Мэты ў людзей самыя розныя. А праўду кажуць у апошнюю чаргу.

— Так, але чаму ты пра гэта пытаеш?

— Таму, што і я з бульбашоў, — пасля працяглай паўзы нечакана сказаў Праваднік. — Мы аднаой крыві. Толькі я адзін, і сам за сябе адказваю. Я не хачу паміраць у “зоне”, няхай сабе і сярод супляменнікаў. Дый там ужо адны мутанты.

— Вось яно як абарочваецца, — пасля роздуму выціснуў юнак. — Што ж, дзякуй за інфармацыю. Тым не менш, я хачу пабачыць усё на свае вочы. Гэта — мая мэта. Чалавек без мэты — нішто. Хіба не так?

— Пара.

Праваднік ускочыў на ногі.

— Цяпер слухай, — сказаў ён. — Праз гадзіну хады будзе мяжа. Але яна ўжо не ахоўваецца. Да поўнага ўсходу сонца ты пройдзеш яшчэ кіламетраў дзесяць. Трымайся паўднёвага напрамку і беражы цела.

— Так, зразумеў.

— Ну, удачы. Пэўна, больш не ўбачымся. Там яшчэ, у іх паселішчы, на трубе такая штука з кужалю вісіць, сцяг называецца: белая паласа, чырвоная і зноў белая... Знойдзеш...

# КАРМУШКА ДЛЯ СІНІЦ

## 1

У гэтым адносна ціхім гарадскім квартале Тоўсты Крамнік пасяліўся з лета. Крамнік прыехаў сюды аднекуль здалёк, зусім не ведаў мясцовай мовы, але разумеў і размаўляў па-руску. Ён быў лупаты, сапраўды тоўсты, з пукатым жыватом, спешчанымі рукамі, якія, пэўна, ніколі не ведалі фізічнай працы, і з ухілістымі чорнымі вочкамі. Тоўсты Крамнік купіў тут дом, потым — краму побач і пачаў гандляваць, наняўшы абслугу — некалькі чалавек з мясцовых. Праз месяц-паўтара да яго прыехала Крамнічыха з двума дзецьмі — увішнымі і ўкормленымі падлеткамі, якія ў верасні пайшлі вучыцца ў мясцовую школу. Крамнічыха, мажная, чорнавалосая, пачала выконваць пры краме абавязкі бухгалтара і фінансіста. “Хто не цэніць капейкі, той не варты і рубля”, — часта казаў Тоўсты Крамнік.

Потым надышла позняя восень, і ўрэшце — зіма. Выпаў снег, і нечакана, як гэта часта здараецца ў гэтых мясцінах, на кароткі тэрмін ударылі маразы.

У адзін з такіх дзён, напачатку зімы, Тоўсты Крамнік атрымаў ліст.

“17 снежня 200... г.

Тоўсты Крамнік! Мала таго, што Вы выказваеце знявагу да людзей — абважваеце і падманваеце пакупнікоў у цяперашняй Вашай краме, Вы і Ваша сям’я парушаеце яшчэ адну запаведзь: жорстка ставіцеся да жывёл. Так, нядаўна вашыя дзеці скруцілі шыю і выкінулі за агароджу хатняга папугая, а Вы самі выгналі на вуліцу сабаку, якога тры месяцы таму прыдбалі, каб ахоўваў ваш дом, але пасля таго, як Вы ўстанавілі сігналізацыю, сабака стаў Вам непатрэбны. У сувязі з усімі гэтымі наступствамі я прыйшоў да высновы, што Вашыя маральныя якасці вартыя карэкціроўкі, і патрабую ад Вас неадкладнай своеасаблівай епітым’і:

1) знайсці і вярнуць у двор сабаку;

2) павесіць на дрэва кармушку для сініц і штодня насыпаць туды корм.

Тэрмін адпрацоўкі — суткі. У выпадку непадпарадкавання да Вас будуць прынятыя адэкватныя меры.

*Выканаўца”.*

Крамнік доўга чытаў ліст, варушыў губамі, плямкаў, прыцмокваў, даў пачытаць Крамнічысе і ўрэшце плюнуў на яго, скамечыў і кінуў у сметніцу.

* * *

Пад вечар таго ж дня Тоўсты Крамнік ужо не памятаў пра ліст. Яшчэ праз дзень, выпраўляючыся ад брамы дома, дзе ён звычайна пакідаў свой грузавы пікап, Крамнік выявіў, што ў машыне праколатая шына... Ён памяняў яе на “запаску”, а пасля быў вымушаны ехаць у аўтасервіс, каб заклеіць камеру. Праколаў было некалькі, і Крамнік насцярожыўся.

Назаўтра ён ізноў атрымаў ліст.

“19 снежня 200... г.

Хітры Крамнік!

Вы не выканалі ніводнага пункта з маёй прапановы:

1) вярнуць сабаку;

2) уладкаваць кармушку для сініц.

У сувязі з гэтым будзеце пакараныя адпаведна вашай сутнасці.

*Выканаўца”.*

Крамнік ізноў паказаў ліст Крамнічысе і заўважыў:

— Мне пракалолі шыну.

— Падрыхтуй пакет з садавіной ды агароднінай, занясі ўчастковаму разам з гэтай пагрозай, і няхай завядзе справу, — параіла Крамнічыха.

Ноччу зазвінела і рассыпалася шкло ў адной шыбе, потым — у другой. Крамнік імкліва апрануўся і, хоць быў баязлівец, выбег за браму, але на вуліцы нікога не ўбачыў. На марозе ён да таго ж застудзіўся і падхапіў радыкуліт.

Участковы, малады хлопец з лейтэнанцкімі пагонамі, уважліва выслухаў Крамніка і спытаў, кіўнуўшы на пакет, які той паклаў яму на стол:

— А гэта што?

— Гэта вам, — лісліва заўсміхаўся Тоўсты Крамнік, — так бы мовіць, задатак. Бананы і ўсё такое. За раскрыццё справы.

— Забярыце, — грэбліва адхіліў пакет участковы і дадаў: — За прапанову хабару я магу завесці справу асабіста на вас.

— Не, не, не, — спужаўся Крамнік і пацягнуў пакет да сябе.

— Урэшце, — дадаў участковы, — з фактамі тэрору, як вы гэта назвалі, мы разбяромся, але і да вас ёсць пытанні. Пакупнікі скардзяцца, што вы іх аблічваеце і абважваеце, падсоўваеце нясвежы тавар. А на прапанову даць аднаму з іх кнігу скаргаў вы адказалі наступнае (участковы выцягнуў паперку з нейкай папкі і прачытаў уголас): "Самі пішыце — самі і чытаць будзеце". Быў такі факт?

— Гэта паклёп, — сказаў Тоўсты Крамнік.

— Майце на ўвазе, — перасцярог яго ўчастковы, — у вашай рэспубліцы, адкуль вы прыехалі сюды, было адно, а ў нас тут іншае, іншая, так бы мовіць, ментальнасць...

Раніцай Крамнічыха выцягнула з паштовай скрыні наступны ліст.

"21 снежня 200... г.

Сквапны Крамнік! Дагэтуль я не бачу на вашым двары сабаку (ён пакутуе штодня ля памыйных скрыняў) і на дрэве няма кармушкі для сініц.

*Выканаўца".*

Па абедзе Тоўсты Крамнік выявіў, што ўсе чатыры шыны ягонага пікапа праколатыя.

* * *

— Можа, ты мала яму паклаў? — спытала ў мужа Крамнічыха, маючы на ўвазе ўчастковага.

— Змоўкні, дурная ты баба, — незалюбіў Крамнік і, абхапіўшы галаву рукамі, знерухомеў у цяжкім одуме.

Яму раптам успомнілася радзіма, дзе ён пражыў доўгія гады, навучыўся гандляваць, што было зусім не так проста, як можа здацца, але ён любіў гэтую справу. Ды надышоў неспадзявана смутны час, наспявала вайна, а Тоўсты Крамнік не хацеў ваяваць, а хацеў менавіта гандляваць. А сапраўдны гандаль, лічыў ён, гэта высокае майстэрства падману. Толькі вось народ у апошнія часы стаў нейкі нервовы, зласлівы, і Крамнік вырашыў змяніць месца жыхарства.

І тут усё ў яго быццам ішло як належыць, каб не гэты невядомы Выканаўца з яго вар'яцкімі патрабаваннямі. Можа, ён сапраўды вар'ят, меркаваў Тоўсты Крамнік, і ўцёк з якой лякарні — цяпер іх большасць паадпускалі на волю, бо няма сродкаў карміць. Можна было б зразумець, каб гэта аказаўся які рэкецір, вымагальнік, які прагнуў яго грошай, а тут пра нейкага сабаку, пра сініц...

Тоўсты Крамнік быў у вялікай роспачы. Ісці зноў да ўчастковага? Але той чамусьці, як кажуць, не вельмі лёг яму на сэрца: можа, сапраўды ён мала таму прапанаваў? Але не, тут не тое — Крамнік навучыўся крыху разбірацца ў людзях. На ўчастковага яму разлічваць было няварта. Застаецца адно — абараняць сябе і свае набыткі самому.

***

Звечара ён знарок пакінуў свой пікап на вуліцы, ля брамы, а як сцямнела, цёпла апрануўся, захапіў бейсбольную біту, коўдру і, расклаўшы сядзенні, лёг, стаіўшыся, і стаў чакаць.

Ён не ведаў, колькі прайшло часу. Мароз пачынаў ужо дабірацца да пальцаў на нагах і руках. Мінакоў станавілася ўсё менш — Тоўсты Крамнік чуў, як снег парыпваў пад іх ботамі. Ён нават задрамаў, яму снілася чамусьці лета, у сябе, на Каўказе. Ля вёскі, дзе ён нарадзіўся, у вінаградніку на сцяжынцы ён убачыў шыпуна. Змяя пагрозліва сыкала на яго, і ён спужаўся.

Тоўсты Крамнік раптам прачнуўся. Шыпела пракалатае кола, спускаючы паветра. Ён выскачыў з машыны, убачыў зламысніка, які быў так заняты сваёй справай, што не зважаў на небяспеку, і схапіў таго за каўнер.

Злачынец вырываўся з усяе сілы, але быў малы ростам, што адразу надало Тоўстаму Крамніку рашучасці. Ён ужо замахнуўся бейсбольнай бітай, каб абрынуць яе на праціўніка, ды раптам спыніўся і атарапеў: перад ім была дзяўчынка!

— А-а, дык гэта ты праколваеш мне шыны! — засіпеў ён і, ашчаперыўшы яе, пачаў трэсці.

— Дапамажыце! — крыкнула між тым дзяўчынка нечакана звонкім, пранізлівым голасам, і ўжо на ўсю вуліцу: — Ратуйце! Педафіл!

Апошняе слова прымусіла Тоўстага Крамніка адразу кінуць яе і адскочыць убок, нібы абвараному кіпнем. Абвінавачванне ў педафіліі, калі яно даказанае, каралася вельмі жорстка — пра тое ён ведаў дасканала.

Невядомы "злачынец", адразу выкарыстаўшы яго няўпэўненасць, кінуўся ўцякаць і імгненна знік за рогам вуліцы. Дакладней, знікла...

Тоўсты Крамнік доўга стаяў на марозе і лавіў ротам ледзяное паветра. "Вось дык куля..." — думаў ён.

## 2

Танюткую светлавалосую дзяўчынку звалі Наста. Ёй было трынаццаць гадоў.

Па вуліцы, дзе цяпер пасяліўся Тоўсты Крамнік, Наста ўжо некалькі год хадзіла штодня: у школу і назад, дадому, у краму ці па якіх сваіх іншых справах. Так яна і цяпер вярталася з урокаў. Шлях яе праходзіў паводле знаёмых арыенціраў — закінутай лядовай пляцоўкі, цырульні, куды зрэдку заходзілі жанчыны, шэрагу пяці- і дзевяціпавярховых будынкаў, паўз смеццевыя скрыні, якія раз-пораз перакульвалі ў сябе машыны-смеццязборнікі, міма невялічкага скверыка і прыватных дамоў, адзін з якіх належаў Тоўстаму Крамніку. Менавіта яго падворак яна добра бачыла з вышыні дзявятага паверха, дзе жыла з бацькамі і братам Данілам.

Ля сметніцы Наста, як заўсёды, заўважыла некалькіх бадзяжных сабак, але таго, якога выгнаў Тоўсты Крамнік, чамусьці не было. Дзяўчынка мінула краму, потым дом гандляра і на ліфце паднялася ўрэшце ў сваю кватэру.

Бацькі былі на працы — абодва хадзілі на завод у першую змену, а пятнаццацігадовы брат Даніла збіраўся на трэніроўку ў спартыўную секцыю. Ён займаўся кікбоксінгам.

— Ты позна швэндаешся на вуліцы, — сказаў ёй Даніла. — Маці ўчора непакоілася.

— Я за сябе пастаю.

— Глядзі, — працягваў вучыць яе Даніла. — Жыццё не даруе памылак, — і спытаў: — Цябе ніхто не крыўдзіць?

Наста моўчкі ўсміхнулася брату. У далёкім дзяцінстве яна марыла быць хлопчыкам і стаць такім,

як ён. Асабліва цяпер Даніла быў для яе аўтарытэтам. Ён не курыў, не піў піва з бутэлек, не апранаўся, як "панк" ці які абсос, і ненавідзеў тых, хто нюхае клей ці ўжывае наркотыкі. Брат быў высокі і шыракаплечы, насіў простую куртку "пілот", нармальныя нагавіцы і дыхтоўныя, добра прашытыя чаравікі "грындэрс".

— Я прыйду пазней, — сказаў ужо ў дзвярах Даніла. — Мы цяпер трэніруемся ў падвале, бо не хапае грошай на рамонт залы. Даводзіцца дапамагаць і пасля трэніровак.

Даніла сышоў, а Наста, пакуль падаграваўся суп, выйшла на балкон і зірнула ў бок дома, дзе пасяліўся Тоўсты Крамнік.

Дзяўчынка знерухомела ад здзіўлення.

Па двары Крамніка бегаў сабака.

Той самы!

Потым з дзвярэй выйшаў гаспадар. У руках ён трымаў... Не, памыліцца было немагчыма... Ён трымаў...

Кармушку для сініц!

## 3

У гэтую ноч і наступную Тоўсты Крамнік спаў спакойна. Ён нават не зважаў на халодны, пранізлівы вецер і на нядобрыя позіркі Крамнічыхі, якой было загадана карміць сабаку і падсыпаць у кармушку корм.

Сініцы раіліся пад ягонымі вокнамі.

Днём Тоўсты Крамнік праверыў паштовую скрыню і выявіў там адрасаваны яму чарговы ліст.

“25 снежня 200... г.

Шаноўны Крамнік! Людзям заўсёды лёгка паразумецца, калі яны паважаюць адно аднаго і жывуць па сумленні, а не па хлусні. Хіба не так? Сёння сонца паварочвае на лета. Я рады, што і нашыя стасункі набылі адпаведны паварот. Спадзяюся, сабака, якога Вы калісьці так неабдумана выкінулі на памыйку, дажыве свой век дагледжаны, а птушкі, якія залятаюць да Вас на падворак, будуць заўсёды накормленыя.

Цяпер, калі Вы яўна становіцеся на шлях выпраўлення, зносіны з Вамі, хоць і аднабаковыя, робяцца ўсё болей прыемнымі. Добра, што Вы нескладанай маніпуляцыяй з калькулятарам вылічылі, што карміць сабаку і з дзясятак птушак значна танней, чым рамантаваць машыну і шкліць шыбы.

*Выканаўца.*

P.S. Дарэчы, на Вас, мудрага і паспяховага бізнесмена, накладаецца новая, зусім дробная епітым’я: выдаткаваць колькі грошай на рамонт залы ў мясцовай спартыўнай школе. Вы ж не супраць?”

# ПРАСНАКІ НА ВЫБАР

Адвячоркам у хаціну praцiснуліся дзесяць старэйшын, моўчкі паселі ўздоўж сценаў і агледзелі праснакі. Стары са зморшчаным тварам няспешна расклаў іх на палічцы перад стодамі-ідаламі, пасля дадаў яшчэ адзін, іх стала дзесяць. Праснакі былі аднолькавыя, быццам разам спечаныя. Стары моўчкі сеў.

Паведамілі, што вой прывёў хлопчыка. Сутонела, і стары спачатку добра не разгледзеў яго. Толькі потым, калі хлопчык падышоў бліжэй і стаў перад ім так, што святло паходні заскакала на яго бледным твары, стары доўга ўглядаўся. Круглы твар, вялікая галава, маленькі рот упарта сцяты. Свой хатулёк хлопчык паклаў у кут.

— Ну, вось, — урэшце сказаў стары. — Ты прыйшоў.

— Мяне прывялі, — удакладніў хлопчык.

— Не крыўдуй, — мовіў стары. — Я хутка памру, а нам патрэбны вяшчун, прадказальнік. Інакш мы не дадзім рады ворагам, не адолеем пошасць і хваробы, не пераможам у бойцы. Мы доўга шукалі сярод такіх, як ты, і вось цябе прывялі. Мне сказалі, што ты бачыш інакш, чым усе, — гэта праўда?

— Так, — адказаў хлопчык.

— І што ты бачыш?

— Рознае. Вакол людзей калышацца святло. У адных большае, у другіх меншае. Людзі носяць у сабе шмат хваробаў.

— Ты не любіш людзей?

— Не ведаю.

— Такімі яны створаны. Што яшчэ бачыш?

— Вой, які мяне сюды прывёў, хутка памрэ.

Стары насцярожыўся. Старэйшыны маўчалі.

— Нічога дзіўнага, — адазваўся ўрэшце стары. — Ён жа воін. Я бачу дзень і час, калі сам адыду ў нябыт. Ужо хутка. Ты хочаш стаць такім, як я?

— Не ведаю.

— Цяпер позна думаць.

— Тады няхай, — хлопчык схіліў галаву.

— Што ты яшчэ бачыш?

Хлопчык узняў вочы на закураную столь.

— Больш нічога. А што я павінен яшчэ бачыць?

— Шмат чаго, — сказаў стары. — Потым я навучу цябе. Ты галодны?

— Так.

— Зірні, — сказаў стары, і хлопчык прасачыў за яго позіркам, — вунь дзесяць праснакоў. Адзін з іх паклаў я. Можаш яго з'есці. Толькі адзін. Ты павінен убачыць яго. Праснакі аднолькавыя з выгляду... для іншых.

— Згода, — сказаў хлопчык.

— Пачакай, — sспыніў яго стары, — чаму цябе не ўзялі на абучэнне да вояў?

— Я блага кідаю дзіду, — пасля паўзы адказаў той.

— Ідзі, — сказаў стары і заплюшчыў вочы.

Хлопчык паволі наблізіўся да стала, пацягнуўся рукой да праснакоў, сумеўся на хвіліну, выбраў адзін і павярнуў назад.

— Еш, — сказаў стары.

Хлопчык пачаў есці. Стары пільна сачыў за ім. Старэйшыны моўчкі глядзелі.

Урэшце ён праглынуў апошні кавалак. Агонь паходні адкідваў яго павялічаны цень на сцяну і столь. Так прайшла хвіліна, другая. Стары з цяжкасцю ўзняўся на ногі, і твар яго асвятліўся радасцю і пяшчотай.

— Падыдзі, — загадаў ён зусім няўладна. Хлопчык падышоў. Стары паклаў яму на плячо сваю далонь. — Хадзем, — паклікаў ён, — я пакажу табе, дзе ты будзеш спаць. Ты выбраў правільна — узяў мой праснак.

Старэйшыны падняліся й адзін за адным выслізнулі з хаціны.

***

Каля блізкіх вогнішчаў завіхаліся воі. Ноч ужо распасцерлася над лесам. Вецер шамацеў у вершалінах дрэваў і ледзь-ледзь кранаў твары прахалодай: зморшчаны старога, бледны ды круглы хлопчыка.

...Вой, які прывёў хлопчыка, быў галодны. Ён з'еў кавалак мяса, якім яго пачаставалі ля вогнішча, але прагнуў хлеба. Хлеб пяклі рэдка, яго заўсёды не хапала, а ў хаціне знахара, як ён заўважыў у прачыненыя дзверы, ляжалі праснакі. У хаціну, дзе стаяў стод, забаранялася заходзіць пад страхам смерці. Вой ведаў гэта, але, павагаўшыся, дацягнуўся да праснака дзідаю, падчапіў яго і выцягнуў. Тут яго й схапілі.

Стары з хлопчыкам не зрабілі й дзесяці крокаў, як іх дагнаў задыханы раб.

— Вой, які прывёў хлопчыка, парушыў закон, — сказаў ён знахару.

Яны вярнуліся. Спадарожнік хлопчыка быў ужо без дзіды, але праснак сціскаў у руцэ. Яго трымалі.

— Ты ведаеш закон? — спытаў сурова стары.

— Ведаю, — адказаў вой упэўнена. — Я не заходзіў туды й дастаў праснак дзідаю.

— Еш, — пасля роздуму сказаў стары. — Калі ты яго выбраў, то гэтага хочуць продкі.

Вой нерашуча агледзеў усіх і адкусіў. У тое ж імгненне ён з крыкам паваліўся на зямлю, сутаргава выцягнуўся й заціх.

Хлопчык глядзеў, сцяўшыся. Ён зразумеў, што ўсе праснакі, акрамя аднаго, былі атручаныя, што ён вытрымаў іспыт. Пройдзе час, і ён зойме месца старога.

Бо такі закон.

# ВОСЫ

Лёгкая хмарка паволі слізганула да сонечнага дыска і пяшчотна накрыла яго сваёй кволай паветранай коўдрай.

— Фу, ты!

— Гэ-эх!

Ля парніковага склада два маладыя рабацягі ў падраных кашулях і картовых нагавіцах спыніліся і ўздыхнулі з палёгкай.

— Хоць бы бочку з вадой паставілі: акунуўся — і кайф, — сказаў першы, якога звалі Васіль.

— Вазьмі ды пастаў, — бочак хапае, — параіў другі. — Ці рукі не адтуль выраслі?

— Не наязджай, Пеця, — скрывіўся першы, — надта ты правільны...

— Супакойся. Ніхто табе не дапаможа, пакуль сам не зробіш.

— А я што, не ўкалваю? А прафсаюз на храна? Камуфляж, ці як?

— Не люблю, калі сонца занадта пячэ, — пераведў гутарку на іншае другі, якога звалі Пётра, — і восы надакучылі, распладзіліся тут, так і пруць. Я неяк толькі распрануўся, як проста на мяне муха яйкі наклала — павар'яцелі, пэўна.

— Дрэнная прыкмета, — сказаў Васіль. — Калі на жывое яйкі кладуць. Быць табе, Пяцюня, бітым, хоць ты і партыйны.

— Кінь ты, — адмахнуўся Пётра, — пры чым тут гэта?

— А я ведаю, чаму восаў столькі, — сказаў Васіль. — Ім тут лепш не трэба — гнілі колькі: ігрушы, яблыкі, памідоры. І тыя, хто тут ашываюцца, — гнілыя...

— І то праўда, адыходаў занадта, — згадзіўся Пётра.

—Ты, як партыйны элемент, і вырашы праблему. Што змоўк?

Васіль злосна зірнуў на неба, з якога няшчадна смаліла сонца, насунуў на прышчаваты лоб задрыпаную магерку, уладкаваўся на пустую скрыню і сказаў:

— Ну ты і змей, Пяцюня. Заўтра вінта нарэжаш у новую кватэру, адгул возьмеш, а мне рогам пахаць? Ксіву далі?

Васіль быў высокі, стройны хлопец, але, як казаў той-сёй, “закручаны”. Калісьці ён займаўся лёгкай атлетыкай, няблага скакаў у даўжыню і вышыню, рыхтаваўся выканаць нарматыў майстра спорту, але нарматыў раптам узнялі аж на дзесяць сантыметраў. Гэта так падзейнічала на Васіля, што ён трывала “забухаў”, кінуў спорт і трапіў спачатку ў ЛПП, а потым і да “кума”. Цяпер, пасля таго як “адкінуўся”, ён “прыпух” грузчыкам у прыгарадным саўгасе-аграфірме.

— Анягож, — адказаў яго напарнік Пётра, дастаў і паказаў паперку. — Вось ён, ордэр.

Пётра быў ціхмяны, круглатвары, з наіўнымі вачыма хлопец з прыгараднай вёскі, задаволены ўжо тым, што працуе, лічы, у горадзе (саўгас трымаў парнікі на яго ўскрайку), што без асаблівых прыгод адслужыў армію і вось атрымаў урэшце

ордэр на кватэру, дзе жыў раней аграном-халасцяк. Той перабраўся ў горад.

— От, змеі, — не сунімаўся Васіль, вяла адганяючы залётную асу. — І ты туды ж, Пяцюня, шасцярыш усё. Партыйны, бач. Дык што там кажа Перадавое Вучэнне пра наша становішча, га? Ім абы не гарбець, а лёзунгамі нам, дурыкам, мазгі пудрыць. "Умножим мы усилия в борьбе за изобилие", "Всё больше год от года товаров для народа". Дзе яны, тавары, га, Пяцюня, змей? Буханём хоць за кватэру?

Раптам ён падскочыў і схапіўся за шыю.

— Укусіла, падла! — Пётра засмяяўся.

— А што, калі ў сонную артэрыю? — спалохана зароў Васіль. — Што тады? Дзе гэтая артэрыя, з якога боку? Зірні хутчэй!

— Мо і жывы застанешся, — нават не ўзняўся з месца Пётра.

— Ты што, змей? Чаму яна цябе не ўджаліла? А, сукі, ну я ж ведаю, дзе тое кубло, я... зараз. У мяне ж мех цэлафанавы ёсцека, я ў ім пайку прынёс...

Ён раптам пабег, трымаючыся рукой за шыю.

Пётра агледзеў чырвоную гару памідораў, яшчэ большую гару драўляных скрыняў, уздыхнуў і зноў недаверліва агледзеў ордэр, які ўручылі яму на нядаўнім сходзе. На тым сходзе гаварылі, ківаючы на яго, "пра заахвочванне перадавікоў", "пра план", "пра своечасовую пастаўку прадукцыі гораду", "пра арэнду", пра тое, што "працаваць трэба лепш і больш". Гаварылі так і раней, але чамусьці начальства завяло сабе асобную ведамасць, а ў іх, рабацяг, зарплата не пабольшала. Наводшыбе, між тым, неяк прыкметна вырас спецыяльны парнік,

дзе ўсё расло на натуральнай арганіцы і куды пачалі актыўна наведвацца шафёры-"шасцёркі" з горада, і тады прыходзіў брыгадзір і, адводзячы ўбок вочы, прасіў: "Ты, Пяцюня, застанься крыху ды збяры там, што просяць, складзі ў скрыні як мае быць, потым адгуляеш".

Пётра аднойчы завёў з брыгадзірам размову пра той спецпарнік, але брыгадзір даў яму зразумець, што калі хоча жыць у аграномавай кватэры, то лепш няхай прыкусіць язык. І Пётра замаўчаў.

...Васіль вярнуўся. У руцэ ён трымаў цэлафанавы мех, з якога, калі падышоў бліжэй, данеслася выццё.

У мяху азвярэла гулі восы. Тамсама было і расціснутае шэрае кубло, якое Васіль, пэўна, скалупнуў, насунуўшы мех. Восаў было неверагодна многа.

— Ну, усе тут, — радасна пацвердзіў ён і патрос мехам. — У бочку з вадой іх, а пакуль — лаві сеанс...

Восы злосна загулі.

У гэты час шэрага колеру "Волга" з'явілася на дарозе і пачала імкліва павялічвацца ў памерах. Слуп пылу курэў за ёй.

— Мо зліняем? — занепакоіўся Васіль. — Внатуры нейкі бык да нас... Гарбець вечарам прымусяць.

— У мяне партыйны сход, — сказаў Пётра, — сёння мяне не прымусяць.

— Я на твой сход... лажыў, — незалюбіў Васіль. — Адзін тут нізавошта не застануся, так і далажы там, на вашым форуме.

"Волга" сапраўды спынілася непадалёку. А потым, як заўсёды, быццам нечакана, узнік і брыгадзір,

але тут, як ведаў Пётра, была свая нагода. Уладальнік "Волгі" тэлефанаваў іх дырэктару і дасылаў "шасцёрку", а дырэктар у той самы час даваў загад брыгадзіру, ну, а той ужо ішоў да яго, Пётры.

Брыгадзір быў мажны, з пукатым жыватом, загарэлым да чарнаты тварам і малочна-белай лысінай. Ён зрабіў Пётру знак і, калі той падышоў, сказаў:

— Бачыш "Волгу"? Паміж намі — райкомаўская, першага. Памідораў дзве скрыні пакладзі і гуркоў там колькі. Выберы лепшыя, укінеш у багажнік.

— Першы, ён хто — інвалід вайны? Без рук, без ног? Пенсіянер без грошай?

— Ціха, не муці ваду, і так хапае клопатаў. Табе кватэру далі, ордэр, дарэчы, атрымаў? Ці замест яго ордэн хочаш?

— Ды што вы ўсё з гэтай кватэрай? — незалюбіў раптам Пётра. — Халопам цяпер стаць? Ён грошы заплаціў?

— Но, но! Ты гэта кінь. Усе бяруць.

Брыгадзір аднак жа, з прыкрасцю плюнуў і пайшоў.

Шафёр-"шасцёрка" назіраў. Пётра адзначыў са злосцю, што вось так заўсёды — самі нізавошта нават не нагнуцца, лічаць ніжэй за сябе, ім прынясі ды нагрузі.

Ён моўчкі ўзяў скрыню і пайшоў да парніка. Але пакуль збіраў, налівался ўсё больш цьмянай, незразумелай крыўдай. Да таго партыйнага паслугача, да агранома, які прытоена кпіў з яго, да няшчаснай кватэры, аднаго пакойчыка ў драўляным бараку, дзе зімой халадэча, а летам спёка, да свайго неакрэсленага жыцця, да ўсіх тых,

хто купіў яго за той ордэр, але непрыкметна падабраўся і да душы — да ўсяго свету.

Сонца, здаецца, ні на сантыметр не скранулася ў небе і бязлітасна струменіла гарачыню нават праз пыльныя вокны.

Пот бруднымі пісягамі сцякаў у яго па скронях, казытаў шчокі. У галаве ўсё больш звінела, і ён раптам чамусьці ўспомніў, што такое самае пачуццё было ў яго, калі на першым годзе службы ў войску ён вісеў на турніку, на якім трэба было падцягнуцца абавязкова пятнаццаць разоў, а ён здолеў толькі дванаццаць, і сяржант з "дзядамі"-памагатымі прыкруцілі яго рукі да перакладзіны дротам, і сонца таксама смаліла ў твар. "Что, бульбончик, такой слабый, а? Бульбы мало ел?" І ён тады сабраў унутры сябе ўсё, што толькі ў ім было, і, злаўчыўшыся, сандануў сяржанту нагой у твар. Яго збілі, пасля адбою – зноў, а раніцай ён падышоў да сяржанта і зноў кінуўся да таго, і больш яго тады ўжо не чапалі.

Пётра сеў на скрыню і задумаўся. Потым выцягнуў з верхняй кішэні кашулі кандыдацкі партбілет, пакруціў яго ў руках, пагартаў, пакорпаўся і дастаў з другой кішэні нататнік, выдраў з яго чысты ліст, падумаў і напісаў:

"Прашу не лічыць мяне камуністам. Прычына вам, таварыш першы сакратар, спадзяюся, зразумелая. Грузчык П. Серада".

Ён распісаўся, паставіў лічбу і, нібы плывец, што збіраецца даць нырца, набраў у грудзі паветра. Потым паклаў білет і паперку ў скрыню і закідаў зверху памідорамі, сабраў яшчэ адну скрыню, як і прасіў брыгадзір, з найлепшымі сакавітымі і чырвонымі пладамі і пайшоў па агуркі.

Васіль сядзеў непадалёку і абмацваў чырвоную пухліну на шыі, якая прыкметна і на вачах расла. Мех з восамі ён трымаў у руцэ. Як толькі Пётра знік за дзвярыма, ён падскочыў да скрыні з памідорамі і таропка іх разгроб свабоднай рукой, дастаў паперку і прачытаў, разгледзеў партбілет.

— Ну, Пяцюня, ну, змей! — здзівіўся ён шчыра. — От даёт пацан, га... Ну, цяпер трымайся, цямніла.

Ён па-змоўніцку ўсміхнуўся і акуратна паклаў паперку і білет на дно скрыні, потым асцярожна ўладкаваў да іх мех з восамі і таксама асцярожна пераціснуў верх і залажыў яго памідорамі.

— І ад мяне падарунак, — радасна сказаў ён, адышоў убок і сеў зноў на старое месца.

Грузчыкі назіралі, як “Волга” рушыла па дарозе ў горад.

***

ПРЫСУД

выязной калегіі раённага народнага суда

Гр-ну П. Серадзе, абвінавачанаму па арт. 201 ч. І Крымінальнага кодэкса /хуліганства/, прысуджаецца да 2 гадоў папраўчых работ на будоўлях народнай гаспадаркі з вылікам 20 працэнтаў заработку ў карысць дзяржавы.

*1989 г.*

# ЖАЛЕЗНЫ ГОСЦЬ

Адвячоркам, калі ўжо парадкам сцямнела, неба раптоўна амаль да зямлі перакрэсліла доўгая светлаватая палоска, і на даляглядзе за Паселішчам была бачная ўспышка, пасля чаго прагучаў невыразны пляскач.

Потым — моцны выбух.

Балід.

Андрэй Юк убачыў успышку над лесам і адразу ўсхвалявана забег у дом, дзе яго маці і малодшая сястра рыхтавалі вячэру. Сястра Марта была хворая на ногі і ледзь рухалася па пакоі. Ёй была патрэбна аперацыя, якая каштавала вялікіх грошай, але ў сям'і іх не было. Андрэеў бацька нечакана памёр ад лейкеміі некалькі гадоў таму.

— Што здарылася? — спытала маці ў хлопчыка і дадала: — Сядай, табе варта паесці.

— Метэарыт. Вялікі. Вельмі. Ён упаў за лесам, на поўначы. Калі я знайду там які яго асколак, што-небудзь, то ў нас будуць грошы. Марце зробяць аперацыю, і яна здолее добра хадзіць, нават танчыць, выйдзе замуж...

Хлопчык быў вялікі і рослы для сваіх пятнаццаці, а ў шэрых вачах яго свяціўся розум. Кемлівы не па гадах, ён і цяпер ужо ліхаманкава абдумваў план будучых дзеянняў.

Але маці пратэстуючы ўзняла руку.

— Не, — запярэчыла яна. — Я не хачу, каб ты збіраў метэарыты. Яны прыносяць бяду. Твой бацька загінуў менавіта праз іх, бо, кажуць, што некаторыя — радыеактыўныя. Я нікуды цябе не пушчу.

Андрэй Юк не стаў спрачацца і моўчкі сеў есці. Але ў галаве яго ішла напружаная работа, думкі імкліва змянялі адна адну. Ён збольшага ведаў, што за апошнія дзесяць гадоў у свеце сфармаваўся метэарытны рынак, на якім адзін грам пазазямнога рэчыва каштуе ад дваццаці цэнтаў да ста шасцідзесяці тысяч долараў. У залежнасці ад велічыні асколка, яго ўнікальнасці і складу яго рэчыва. Яго бацька збіраў метэарыты, бо сям'я жыла ў перспектыўным для іх падзення месцы і яшчэ з іншай прычыны: навокал амаль не існавала ніякай прыстойнай работы. Ён ведаў і тое, што за апошнія гады каштоўнасць метэарытнага рэчыва ўзрасла ўтрая. Самы звычайны матэрыял прадаецца па долары за грам, а ў сталіцы можна свабодна прадаць метэарыт вагой у сто грамаў за тысячу, тры тысячы і болей. Апошнім часам дзяржава пачала і тут накладваць сваю лапу, аб'яўляючы месцы падзення пазазямнога рэчыва часовымі помнікамі прыроды і затрымліваючы метэарыташукальнікаў, але ж паспрабуй вызначы месца будучага падзення, арганізуй ахову... Не так гэта і лёгка.

Андрэйка Юк павячэраў, потым незаўважна для маці схадзіў у кладоўку, знайшоў там бацькоўскую сапёрную рыдлёўку, нож, торбу, усё неабходнае, акрамя металашукальніка (яго яны даўно прадалі), і ўсё гэта падрыхтаваў, схаваўшы ў двары пад кустом бэзу. Будзільнік на сваім надалонніку ён перагнаў на чатыры гадзіны раніцы.

***

Сонца толькі выявілася на ўсходзе, а ён ужо быў у лесе. Напрамак падлетак вызначыў раней і ўвесь час стараўся прытрымлівацца яго.

Лес яшчэ захоўваў начную вільгаць, і красоўкі адразу сталі мокрыя. Сям-там цвэнькалі дробныя птушкі, слабы вецер ледзь чутна шамацеў у вершалінах бяроз. Гэты самы вецер і данёс урэшце да яго амаль няўлоўны пах гарэлага. Але ж ён не курыў, і таму нюх у яго быў надзвычай абвостраны. Дым. Непадалёку нешта гарэла: альбо цяпер, альбо ад таго, што запалілася раней. Хутчэй за ўсё, раней, ноччу, калі распалены ў атмасферы балід выбухнуў і выпарыўся ці рассыпаўся на кавалкі. Толькі вось ці рассыпаўся? Падзенне метэарыта і звязаныя з гэтым наступствы, як ён ведаў, бываюць іншым разам цалкам непрадказальныя.

Ён рушыў на пах і зірнуў на табло надалонніка: ішла ўжо восьмая гадзіна. Што ж, ён прайшоў нямала. Раптам хлопец пачуў у паветры слабы гук гелікаптэра, спыніўся і зірнуў на неба ў прасветах між дрэвамі. Гук мацнеў, і ўрэшце шрубалёт праляцеў амаль над яго галавой, на вельмі нізкай вышыні. “Што б гэта значыла?” — падумаў Андрэй Юк і неўзабаве рушыў далей. У іх там, у вайскоўцаў, свае справы, а ў яго — свае. Яму трэба абавязкова знайсці хоць які асколак гэтага метэарыта, няхай самы маленькі, грамаў на сто — дзвесце, — і ўсё ў іх сям’і зменіцца да лепшага: Марце зробяць аперацыю, яна пачне хадзіць, дапамагаць маці, не будзе плакаць па начах, а рэшткі грошай ён забярэ сабе, ён...

Раптам Андрэй Юк успомніў пра яшчэ адну праблему. Нават калі яму пашанцуе ў гэтым лесе,

знаходку трэба, як ён даведаўся калісьці ад бацькі, праверыць спецыяльным аналізам, класіфікаваць яе ў экспертаў (гэта каштуе каля ста долараў), зарэгістраваць ў міжнародным каталогу і набыць афіцыйную ліцэнзію. Там таксама існуюць свае драпежнікі. Бацька расказваў яму, што эксперты патрабуюць за аналіз звычайна пятую частку ад знаходкі. Такое жыццё: за ўсё трэба плаціць.

***

Раптам ён выйшаў на прагаліну, створаную некалькімі зламанымі дрэвамі. Сэрца забілася. Зломы былі зусім свежыя. Сям-там ледзь дыміўся мох. Пахла гарэлым.

І тут жа ўбачыў метэарыт. Касмічны прышэлец, які, пэўна, ляцеў па датычнай і праараў глыбокую канаву, большай сваёй часткай увайшоў у разбураную ім зямлю. Ён быў вялізны. Так. Андрэй Юк не верыў сваім вачам. Унутры ў хлопчыка ўсё дрыжэла. Ён імкліва наблізіўся і апынуўся ўсутыч. Ферум! Жалеза! Касмічны госць быў жалезны! І ён важыў… Ён важыў кілаграмаў сто, не менш. Андрэй Юк ліхаманкава ўкленчыў і асцярожна дакрануўся да прышэльца. Цяпло мякка ўдарыла яму ў далонь і заструменілася па руцэ.

Хлопчыка кінула ў гарачыню. Гэта ж цэлае багацце! Мільён долараў, не інакш, нават за вылікам усіх выдаткаў! Цяпер яны з маці і сястрой не будуць ведаць, што такое галеча, пераедуць у горад, нават у сталіцу, купяць там кватэру. Ён будзе вучыцца, а сястры дактары зробяць усё патрэбнае ў найлепшай клініцы.

Але раптам яго, наадварот, кінула ў роспач, нават стала вусцішна. Гэты метэарыт быў занадта вялікі, каб знесці яго дадому. Аплаўлены па баках — і рыдлёўкай не адламаць, не адсекчы які кавалак. Хоць гэта, магчыма, і не так важна. Ён знойдзе адпаведныя інструменты і вернецца. Вось каб сюды можна было дабрацца на машыне! Але, на жаль, такое немагчыма. Не, немагчыма.

Ён ізноў пачуў шум рухавікоў гелікаптэра, зірнуў угару і ўбачыў, як той набліжаецца і, мільгаючы за вершалінамі дрэў, плаўна выконвае кругі, якія становяцца ўсё вузей і вузей. "Не можа быць, — падумаў хлопчык, — няўжо яны адсачылі месца падзення метэарыта? Няўжо яны так хутка пра гэта даведаліся? Ці хто ім паведаміў? Не, такое сапраўды немагчыма. Але, чаму — не?.."

Шрубалёт знік. Хлопчык ускочыў і схапіў рыдлёўку. Метэарыт трэба закапаць. Не, не закапаць, бо ён не здолее выкапаць пад ім глыбокую яму, а проста закідаць зямлёй, зверху замаскіраваць галінкамі, мохам. Гэта яго знаходка і належыць толькі яму. Падлетак увагнаў пад нагу рыдлёўку і пачаў кідаць зямлю на жалезны бок касмічнага прышэльца.

Раптам ён спыніўся і прыслухаўся. Дзесьці ў тым баку, адкуль хлопец прыйшоў, пачуліся далёкія галасы людзей, шум і сігналы машын. "Няўжо, — падумаў Андрэй Юк, — яны з паветра высачылі месца, блакіравалі ўвесь раён і цяпер расстаўляюць ачапленне?" Не, не можа быць, гэта проста несправядліва, каб усе яго намаганні праз некага ці нешта адразу пайшлі прахам. Ва ўсялякім разе, калі гэта сапраўды так, ён нічога не паспее зрабіць. Дый ці здольны ён увогуле закапаць гэтую вялізную

канаву, якая па-здрадніцку выдае месца падзення, урэшце, сам метэарыт? Вядома — не, бо тут працы на цэлы дзень, і не адзін.

“Што ж, — падумаў ён, — застаецца чакаць. Калі яны вышукваюць менавіта касмічнага прышэльца, то неўзабаве апынуцца тут.” А калі гэта беспадстаўная трывога, то яму неймаверна пашанцуе і ён будзе далей дзейнічаць па сваім плане. Так.

Андрэй Юк сеў на зямлю і прытуліўся спінай да цёплай паверхні жалезнага госця з космасу. Космас — вось што заўсёды цікавіла хлопчыка на ўроках у школе, у кніжках. Калі ён здолее вучыцца далей, то выбера менавіта гэты кірунак.

У спіну яму дыхала цеплынёй. Няпраўда, што метэарыты радыеактыўныя, бацька таксама не раз сцвярджаў яму гэта. Ведаць бы, колькі мільёнаў кіламетраў — не, колькі мільярдаў мільёнаў праляцеў ягоны хросны з таямнічай бездані? Чаму апынуўся тут, сутыкнуўшыся з Зямлёй? Як ён чуў, штогод дзясяткі тон метэарытаў падаюць на нас, прабіваючы атмасферу. Розныя па велічыні і магутнасці. Калі-небудзь самы вялікі з іх абвесціць для ўсіх нас Судны Дзень...

***

Ён не ведаў, колькі так праседзеў — можа, паўгадзіны, а можа, і больш. Галасы чуліся ўсё бліжэй, потым пад нагамі людзей затрашчаў сушняк, і ўрэшце на прагаліну выйшлі некалькі жаўнераў з металашукальнікамі і афіцэр — усе ў камуфляжнай форме, але без зброі. Толькі ў афіцэра на баку тапырылася кабура з пісталетам.

Афіцэр здзіўлена агледзеў метэарыт, канаву, зламаныя дрэвы і ўтаропіўся ў хлопчыка, заўважыў яго торбу, рыдлёўку. Ён усё зразумеў.

— Ну, што, чорны капальнік? — з іроніяй спытаў афіцэр. — Не выгарала справа? Спачуваю, але дапамагчы нічым не магу. Гэтая штука цяпер належыць дзяржаве, — ён кіўнуў на жалезнае рэчыва за спінай хлопчыка..

Андрэй Юк ужо амаль абыякава глядзеў на яго. Усім яго марам — канец. Кватэра, вучоба ў каледжы, аперацыя для сястры. Усё гэта ўжо нерэальнае. Ён не адчуваў ні крыўды, ні нянавісці. Толькі на вачах падлетка бліснулі слёзы, і ён моўчкі адвярнуўся. Урэшце, для яго яшчэ ўсё наперадзе, суцяшаў ён сябе. Ён не здасца. Вядома ж, не.

*2006 г.*

# МОЙ ДУРНАВАТЫ СТАРЭЙШЫ БРАТ

“І вось я тут сяджу паўгадзіны ўжо. Тут — гэта ў райаддзеле міліцыі. У памяшканні пуста, лаўка, стол, часам нехта заходзіць, потым выходзіць, і ўсё — моўчкі. Псіхалагічна ціснуць ці як? А можа, ім няма калі? Хоць сказалі чакаць следчага. Хіба ўстаць і пайсці? Цікава: спыняць ці не? Пэўна, спыняць — павінен жа нехта сачыць, а што калі я які псіх: здыму дзягу ды засілюся, ха-ха... Але ж, не да смеху.

Не патрэбны быў мне яе мабільнік! У тым жа і справа, што не. Дый у мяне і свой ёсць, навошта мне два? Але хіба мне павераць? Тут нікому не вераць... Тым больш, тая сцерва накатала на мяне заяву. Быццам я напаў на яе з мэтай абрабаваць, ударыў і выбіў мабільны тэлефон. Ну і сцерва... Але што я скажу следчаму, калі я сапраўды выбіў у яе тую мабілу? Няхай спытае — навошта я гэта зрабіў. А ён спытае?

Але па парадку. Я яму так і скажу: выслухайце па парадку, пастарайцеся зразумець. Хіба я — вінаваты?

Дык вось, вінаваты мой старэйшы брат. Вядома, ускосна. А ўсё — тая сцерва, вось дзе асноўная прычына. А брат — ідыёт. Не, ён не ідыёт, але ж, пэўна, сапраўды дурнаваты, што запаў на тую сучку. Так, я адказваю за свае словы. Усё пачалося

год таму. Брат старэйшы за мяне на тры гады і заканчвае школу. Толькі вось як ён яе скончыць і куды паступіць, калі зусім кінуў вучыцца? З-за яе. Усё з-за яе. Яна — гэта Ксенія, яго аднакласніца, якая год таму прыехала аднекуль разам з бацькамі, вядома. Што за імя, дарэчы? Ніякай арыгінальнасці. Калі дачка — то Ксюша, а калі сын — то Кірыл. Бачыў я яе бацьку. Падвозіў дачку ў школу на шыкоўнай іншамарцы. Нешта акабанелае за рулём. І з твару — сапраўдная свіння, ха-ха... прадпрымальнік, бач ты... Дом купілі, краму адчынілі... Не зайздрошчу, не... проста ведаю такіх — думаюць, што будуць жыць... заўсёды, вось і хапаюць дзе спрыяе... Ну а сама Ксенія — яшчэ тая птушка. Праўда, з твару прыгожая, нічога не скажаш, і ўсё астатняе, як мае быць, у балетную школу яе быццам аддавалі... Але з натуры... Урэшце, мяркуйце самі.

Брат мой старэйшы на яе і запаў. Кішэнным для яе зрабіўся, няйнакш. Усе яе сцервовыя заданні і даручэнні, усе выдвары пачаў выконваць. Першае каханне, бач ты... Пра гэта я ў нейкай кніжцы па псіхапаталогіі сярод падлеткаў вычытаў. Быццам яно вельмі моцнае, і кранаць яго нельга, і можа скончыцца неяк не так, небяспечна...

Ну вось брат мой, які быў найлепшым вучнем у класе, на залаты медаль цягнуў, кніжак не адзін мех перачытаў, а стаў быццам ад таго кахання дурнаваты. Кніжачкі ўсё, кніжачкі... Вось я, напрыклад. Я жыву проста: вучоба, спартзала, адпачынак. Між іншым, чэмпіён горада па дзюдо ў сваім узросце. Мяне голымі рукамі так, мімаходзь, не возьмеш і прыгожанькім тварыкам не купіш... Так. Але пры чым тут гэта? Следчаму я

што скажу? Яму трэба дакладна, з доказамі. А дзе тыя доказы? Сведка ў мяне адзін — брат, але ён супраць яе не пойдзе, не...

Але ж зноў папарадку.

З вокнаў нашай школы труба гарадской кацельні добра бачная. Не адзін дзясятак метраў у вышыню. На самым версе — чырвона-белая разметка, а ноччу ліхтар гарыць — гэта, пэўна, каб які самалёт не ўрэзаўся. Якраз апоўдні, пасля заняткаў, я ўбачыў свайго брата і Ксенію. Ён яе часта праводзіў, ранец нёс, марозіва купляў... На гэты раз яны ішлі ў іншы бок, якраз у напрамку той трубы. Я чамусьці зацікавіўся і неўпрыкмет следам пакрочыў. І, як аказалася, не дарэмна.

Яны ўрэшце спыніліся, спыніўся і я за клёнам. Што, мяркую, удумала тая Ксюша? І бачу: брат мой кінуў на зямлю сваю сумку і... да трубы. Праз плот бетонны пералез. Няўжо, думаю, на яе палезе? Ён жа і на балкон амаль не выходзіць — боязь вышыні. Але ж самае горшае і спраўдзілася. Бачу — палез. Поручні жалезныя на самы верх вядуць. Хацеў я выбегчы са сваёй схованкі, крыкнуць яму, каб не лез далей, уніз спускаўся, але падумаў — дарэмна ўсё. Пасунуўся я бліжэй да той сцервы і бачу: яна мабільнік свой выцягнула і пальцам пстрыкае. А брат, між тым, да першай пляцоўкі далез — стаў там і ўніз глядзіць, потым таксама мабільнік у яго руцэ з'явіўся. Памаліўся я за брата ў думках, а сам вушы наструніў — слухаю.

— Дык ты мяне сапраўды кахаеш? — гэта Ксюша яго пытае.

Паўза.

— А як моцна? — зноў яна.

Паўза.

— Тады вышэй узнімайся. Ці — слабо?

Ну і сцерва, думаю, а сам у вышыню гляджу. Брат сваю мабілу схаваў і далей палез. Час так марудна пацягнуўся. Урэшце, бачу, ён апошняй пляцоўкі дасягнуў і апынуўся высока-высока, у самых аблоках. Не пазайздросціў я яму, і хоць вышыні не баюся, а там бы, пэўна, сам ледзь не спруцянеў. Ну, думаю, пара спускацца. Аж — не. Ён у кішэню руку сунуў. Выцягнуў нешта (крэйду, як я здагадаўся) і пачаў на трубе выводзіць. Слова якое — вы і самі здагадаліся б: "КСЮША".

Доўга ён там крэмзаў, пакуль усё не напісаў. Я ўвесь у напрузе: што далей адбудзецца, як ён на зямлю спусціцца? Аж зноў — не.

Гэта Ксенія зноў свой мабільнік ля вуха прыстасавала. Я яшчэ бліжэй прасунуўся, і раптам чую такое, што мне не на жарт вусцішна стала.

— А даказаць, як моцна мяне кахаеш, ты здолееш?

Паўза.

Брат у сваю чаргу па мабіле нешта ёй адказвае. Вядома, што.

— І ўніз скочыш, калі загадаю?

Паўза.

Я знерухомеў. У горле ў мяне перасохла, я хацеў крыкнуць, але голас прапаў.

— Праўда, скочыш?

Я зірнуў уверх і ўбачыў на самым краі пляцоўкі маленькую і адзінокую постаць свайго старэйшага брата. Адной рукой ён трымаўся за поручні, а другой сціскаў ля твару мабільнік. Чартоўка! Гэтая сцерва Ксюша аж трымцела ад адчування сваёй улады над ім. Тварык яе пайшоў чырвонымі плямамі, чорныя вочы гарэлі.

Паўза.

Яна слухала адказ.

— Тады... тады...

І тут я не вытрымаў. А хто б на маім месцы стрымаўся, скажаце мне, га? Я рынуў наперад і з ходу заехаў ёй у вуха, выбіўшы з рукі мабільнік. Так, я не хацеў яе збіваць і, тым больш, пляваць мне на яе мабілу, але што іншае я мог зрабіць у тое выключна жахлівае імгненне? Усё ж вісела на валаску. Скажы яна брату — скачы, — і ён бы скочыў, я яго характар ведаю.

Вось так усё і здарылася. Цяпер на мяне ў камісіі па справах непаўнагадовых справу завялі — пэўна, не без яе акабанелага бацькі адбылося, і вось, дастаўлены пад прымусам, сяджу тут, чакаю следчага. Час бяжыць... Але я спакойны, бо маю рацыю. Хіба не так?

...Ага, вось і следчы. Так, кліча мяне ў кабінет. Следчы — жанчына. Гэта нечакана і непажадана. На пагонах — тры зорачкі. Мае справы, як я разумею, цяпер зусім дрэнь. Хіба яна мне паверыць? Яны ж, пэўна, усе заадно. Усё-такі, паверыць ці не?..

# ЛАЎЦЫ ВЕРХАВОДАК

Плывучы самаходны рэстаран з гучнай назвай "Здань" — перароблены з невялікай баржы і ўкамплектаваны маторам штучны рачны карабель — рыхтавалі да заплыву. Экіпаж у складзе двух чалавек: уладальніка ("капітана") і кухара ("матроса") — прымаў партыю чарговых кліентаў. Гэта былі: тройка так званых "сорнераў" — хутчэй за ўсё дробных гандляроў з гарадскога базару — з тых, хто прыехаў сюды здалёк і пасяліўся адносна нядаўна, не паспеў запрасіць сваіх жонак альбо ўвогуле не меў іх; пара мясцовых маладых хлопцаў з пустымі тварамі, што навыперадкі завіхаліся побач, нібы хворыя на прыступ удыгання; і некалькіх дзяўчат з лялечнымі, вясёлымі тварыкамі пэтэвушніц і ў міні-спадніцах. Усе былі на лёгкім падпітку, а адна з дзяўчат бесперапынна павісквала і гучна рагатала тонкім галасам, што разносіўся далёка над вадой:

— Ха-ха-ха-ха-хі-хі-хі-хі!

Урэшце "капітан" (калі яго можна так называць) малога і няўклюднага судна падцягнуў сходні, адвязаў канат, і рачная плынь паціху падхапіла плывучы карабель-рэстаран і марудна панесла ўздоўж берага, далей ад прыбярэжнай вуліцы, засмечанай абы-як раскіданымі лодачнымі і аўтамабільнымі гаражамі ды цаглянымі будынкамі прыватных аднапавярховых дамоў.

“Капітан” быў сярэдняга веку, мажны апуцак, у шортах і бейсболцы, рызыкоўна распісаны “тату”, з чырвоным пульхным тварам, а яго “матрос” — ён жа кухар, які пачаў распальваць за бляшанай перагародкай мангал і рыхтаваць шашлыкі, — яшчэ даволі малады, нягеглы, блатнаватага выгляду хлопец, мітуслівы, з істэрычным, у дробных скуллях хітраватым тварам.

Пара “мясцовых”, найбольш падпітыя, па-ранейшаму ўвесь час імкнуліся дагадзіць то кухару, то капітану, то гандлярам. Дзяўчат яны нібыта не заўважалі.

“Капітан”, між тым, запусціў рухавік. Матор паслухмяна завуркатаў, ад кармы пайшлі пеністыя хвалі, і нязграбны карабель рушыў уздоўж рачнога берага да таго месца, дзе рака пратокай злучалася з вадаёмам.

Там, на воднай прасторы, з шашлыкамі і віном, звычайна і адпачывалі.

***

Вадаём быў вялікі, некалькі квадратных кіламетраў, эліпсападобны і з вышыні птушынага палёту, пэўна, нагадваў літару “Ф”, дзе прамой рысай была невялікая рака, якая перасякала яго, каб адразу ўліцца ў іншую, нашмат большую раку. Утвораны штучна, амаль як два дзесяцігоддзі таму, на месцы былой поймы побач з горадам, ён, па сутнасці, і панішчыў малую раку. Тая адразу змізарнела, зарасла па берагах непраходным вербалозам і пустазеллем. Тое, што пойму любой ракі нельга кранаць, гарадскія ўлады, пэўна, проста не ведалі, а можа, на той час у іх з’явіліся лішнія

бюджэтныя сродкі ці яшчэ што — ва ўсялякім разе раней імі была абнародаваная мэта: зрабіць побач з горадам зону адпачынку. У тую зону павінны былі ўвайсці пашыраны вадаём і побач з ім парк з рознымі забаўленнямі. Аднекуль з Расіі запрасілі праектантаў і брыгаду рабочых, завезлі земснарад і некалькі жалезных баржаў, каб пашыраць і паглыбляць пойму. Пясок намывалі на паплавы, бульдозеры ўслед значна пашыралі берагі, і неўзабаве на месцы поймы і ўтварылася глыбокая — да пятнаццаці метраў — вялізная сажалка, але тут надышла так званая перабудова, брыгада разбеглася, перадусім затапіла баржы, а земснарад увогуле кудысьці звезлі ці здалі на металалом.

Вадаём застаўся. Паступова паплавы вакол яго зараслі вербняком, бярозкамі, абляпіхай, верасам і дзядоўнікам. Трава — такая густая, што захрасалі ногі — паднялася да пояса. Ад шашы да вады вялі дзве калюжыстыя дарогі, па якіх разпораз пад'язджалі на легкавіках аматары рыбнай лоўлі альбо к ночы хлопцы прывозілі дзевак. Прыязджалі і на матацыклах, скутарах ці роварах, сядзелі па берагах з вудамі-закідухамі, хадзілі са спінінгамі. Нягледзячы на пару-тройку адчувальных забруджванняў (прарывала гарадскую каналізацыю, сцякалі прамысловыя адыходы з заводаў), малая рака зноў і зноў прамывала вадаём сваёй, хоць і радзеючай, слабеючай, але няспыннай плынню, і рыба ў ім вадзілася.

Чалавек па прозвішчы Алег Мазур прыехаў на вадаём з прыгарада на ровары, каб пад канец рабочага адпачынку ў чарговы раз палавіць тут верхаводак. Гэта быў малады мужчына гадоў

трыццаці на выгляд, у камуфляжных нагавіцах, красоўках і клятчастай баваўнянай кашулі. Кароткая стрыжка амаль што прыхоўвала ранньюю сівізну на скронях, выцвілыя ад сонца вочы глыбока хаваліся пад надброўямі, а нос увогуле быў амаль ружовага колеру, бо скура з яго пасля раптоўнага загару, пэўна, паціху аблазіла.

Мужчына, якога звалі Алег Мазур, выцягнуў з-за спіны вузкі цёмна-сіні чахол, а з яго — дзве лёгкія пластыкавыя вуды. Адну з іх — запасную і даўжэйшую — ён пакінуў у аеры каля вады, а другую разматаў, паціскаў у далоні кавалак цеста, нажывіў крыху на гачок, закінуў жылку з плаўком на некалькі метраў ад берага і — азірнуўся навокал.

Сонца ўжо прайшло зеніт і незаўважна рухалася на захад. Ветру амаль не адчувалася, людзей паблізу ў такі час не было, толькі далёка, на супрацьлеглым беразе, сядзелі з вудамі некалькі нерухомых постацяў. Адзінокая пліска бегала пад стромай па пясчаным плёсе, трэсла даўгім хвосцікам, потым з'явілася парачка зацікаўленых палявых вераб'ёў з чорнымі плямкамі на шчоках, малады вужык, прыўзняўшы галаў, праплыў ля берага і схаваўся ў траве. Удалечыні праляцелі дзве падрослыя дзікія качкі. Лета адыходзіла.

Плавок раптам пацягнула ўбок, мужчына падсёк — і ладную верхаводку, якая супраціўлялася з усіх сіл, а сіл у гэтай невялікай рыбіны хапала, выкінула з вады. Бліснуўшы ў паветры, рыбіна сарвалася з гачка, але ўжо на беразе, і ўпала ў траву. Мужчына незадаволена хмыкнуў і пайшоў за ёй, але раптам спыніўся і заўсміхаўся, нібы пабачыў нешта вельмі для сябе прыемнае.

Гэтым “нешта” быў дзікі кот, а калі больш дакладна, то здзічэлы, бо на выгляд нагадваў звычайнага, можа з дамескам ад “нарвежскага ляснога” (такая парода альбо яе помесь распаўсюджана дзе-нідзе і ў нас): шэры, з трохкутнай галавой і раскосымі зялёнымі вачыма і пухнатым хвастом, што нагадваў апахала. Кот касавурыўся ў бок рыбіны, якая звівалася ў траве, аж трымцеў, але чакаў рэакцыі чалавека.

— Ну, прывет! — сказаў яму мужчына і дадаў ласкава: — Забірай, ласуйся, чаго там. Не шкада.

Кот зразумеў, маланкава схапіў рыбіну, далікатна адцягнуў на які метр і, насцярожана пазіраючы ў бок чалавека, пачаў есці з галавы.

— Еш, — пракаментаваў уголас мужчына, — што тут зробіш: жывое, каб выжыць, мусіць харчавацца такім самым, а ты, пэўна, прагаладаўся.

Гэты мускулісты, ладны, пэўна, даўно здзічэлы мясцовы жыхар вадаёма быў яму ўжо добра знаёмы. З месяц таму, калі мужчына ўпершыню прыехаў сюды, каб не толькі пазбавіцца на кароткі час ад гарадскога тлуму, а і ад іншых, як ён лічыў, вельмі асабістых “праблем”, што нечакана апанавалі яго, ён здзіўлена пабачыў, што палюе на верхаводак не адзін.

Увогуле, лавіць верхаводку на плавочную вуду пачынаюць у траўні, а заканчваюць восенню, да лістападаўскіх халадоў. Вудзіць яе — сапраўдная школа для рыбакоў, хоць большасць з іх грэбліва ігнаруе гэтую спрытную, актыўную рыбіну. Хіба што самыя вопытныя ведаюць: маленькая рыба нашмат смачнейшая за вялікую. Падсякаць своечасова верхаводку — не ў кожнага і атрымаецца. Але ж каб рыбіну лавіў кот?..

Тым не менш, мужчына колькі дзён раней пабачыў гэта незвычайнае відовішча. Кот вужакай распластваўся ля самай водмелі, куды верхаводкі зграяй заплывалі на пах падкормкі — рэшткі яе часам выкідвалі ў ваду проста сабе пад ногі рыбакі, — і цярпліва чакаў, а потым маланкава кідаўся і капцюрыстымі лапамі хапаў неасцярожную рыбіну. Вада, пэўна, зусім не пужала разумную і спрытную жывёлу.

Кот абачліва пазбягаў людзей, а спачатку і мужчыну таксама: верагодна, яго не раз гналі, магчыма, і білі. Але калі мужчына шчодра пачаставаў таго кавалкам хлеба, а недахоп вугляводаў, вядома, быў у жывёлы адчувальны, а потым, праз які дзень, прынёс таму "Віскасу" (сухога кацінага корму), жывёла прызнала яго за свайго, бадай што за сябра. Тым не менш, каб дакрануцца да яго рукой, а потым і прылашчыць — на гэта спатрэбіўся час. Урэшце, мужчына не спяшаўся. Быў задаволены, што кот паволі прызнаў яго і пачаў вызначаць знешне і па голасе.

— Давай, ласуйся, сябра, — пяшчотна прапанаваў мужчына, зноў нажывіў гачок і закінуў у ваду.

Верхаводкі, між тым, актыўна атакавалі нажыўку, час ішоў, сонца ўсё больш адхілялася на захад. На берагах вадаёма палюднела: аматары рыбнай лоўлі пакрысе сцякаліся на вячэрні клёў.

Мужчына скарміў кату яшчэ некалькі рыбін, дзясяткі з два іх кінуў сабе ў сумку і прылёг на траву. Мятлік, віхляючыся, пакружыў над ім і адляцеў да ярка расфарбаваных зараснікаў дзядоўніку, высока ў небе лунаў птушыны драпежнік — выглядаў нешта сваё, ледзь чутна звінела жамяра.

Кот прылёг ля ног мужчыны, шнурам расцягнуўся ў даўжыню, удзячліва завуркатаў, заплючшчыў вочы, але раз-пораз насцярожана ўздымаў павекі і азіраўся па баках, потым зноў супакойваўся — драмаў.

***

— Ну, вось, — напаўголаса звярнуўся да жывёліны мужчына, — цяпер ты не галодны, сонца грэе табе бакі, але ў гэтым свеце ўсё адносна, мой меншы брат. Прыйдзе неўзабаве восень, потым зіма, і ўлюбёныя табой верхаводкі сплывуць на глыбіню, а потым увогуле схаваюцца пад лёд, пачнуцца маразы, і — што тады? У якую нару ты схаваеш свой шыкоўны хвост? Вось жа і яно. Невядома, адкуль ты тут з'явіўся, і невядома, куды ты сыдзеш у цяжкі час. Можа, у які падвал пад шматпавярховікамі, што груваcцяцца там — за бальшаком? У курыны хлеўчык якога жлаба-прыватніка? У каналізацыйны люк? А чым будзеш харчавацца? Душыць пацукоў? Але ж грызці іх пасля смачных, сакавітых верхаводак — хіба табе будзе, як кажуць, не "ў падлу"? Маўчыш? А ў мяне для цябе ёсць цікавая прапанова. Хочаш — прымеш яе, хочаш — не. Мой рабочы адпачынак заканчваецца. Хутка — на працу. Прыеду я сюды праз некалькі дзён, пазней альбо нават наступным разам з якой сумкай большай, пасаджу цябе туды і адвязу дамой, у цёплую хату, бо ночы ўжо становяцца халоднымі і спіш ты тут недзе, хутчэй за ўсё, у якой земляной нары. Што скажаш, меншы брат?

Кот выслухаў, нечакана ўзняўся на ногі, пасунуўся да твару мужчыны і ўдзячна баднуў таго галавой.

— Ну, ты, разумнік, — расчулена сказаў мужчына і працягваў: — Калі так, то нам трэба пазнаёміцца, так бы мовіць. Афіцыйна. Мяне завуць Алег, а прозвішча — Мазур. Ну, а цябе — як? Урэшце, прыдумаем табе што-небудзь вартае такога прыгажуна і шчырага братана, як ты. Пра сябе раскажу няшмат, але каб ты ведаў. Нарадзіўся я тут, на гэтай зямлі, і, як зрэдку кажуць, нікому не пажадаю сваёй радзімы — толькі сабе. Але — тое ўжо другаснае, ха-ха. Найперш табе, можа, цікава, чаму я тут апошнім часам ашываюся. І сапраўды — чаму? Паспрабую, мой меншы брат, адказаць коратка. Інакш, калі хто-небудзь пабачыць і тым больш прыслухаецца, як я тут з табой размаўляю, то справядліва падумае, ці не выклікаць мне сюды "брыгаду"? Справа ж, магчыма, у тым, што, на маю думку, "брыгаду" ўжо даўно варта выклікаць усяму свету. Калі-небудзь тое і адбудзецца, і не вельмі важна, хто гэта зробіць — Гасподзь Бог ці які іншы Начальнік Сусвету, альбо якая таямнічая Праграма. А пакуль перазагрузка не ў мяне аднаго. Суньцеся, шаноўныя, у так званае Сеціва і пабачце на свае вочы гэты кішачы, нібы лічынкамі мух, гноеадстойнік. І кожная з іх лічыць сябе вартай сусветнай увагі, не менш. Што ж імі рушыць — усімі тымі юзерамі, блогерамі, хакерамі, браўзерамі, аськамі, чатамі? Людзьмі, якія штодня торкаюць пальцамі ў "клаву" і ядуць вачыма дысплеі? Я зразумеў і — нават не паверыў адразу: Страх. Так, мой меншы брат. Яны ўсе трымцяць ад страху, што праз нейкі час прыйдзе старасць і яны згінуць бясследна ў Сусвеце, у Космасе. Ім трэба неяк сцвердзіць сябе ў Вечнасці. Вось я ем адной рукой смачную

падсмажаную рыбіну ў якой-небудзь кавярні, п'ю каву, а другой тыцкаю ў ноўтбук і тут жа занатоўваю ў блогу: “я ем рыбіну, зірніце, як я гэта раблю” — і здымаю ўсё, і, не марудзячы, выкладаю ў Сеціва. Ха-ха. Вось я які — вялікі і значны...

А істэрычная прага да ўсялякіх успамінаў, мемуараў, дзённікаў, зацемак... Хто толькі іх не піша, не заганяе ў Сеціва: генералісімусы, маршалы, генералы, прастытуткі, асенізатары, поп-зоркі, ахмістрыні з гатэляў, шпіёны, бандосы, хатнія гаспадыні, сантэхнікі, маньякі, забойцы, спартсмены, дзялкі і чорт ведае хто яшчэ. А ўсялякія спевакі, блазны, прытворшчыкі, вычварэнцы і дураплясы... Ад святла да святла іх жыццярадасныя да ідыятызму тварыкі мільгаюць на экранах. Яны ўсё спяваюць і танчаць, танчаць і спяваюць, і канца гэтаму не бачна...

Кот завурчэў. Зноў баднуў мужчыну ў твар, і ўсцешаны і задаволены, задрамаў.

Запанавала працяглая паўза. Мужчына думаў нешта сваё.

— Вось, — урэшце сказаў ён і, як і раней, уголас, — хутка і сонца зойдзе, а па захадзе сонца чалавеку заўсёды самотна. Асабліва, калі ён адзін. Не вельмі мне ахвота табе пра гэта гаварыць, варушыць набалелае, але ж — больш асабліва і няма каму. Як таму чэхаўскаму дзядзьку, што спавядаўся каню. Ты, мой меншы брат, вядома, не конь, але ж разумееш мяне не горш. Дык вось — чаму я тут ашываюся і палюю разам з табой на нейкіх няшчасных верхаводак? А таму, што я меў дурасць адпусціць раней жонку з нейкай тургрупай, але, па сутнасці, адну па грашовай пуцёўцы. У Эміраты. Сяброўкі з'ездзілі, і ёй

захацелася. Цяпер яна там. Але, як паведаміла днямі па "скайпе", — назаўсёды. Гэта па-навуковаму называецца селебрыфілія: жаданне сексу і ўсяго там іншага з багатай знакамітасцю альбо ўвогуле з якім чужынцам. А я толькі звычайны інжынер, а па сутнасці, праграміст. Здараецца, з раніцы да вечара — за камп'ютарам. Таксама дзяўбу "клаву". Няўдачнік. Ну, а яна ў мяне — варта прызнаць — дык прыгожая, пэўна, адна з тамтэйшых знакамітасцяў на яе і запала. А можа, і проста які жыгала ці сутэнёр. Д'ябла б іх там пабраў: што ім — сваіх баб не хапае? Паехаць самому туды ды заваліць яго? А грошы, а ствол? Не палезеш жа ў самалёт з дзедавым драбавікам пяцьдзясят шостага года мінулага стагоддзя, які цяпер валяецца на антрэсолях? А бабу — валіць таксама? Яна ж, па сутнасці, усяму віной.

Але тут я, братка, і сам, як кажуць, "зашкварыўся". Яшчэ раней так званую эмансіпаваную, "вызваленую" жанчыну ўзвялі ў "культ" і — атрымалі дурніцу розных узроўняў: ад "надзвычайнай" афіцыянткі, якую заморскі прынц павінен адразу браць у жонкі, да "бізнес-вумен", на яе, простую прадавалку, калісьці абавязкова западзе залётны алігарх і зробіць сваёй жонкай — галоўнай бізнесменкай, ахмістрыняй і яшчэ чорт ведае кім, яна, падагрэтая падобнымі фантастычнымі гісторыямі, сябе рэфлексуе. А тое, што такія дурніцы развальваюць цэлыя дзяржавы, тым дзяржавам напляваць? Выходзіць, што так...

І мая была — простая прадавачка. Вельмі прыгожая прадавачка. Маладзейшая, праўда, на дзесяць год, але для жыцця гэта нармальна. А з дзіцём не спяшалася — пэўна, выспявала ў яе слабой,

але хітрай галавёнцы ўжо тады неадольнае жаданне — узбіцца на так званае "прыгожае" жыццё...

Вось так усё і атрымліваецца. Банальная на першы погляд гісторыя. Але — чаму са мной?

Мужчына замаўчаў і задумаўся. Ён успомніў, як пабачыў першы раз сваю будучую жонку ў мясцовым універсаме, як пачаў часцей хадзіць туды, часам без патрэбы, як урэшце пазнаёміўся з маладой, даўганогай і самаўпэўненай дзяўчынай. Яе ўпэўненасць у сабе, як аказалася, мела падставы: на конкурсе прыгажунь годам раней яе прызналі "Міс-горад". Ён і не ведаў. І як гэта ён адразу павёўся на той лялечны твар, вялікія чорныя вочы, белазубую ўсмешку пажадлівых вуснаў і ўсё такое? Прыгожая жонка — не твая жонка, як кажуць у народзе. А была ж у яго і нявеста, дзяўчына, з якой сустракаўся дагэтуль, якая чакала, пакуль ён адслужыць у арміі, і... — вось атрымалася, што ён таксама здраднік. Так — здраднік нумар адзін. Тут, зусім недарэчы, мужчына раптам прыгадаў, як яшчэ некалькі гадоў таму, па сваёй маладой дурасці, сустрэўшы на вуліцы ці то кінутага, ці то збеглага сабаку — чыстапароднага ратвейлера, — прывёў таго дадому, а свайго дварнягу аддаў знаёмаму праз квартал. І як той, адданы яму дварняжка, у яго адсутнасць — быў на працы — вярнуўся, прыбег здалёк са шворкай на шыі, а ратвейлер загрыз яго проста на падворку.

Нельга сказаць, што той выпадак не закрануў яго, доўгі час яму было ад таго непамысна, і набыты сабака стаў нібы дакорам, пакуль аднойчы не збег ад яго следам за сучкай у ахвоце на гарадскія вуліцы, дзе і быў застрэлены міліцыянтамі.

***

Мужчына па прозвішчы Алег Мазур узняў голаў і ўгледзеўся ў далечыню. Гук матора прыцягнуў яго ўвагу. З вялікай ракі ў пратоцы з'явілася нязграбнае плывучае ўтварэнне, якое ён бачыў тут аднойчы колькі дзён раней. Карабель-рэстаран. "Як быццам нельга адпачыць дзе-небудзь у кавярні ці ў нармальнай рэстарацыі — з сучасным туалетам, ціхай скрыпачкай у кутку і падсвечанымі знізу столікамі? Тым больш, калі ў цябе завяліся грошы, — падумаў ён. — Але ж, як цяпер кажуць, прыгожа жыць нікому не забароніш".

Мужчына адчуў раздражненне. Ён жа хацеў палавіць рыбу і на захадзе сонца, адвячоркам. Менавіта тады, перад цемрай, у галаву яму лезуць усялякія змрочныя думкі. А як пачынае сутонець, дык з глыбіні можна падняць буйную плотку, падлешчыка ці нават якога не зусім адэкватнага язя ці галаўня. Адхіліцца з тымі пакутлівымі думкамі, што апанавалі яго. Вялікая рыба з берага, як ён ведаў, бралася тут рэдка, бо вадаём штучна закармілі самі рыбакі. Хоць, што яму тая рыба? У хаце ж пуста, і якую рыбіну няма каму нават пачысціць ад лускі. Жонка. Яна проста не мела права так зрабіць. Сука. Лярва. Гэта — падлянка. З іншага боку, можа, і добра, што ён ад яе, такой жонкі, пазбавіўся. Чалавека пазнаеш у бядзе. Як бы яна павяла сябе, каб з ім здарылася якая бяда? Вядома, як. Такія моцныя арэшкі не раскрышыць нічога, акрамя часу. Стукне ёй "палціна", і — гамон, і ліпасакцыя, і падцяжкі скуры не дапамогуць. Дый калі зведае яшчэ большай ад некага іншага подласці. А было ж у іх і каханне, і мары, і спадзяванні...

Мужчына аж скрыгатнуў зубамі і застагнаў. Кот адразу спружыніста ўскочыў на лапы і няўцямна зірнуў на яго.

— Спі, братан, спі, — супакоіў яго інжынер Алег Мазур. — Вы, нашыя меншыя браты, адзіныя, хто не здольныя на падлянку. Пачынаючы ад маленькай руплівай пчалы і скончыўшы вялізным кітом, які, пэўна, плыве дзесьці ў водах Гальфстрыма. Дарэчы, як сведчаць навукоўцы, калі знікнуць толькі пчолы, чалавецтва праіснуе чатыры гады, не больш... Калі-небудзь такое і здарыцца. І няхай сабе. Вось так...

***

Карабель-рэстаран "Здань" між тым наблізіўся амаль да сярэдзіны вадаёма. Рухавік на ім заглушылі, і адразу па вадзе разнесліся разняволеныя, узбуджаныя галасы, рогат і жаночы віск з непазбежнымі мацюкамі.

— Хі-хі-хі-ха-ха-ха-ха-ха!

На "Здані" пачалося баляванне. Ляснуў корак з бутэлькі шампанскага, над вадой паплыў пах смажанага мяса. "Сорнеры" паціралі далоні, пажадліва елі вачыма дзевак, роблена ўсміхаліся, перакідвался словам-другім па-свойму.

"Капітан" сядзеў у міні-рубцы за перагародкай, выпіў на дармаўшчыну шклянку віна і з'еў першы, спробны шашлык, які перадаў яму на шампуры кухар. Твар апошняга раз-пораз перакошвала нервовая сутарга.

— Музыку! — закрычала раптам адна з дзевак. — З Філіпчыкам! Абажаю Філю.

— Так, так! — падтрымалі яе іншыя.

Праз нейкі час (перакручвалі то адно, то другое) знайшлося і "з Філіпчыкам".

— "Ты не слышишь меня!" — паплыў над вадой саладкаваты голас расейскага поп-спевака.

— "Я не слышу тебя!" — адказваў яму жаночы, не менш саладкаваты.

Дзяўчына, што замаўляла музыку, ускочыла з пластыкавага, прыкручанага да драўлянай палубы крэсла і пачала танчыць, падпяваючы і карцінна ўздымаючы аголеныя рукі. Ёй няшчыра запляскалі ў далоні.

— Тост! — закрычаў нехта. — За дзяўчат!

Выпілі за дзяўчат, за "капітана". Той-сёй наведаў прыбіральню, цесную, аднамесную будку, якая знаходзілася на карме. Потым зноў пілі, чакалі шашлыкоў. У ваду паляцелі першыя пустыя пляшкі. Іх, а таксама непрыкметна ссунуты ўбок мабільнік аднаго з кліентаў з прыхаванай асалодай выкінуў за борт кухар. Урэшце "сорнеры", нібы змовіўшыся, запатрабавалі "капітана" плыць да берага. "Адпачыць крыху на зямлі, пачаставацца шашлыкамі, ну а потым, потым зноў назад", — казалі яны.

— Ну, ведаю, што вам трэба, — неўпрыкмет з'едліва пасміхнуўся кухару "капітан", але запусціў рухавік.

Сутонела. Ярка-чырвонага колеру сонечны дыск схіліўся над далягладам. Ад кармы "Здані" пабеглі хвалі, і судна з адпачыванцамі марудна рушыла да берага.

***

Мужчына па прозвішчы Алег Мазур, які ўжо даўно ўзняўся на ногі і закінуў большую вуду на

глыбіню, з трывожнай незадаволенасцю сачыў за тым, як шумлівая кампанія на невялікім прагулачным караблі плыве ў яго бок. Была спадзяванка, што гэтыя, як ён лічыў, занадта жыццелюбівыя дурыкі скіруюць куды-небудзь у іншым напрамку, але вясёлы плывун упарта набліжаўся, і ён вырашыў, што на сёння, пэўна, хопіць — прыедзе сюды заўтра альбо пазней — і варта змотваць вуды.

Але з вудай, якую ён закінуў на глыбіню, неспадзявана здарыўся раптоўны зачэп — пэўна, які корч апынуўся ля самага берага, хоць ён і мецiў кідаць недалёка, за траву. Шкада было новай жылкі і плаўка, і мужчына, яшчэ больш раздражняючыся з гэтай нагоды, пачаў торгаць вудаўём уверх і ў бакі, каб вызваліць гачок. Але той уеўся ў нябачнага тапельца намертва.

На "Здані" між тым заглушылі матор, узнялі яго ўгору, і судна паволі ўткнулася носам у плёс. Выкінулі сходнікі, і першымі на бераг з рогатам выскачылі дзяўчаты, за імі "сорнеры" і двое мясцовых — "капітан" застаўся на борце. Тое, што непажаданыя "турысты" быццам ва ўпор не заўважалі яго, яшчэ больш узвар'явала мужчыну.

Вядома, у душы ён разумеў, што гэтыя нахабнаватыя прыхадні, якія быццам знарок з'явіліся на яго вочы, аніяк не павінныя ў тым, што здарылася з ім у апошні час. Ён нічога не мае да людзей іншых нацыянальнасцяў, толькі няхай паводзяць сябе прыстойна. Дый і што такога незвычайнага ў тым, што яго цяпер ужо былая жонка нагледзелася нейкіх саладжавых кіношных гісторый ды тэлесповедзяў шматлікіх поп-зорак і захацела прыгожага жыцця. Не яна першая і не яна апошняя. Галоўны вінаваты зусім не яна

і не той зух з Эміратаў, што "запаў" на яе, а ён сам. Так. Дзе былі яго вочы, яго галава, калі ён, былы дэсантнік, біўся за яе з нейкімі прыблатнёнымі дзялкамі, а потым браўся шлюбам? А дойдзе ўсё да суседзяў? Да супрацоўнікаў з іх бюро? І дойдзе ж, дойдзе абавязкова. Цьфу! Вось і цяпер: нейкім дурнаватым і распусным малалеткам захацелася, як кажуць, "адтапырыцца", няхай бы і так, але — нахабная беспакаранасць... Ім тут што — прахадны двор?

— Вам у гэтым месцы — мёдам намазана? — урэшце ў кароткай паўзе паміж надакучлівым хіхіканнем дзяўчат і разняволеным гергетаннем чужынцаў гучна спытаў ён. — Дык я вас сюды не выклікаў!

Яго не толькі ва ўпор не бачылі. Яго не чулі. Затое быццам убачылі ката. Нехта з гіканнем шпульнуў у таго знятым з нагі пантофляй. Жывёла адбегла метры на два і спынілася, насцярожана ўзняўшы вострыя, з кутасікамі, вушы.

— Ды вы што, тупалобцы, зусім з разьбы з'ехалі? — закрычаў інжынер Алег Мазур, які ўжо губляў над сабой кантроль. — Вы што творыце? Так, так, я да вас звяртаюся. І да вас таксама, "вэнджаныя"! Вы што, хамуйлы, набрыдзь — прыехалі тут свае законы ўсталёўваць? Падціраць смэркі аб нашы абрусы? Гадзіць у нашыя рэчкі?

Яго нарэшце пачулі. Усе сціхлі, нават дзяўчаты.

— Гэта што за "перац"?

Адрэагаваў першым чамусьці не хто-небудзь з так званых "сорнераў", а кухар. Твар яго перасмыкнула.

— Ты нам, гэта, адпачываць не перашкаджай, — чамусьці з радаснай усмешкай дадаў ён. —

Бачыш, як іх усіх разбірае! — І кіўнуў у бок кліентаў і іх дзевак.

— Эйш, заспяваў, — падробліваючыся пад блатнога, здзекліва засіпеў адзін з "мясцовых", набліжаючыся да мужчыны ды няўмела наганяючы страху. — Ты хто такі? Што за панты? Глохні, сука! А то адкажаш за базар: жалязяку на шыю і — на глыбіню.

— Стоп! Стоп! — умяшаўся з борта "капітан". — Навошта гнабіць мужыка? Ён, бачу, з непалахлівых. Пляшку яму, і няхай дадому кіруе! Будзем шчодрымі, ха-ха...

— Сунь сабе тую пляшку ведаеш куды?

— Ну, дык пакуль тое, спакуйце яго, няхай сціхне і падумае, калі ён думаць не ўмее, — спахмурнеў і выказаў прапанову "капітан".

Ён мог і не працягваць, бо на інжынера Мазура ўжо мусілі накінуцца двое "мясцовых", але той ужо і сам напаў на іх, збіў адразу аднаго з ног трапным "лаў-кікам", другому пацэліў у скіўцу — той узвыў, і тут на яго самога напалі ўсе, акрамя "капітана" і, вядома, дзевак, якія безперапынна вішчэлі, — павалілі на зямлю, пакачалі і нават прыклаліся нагамі. "Стоп!" — зноў закрычаў "капітан", пасля чаго ўсе ўрэшце спыніліся.

— Шашлыкі! — запатрабаваў нехта з "сорнераў". — Кухар! Дзе кухар? Халдэй!

— Так, так! — падтрымала адна з дзяўчат. — І музыку сюды!

— А вось сядзіць коцік! Ты — адкуль? — віскнула другая. — Ды вы зірніце — ён і не думае ўцякаць. Ты чый, коця? Які пухнаты!

Яна прысела на кукішкі і пацягнулася да ката рукой. Той зашыпеў і тарганўў лапай.

— Ай, ён мяне падрапаў! — закрычала дзяўчына. — Вось і кроў, глядзіце! А калі ён шалёны?

Мужчына па прозвішчы Алег Мазур сядзеў на зямлі, раз-пораз імкнучыся падняцца на ногі, яго ўсё яшчэ насцярожана прыцiскалі за плечы двое "мясцовых". Але неўзабаве пакінулі ў спакоі. Як ён адчуваў, на большае яны не рызыкнуць, не той расклад... Крыўда і злосць зноў хваляй насунуліся, нягледзячы на тое, што яго неўзабаве пакінулі ў спакоі, пусцілі па руках бутэльку з гарэлкай, спрабавалі прапанаваць і яму.

Між тым нецярплівыя "сорнеры" пацягнулі дзяўчат, што вяла ім супрацiўляліся, за кустоўе, у траву. Адтуль пачуўся віск, рогат, а потым наступіла цішыня, але цягнулася гэта не надта доўга — пакамечаныя, адны за другімі яны зноў з'явіліся ля вады.

Кухар, які сышоў было на бераг, зноў падняўся па сходніках на палубу, засланiўся спінай, зняў з мангала некалькі шашлыкоў на шампурах, старанна апляваў кожны з іх і панёс на бераг.

— Гэта вам за "халдэя".

І ўжо на беразе закрычаў:

— Дарагім гасцям — самыя смачныя!

— Мне хто-небудзь палечыць руку? — зноў заенчыла дзяўчына, якая раней няўдала зацікавілася катом. Шаленствам можна заразіцца. Дзе гэты кацяра? А-а, вунь ён, гад, сядзіць, не адыходзіць...

— Не баіся, кветачка ты наша, зараз гарэлкай прадэзенфікуем, — няшчыра пачаў супакойваць адзін з "сорнераў" — той, хто "апекаваў" яе. — Дзе гарэлка? Халдэй!

Сонца, між тым, зайшло, і цені над зямлёй згусціліся і папаўзлі па вадзе.

"Капітан" спусціўся на бераг, падышоў да мужчыны, які, сціснуўшы сківіцы, скамянела глядзеў удалечыню, і спытаў:

— Ну, што засумаваў? Дамоў — не пара? Ды ты не садзіся на крыўду, сам вінаваты.

— Бадай што і праўда паеду, — раптам пасля непрацяглага роздуму згадзіўся мужчына па прозвішчы Алег Мазур.

— Ну дык і правільнае рашэнне, — палегчана ўздыхнуў "капітан" і дадаў "мясцовым": — Вуды яму вярніце, каб усё па-часнаку! Ды наліце шклянку.

Прынеслі вуды. Інжынер Алег Мазур сунуў іх у чахол, перакінуў яго за спіну, грэбліва адхіліў гарэлку, сеў на ровар, затрымаўся раптам, убачыўшы ката, які па-ранейшаму нервова бегаў побач, і — націснуў на педалі.

***

Праз якую гадзіну мужчына ўжо вяртаўся назад. Ён спяшаўся і таму штосілы націскаў на педалі. Перасёк бальшак з бясконцым патокам машын і збочыў, урэшце, на дарогу да вадаёма. На шматлікіх калюжынах яго трэсла, і тады ён адчуваў боль у грудзях. "Трапілі, пэўна, і па рэбрах", — змрочна думаў ён.

Амаль сцямнела, але прамень святла ад фары, якую ён абачліва ўсталяваў з месяц раней на руль ровара, добра асвятляў вузкую сцяжынку. Урэшце ён наблізіўся да месца, дзе лавіў верхаводак, а пасля пакінуў баляваць плывучую кампанію

прыхадняў і цяпер, яшчэ не даехаўшы, пабачыў, што “Здань” ужо зноў адплыла амаль на сярэдзіну вялікай вады. На асветленай вісячым ліхтаром палубе, пэўна, па-ранейшаму святкавалі, бо адтуль гучала музыка, даносілася гергетанне “сорнераў” і вясёлыя галасы дзяўчат ды знаёмы пранізлівы рогат адной з іх:

— Ха-ха-ха-хі-хі-хі-хі!

Мужчына саскочыў з ровара і раптам у святле яшчэ не згаслай фары ўбачыў на пяску шэры камяк. На якую секунду ў яго перахапіла дыханне, і ён падумаў: “Не можа быць”, — але, укленчыўшы, ужо зразумеў, што прадчуванне благога не падманула.

Цельца ката з перасечанай шыяй скурчылася перад ім на зямлі. Яго “меншы брат”, лавец верхаводак, быў мёртвы.

— Ну, дык тым больш... Ад шроту не памрэце...

Мужчына на які міг знерухомеў, а потым быццам зусім супакоіўся, рыўком узняўся на ногі, перакінуў з-за спіны цяжкаваты скрутак, выцягнуў адтуль двухствольны курковы драбавік, пераламіў ствалы, вытрас з сумкі некалькі патронаў і зарадзіў адразу двума. Ён падышоў усутыч да вады, ускінуў рулю, прыцэліўся і націснуў на курок, потым на другі.

Стрэлы заглушылі ўсе іншыя гукі і рэхам пракаціліся над вадаёмам. Адразу за імі з борта прагулачнага судна пачуўся істэрычны віск і няўцямныя, спанікаваныя галасы.

Мужчына выкінуў пад ногі гільзы, зноў зарадзіў драбавік і зноў націснуў на абодва куркі разам. Прыклад аддачай таргануў яму ў плячо.

Чарговы зарад дробі, пэўна, трапіў у ліхтар на палубе, бо той з трэскам лопнуў і рассыпаўся. На "Здані" стала цёмна.

— Ратуйце! — завішчэў адтуль жаночы голас, — забіваюць!

— Міліцыю! Мабілу сюды! Хутчэй!

— Ай, ай, у мяне трапіла!

— Не страляй! Хто там страляе?

— Хавайцеся!

— Мабіла! Дзе мая мабіла?!

Чалавек па прозвішчы Алег Мазур выкінуў на пясок чарговыя дзве гільзы, зноў зарадзіў драбавік. Ускінуў рулю ў напрамку цёмнага плывучага сілуэта і зноў націснуў на куркі.

На судне ўзняўся суцэльны крык, з борта пляснулася нешта ў ваду, потым раптам зароў матор.

Мужчына намацаў рукой у сумцы. Патронаў больш не было. Пасля чаго размахнуўся і закінуў драбавік у ваду, сабраў з-пад ног гільзы і таксама кінуў следам.

Нейкі час ён маўкліва пастáяў на беразе, а потым знайшоў нерухомае цельца, расшпіліў кашулю і запіхнуў ката, яшчэ цёплага, за пазуху.

Усю дарогу, пакуль ехаў, ён адчуваў гэтую паволі знікаючую цеплыню і думаў пра жывёлу і сябе: "Ну вось, хутка і будзем з табой дома. Як абяцаў".

*Снежань 2012 г.*

# ЗАДАННЕ ДЛЯ СТАЖОРА

Стажор Багдан Кайра спыніўся ля дзвярэй і запытальна зірнуў на сакратарку.

Тая кіўнула галавой.

— Заходзь. Ён чакае.

Галоўны дырэктар, мажны, з вялікай лысай галавой, узняў на яго позірк пранізлівых шэрых вачэй-шчылінак і сказаў, нават не запрасіўшы прысесці (тут бераглі час і лішніх слоў ніхто не вымаўляў):

— Пройдзеш на закрыты аб’ект. Нам трэба адтуль інфармацыя. Як пройдзеш і як здабудзеш — твая праблема. Нам сталі вядомыя толькі час, месца і агульны кірунак сходу нешматлікіх навукоўцаў. Усё, жадаю поспеху. І памятай: галоўнае ў нашай справе — гэта здабыць інфармацыю, а як ёю распарадзіцца — ужо іншае.

Па маладосці Багдан Кайра актыўна займаўся рукапашкай, а паколькі ён рос у ледзь прыхаванай беднасці, то вымушаны быў з часам зарабляць на жыццё ўдзелам у баях без правілаў. У жорсткіх паядынках з такімі ж парыямі, як і сам, ён набыў неабходную псіхалагічную ўстойлівасць і спрактыкаванасць, але і некалькі істотных траўмаў, апошняя з якіх прымусіла яго пакінуць “клетку” (так на слэнгу завуць рынг альбо месца, дзе адбываюцца баі). Потым прыродны розум, удача і набытыя

знаёмствы дапамаглі яму ўладкавацца ў фірму. Так ён стаў стажорам, а ў сувязі з тым, што не набыў пакуль ні вопыту, ні вядомасці, ні ўласнага імя, то яго выкарыстоўвалі на ўсялякіх другасных падзеях. Урэшце, сам Багдан Кайра быў упэўнены, што яго зорнае імгненне яшчэ наперадзе.

Так і цяпер: яго задзейнічалі на нейкі нешматлюдны засакрэчаны форум, дзе быццам вырашаліся пытанні малазнаёмага яму, калянавуковага характару, з заданнем здабыць там хоць якія звесткі.

Форум, на які Кайра з цяжкасцю прасачыўся праз запасны ліфт пад выглядам маладога навукоўца, праходзіў ледзь не сумна. Удзельнікі — у асноўным, малавядомыя яму асобы — абмяркоўвалі напаўзабытыя і ўвогуле, наколькі ён ведаў, напаўзабароненыя ідэі шматмерных камп'ютарных працэсаў, працы Джарона Ланье, Ніка Бострама, Робіна Дайнтана і сучасных "прасунутых" пра сімуляцыю і ўсё тое, што з ёй звязана. Чамусьці фатаграфаваць удзельнікаў было катэгарычна забаронена. Але рэпарцёр Кайра выдатна разумеў, што калі захоча, то незаўважна зробіць гэта з дапамогай свайго мабільніка, у корпус якога была ўманціравана надзвычай адчувальная камера. Пакуль што ён уключыў дыктафон і запісваў тое, што збольшага разумеў: вылічальная складанасць мозгу — дзесьці дзесяць у шаснаццатай ступені аперацый у секунду, аб'ём вылічэнняў, неабходных для рэалістычнай сімуляцыі ўсёй гісторыі чалавецтва, — прыкладна дзесяць у трыццаць трэцяй ці дзесяць у трыццаць шостай ступені аперацый у секунду, і ўсё такое.

У перапынку за фуршэтнымі столікамі пілі каву і елі даволі прыстойныя, на яго погляд, бутэрброды. Незаўважна Багдан Кайра зрабіў некалькі здымкаў.

Праз нейкі час форум скончыўся, але на выхадзе Багдана напаткала нечаканасць.

— Фільтрацыя надалоннікаў! — аб'явіў з нябачнага рэпрадуктара механічны голас.

Усе ўдзельнікі форуму, якія пакідалі залу, паступова сталі шарагавацца ў доўгую чаргу.

Мабільнікі адбіралі і прыкладна праз 20–30 секунд вярталі ўладальнікам, папярэдне прапусціўшы праз камп'ютарны аналізатар.

Багдан Кайра ліхаманкава шукаў выйсце. Камп'ютар не падманеш — запісаныя ім тэксты і здымкі будуць выяўлены, пасля чаго засвеціцца з адпаведнымі наступствамі і ён сам. Што рабіць?

Пакуль што ён марудна адступаў у канец чаргі. Яшчэ некалькі крокаў — і Багдан апынуўся ў бакавой нішы, дзе месціліся туалеты. Зачыніўся ў адным з іх, выцягнуў з пазіка фіксуючую зашчапку на акне, прыадчыніў яго і высунуў галаву. Унізе, на адлегласці пятнаццаці паверхаў, была зямля. Амаль пад сабой ён заўважыў на ёй клумбы з кветкамі, размахнуўся і шпурнуў туды мабільнік, запомніўшы размяшчэнне клумбаў. "Лепш увогуле згубіць надалоннік, чым праваліць сябе і ўсю справу разам", — падумаў ён.

Хвілін праз дваццаць Багдан ужо выскачыў з ліфта ў хол, а потым і на вуліцу. Прыкінуўшы, з якога боку знаходзяцца клумбы, Кайра імкліва скіраваў туды. Зрэнкавая зоркасць і выдатная памяць на рэчы не падвялі яго і цяпер. Мабільнік адшукаўся ў адной з клумбаў, прыкладна там, дзе ён і разлічваў.

Прыняўшы незалежны выгляд, Багдан Кайра выбраўся на ходнікі і павольна рушыў у патрэбным яму напрамку да падземкі. Неба было хмарнае, ішла ўжо восень, і таму рана цямнела. З замацаваных і замаскіраваных сям-там у сценах рэпрадуктараў да яго даносіўся зазыўны шэпт аўтамаклераў і агентаў гандлю — усялякія крамкі прапаноўвалі сваё: тавары масавага попыту, азартныя гульні, дазволеную ахоўную зброю, каталогі турысцкіх падарожжаў і забаў. Урэшце, ён не прыслухоўваўся: наяўных грошай у яго амаль што не было.

Увайшоўшы ў вузкую і цёмную арку (так ён мусіў скараціць шлях), Багдан Кайра раптам насцярожана прыслухаўся і ўнутрана сканцэнтраваўся, бо яго нехта адмыслова даганяў. Ён павярнуўся тварам да незнаёмага.

Амбал, прыкладна каля метра дзевяноста, насунуўся на яго з прыцемку і спыніўся ўсутыч.

— Паслухай, братан, — сказаў ён з ноткай нахабства ў голасе, — ты не пазычыш мне на хвіліну тваю мабілу? А то я сваю дома забыўся.

— Я табе не братан, — адказаў Багдан Кайра. — Гэта па-першае. А па-другое, надалоннік — рэч інтымная, як, прыкладам, зубная шчотка. Кубатурыш, пра што я?

Ён ужо зразумеў, што тут нешта нячыстае і бойка непазбежная: пра гэта яму на ўсю моц крычаў яго спрактыкаваны на такія сітуацыі інстынкт.

— Давай мабілу, лох!

— Паспрабуй вазьмі!

Краем вока Багдан Кайра зафіксаваў, як ногі незнаёмца незаўважна рассунуліся на шырыню

плеч, левая ступіла наперад і доўгі бакавы джэб ужо ляцеў яму ў галаву.

Амаль машынальна ён ухіліўся ад удару кулаком і адказаў лаў-кікам з левай нагі, трапіў, як і мусіў, па знешнім боку бядра праціўніка, але амбал не згубіў раўнавагі, і Багдан Кайра зразумеў, што бойка атрымліваецца сур'ёзная.

Абодва зноў абмяняліся ўдарамі, але кожны здолеў блакаваць замах. Прывучаны калісьці ў "клетцы" думаць у час паядынкаў, імкліва аналізаваць іх ход і вызначаць слабыя месцы праціўніка, Багдан Кайра пачаў рабіць гэта і зараз. У блізкі кантакт ён уступаць не жадаў: амбал хоць і быў прыкладна аднолькавага з ім росту, але важыў намнога больш — гэта адчувалася. Таму Кайра круціўся, ухіляўся ад удараў і прывучаў праціўніка да таго, што атакуе ўвесь час яго ногі. Так, амаль толькі ногі. Справа, злева. Ён падпільноўваў зручны момант, але амбал стаў асцярожны, пэўна, не чакаў ад праціўніка спрыту, наадварот, прамым ударам правай ледзь не зламаў яму, Кайру, ключыцу.

Блакуючы ўдары і наносячы ў адказ, Багдан Кайра ў рэдкіх мільгатлівых успышках святла ад машын, што праязджалі за аркай па вуліцы, імкнуўся разгледзець твар праціўніка, зразумець, урэшце, хто гэта такі і чаму наўмысна напаў на яго. У тым, што нападзенне наўмыснае, Кайра ўжо не сумняваўся.

Думкі імкліва ўзнікалі і гэтаксама імкліва растваралiся ў яго галаве.

...Удар.

...Блок.

...Удар. Трапіў...

...Прапушчана. Боль.

...Ногі. Каленны суставў. Трапіў... Ага, адчувальна...

Бойка цягнулася лічаныя секунды, але ніхто з праціўнікаў не меў дагэтуль яўнай перавагі. На барцоўскі захоп ніхто з іх таксама свядома не ішоў, бо качацца па асфальце было пагрозай небяспечнай траўмы любому.

...Удар.

...Прытворны замах.

...Вось яно. Так... Ёсць!

Амбал нарэшце папаўся. Засцерагаючыся ад удару па нагах, ён нізка апусціў рукі і раскрыўся. Ад "мавашы" ў галаву ён яшчэ памкнуўся спачатку адхіліцца і потым, амаль адначасова, блакуючы ўдар, абараніцца рукой, але кісць рукі ў такім выпадку — слабая абарона. Прапусціўшы ўдар у галаву, праціўнік "паплыў" і, склаўшыся, марудна паваліўся на асфальт.

Усё.

Іх сутычка, пэўна, не засталася незаўважанай, бо, азірнуўшыся, Багдан Кайра ўбачыў мігалку патрульнай паліцэйскай машыны. Сустрэча з прадстаўнікамі закону ў яго намеры не ўваходзіла, і ён паспешліва кінуўся назад, выслізнуў з аркі і неўзабаве змяшаўся з натоўпам, прадбачліва сцягнуўшы пінжак і застаўшыся у адной кашулі. Так яго будзе няпроста вылічыць, калі лянівым паліцыянтам нават і захочацца стварыць нешта накшталт пагоні.

***

У прыёмнай шэфа акрамя сакратаркі сядзеў мажны, коратка стрыжаны мацак у цёмна-шэрым касцюме. На твары яго быў заўважны старанна загрыміраваны кровападцёк. Нешта быццам

няўлоўна знаёмае нагадалася Багдану Кайру ў абліччы наведвальніка.

Мацак нядобра зірнуў на яго з-пад ілба і скрывіў тонкія вусны.

— Ты мне палец зламаў, ідыёт, — сказаў ён.

Як толькі пачуў голас, Багдан Кайра адразу пазнаў яго: гэты чалавек учора напаў на яго на вуліцы і хацеў завалодаць мабільнікам. Левая кісць у мацака была ў белай гіпсавай павязцы.

— За ідыёта — адкажаш, — машынальна вымавіў Кайра і прысеў побач.

Ён няўцямна ўтаропіўся ў сакратарку і толькі хацеў патрабаваць тлумачэнняў, як у яе на стале прагучаў сігнал і голас шэфа гучна вымавіў:

— Стажоры з'явіліся? А калі так — абодвух да мяне!

Галоўны, як звычайна, вольна сядзеў за сваім масіўным сталом, пабліскваючы шышкаватай лысінай. Нязвыклая ўсмешка раптам узнікла на яго твары.

— Тэст на кемлівасць, — сказаў ён і спытаў: — Ну, і што ты пра ўсё гэта думаеш, Кайра?

— Мяркую, гэта быў своеасаблівы іспыт. Вы наўмысна нацкавалі на мяне вось гэтага...

— Правільна, — перабіў яго шэф. — Ён такі самы стажор, як і ты, Кайра. Толькі з нашай службы бяспекі. Але я вас віншую. Ад гэтай хвіліны вы абодва залічваецеся ў штат. Я вамі задаволены, бо вы ўніверсалы. Калі спатрэбіцца, я нават здолею памяняць вас месцамі.

Радасны, як, здаецца, ніколі ў сваім жыцці, Багдан Кайра пакідаў кабінет начальніка.

Бо цяпер ён — супрацоўнік фірмы. Магчыма, самай уплывовай ва ўсім іх паўночным рэгіёне.

# РЫТУАЛЬНАЕ СЭППУКУ НАБОРШЧЫКА ГУТАРА

У абедзенны перапынак машыніст-наборшчык гарадской друкарні Язэп Гутар выйшаў у захламлены рулонамі паперы брудны дворык, каб з'есці на свежым паветры тое, што прынёс з дому, але ў "бяседку", дзе месціліся дзве лаўкі, не пайшоў, а прысеў збоку, у адзіноце. Абед яго, загорнуты ў газету, складаў, акрамя хлеба, два курыныя яйкі, звараныя ўкрутую, і паўлітра малака ў шклянай бутэльцы.

Было цёпла, нават горача.

Машыніст Гутар пачаў есці, але неўзабаве адчуў, як страўнік супраціўляецца, і званітаваў, пасля чаго крыху пасядзеў на пустой скрыні і, па сігнале, зноў вярнуўся на месца працы. Спазняцца не выпадала, бо за гэта адразу каралі: пазбаўлялі часткі зарплаты, і тое — у найлепшым выпадку, а ўвогуле маглі прышыць палітыку: шкодніцтва, сабатаж ці яшчэ што.

У цеснаватым памяшканні друкарні звыкла гулі і ляпалі механізмы, пыл і пах клею казыталі ноздры. Закратаванае шкло на вокнах было заплямленае брудам, але ўсё роўна за ім пазнавалася лета.

Машыніст-наборшчык друкарні Язэп Гутар набіраў тэкст. Работа блізілася да завяршэння, але ён ведаў: працоўны дзень для яго звыкла зацягнецца, што апошнім часам назіралася паўсюдна.

Рэдактар раённай газеты "Камуністычная праца" Берасценка, імкнучыся пазбегнуць памылак друку, па тры-пяць разоў перачытваў гранкі. Вядома, гэта выклікала незадавальненне машыніста друкарні Гутара, таму што друкаванне газеты зацягвалася за поўнач. Але адкрыта пратэставаць было небяспечна.

Язэпу Гутару было каля сарака пяці гадоў. Для свайго веку ён выглядаў спрацаваным і надзвычай стомленым чалавекам. Ссівелая вялікая галава, схуднелыя плечы і рукі, зморшчыны на твары надавалі яму выгляд старога. Ён адчуваў, што захварэў. Некалькі тыдняў раней ён з цяжкасцю прабіўся на прыём да лекара ў гарадской паліклініцы — да таго была вялікая чарга, бо не толькі папярэднія лекары, а і, часам, фельдшары, нават ветэрынар знікалі невядома куды. Урэшце, усе ведалі, што іх забіралі па начах, але пра тое маўчалі. Гутара непакоілі болі ў страўніку, і лекар, памацаўшы яму жывот, напісаў паперку-накіраванне ў абласную бальніцу. Язэп Гутар прааналізаваў сімптомы хваробы, а ён шмат чытаў з таго, што набіраў, і зразумеў, што яго справы — дрэнь, і нікуды не паехаў, але чамусьці працягваў механічна хадзіць на працу. Ён жыў адзін у барачным пакойчыку. Жонка з год таму раптоўна памерла ад запалення лёгкіх, а сына забралі служыць у войска, і ад яго даўно нічога не было чуваць. З-за усяго гэтага наборшчыка Гутара ўжо працяглы час апаноўвалі змрочныя думкі пра самазабойства. Як ён лічыў: жыццё навокал і так не мела аніякага сэнсу, а тут яшчэ і хвароба. У тым, што яна вельмі сур'ёзная, ён чамусьці не сумняваўся, бо шмат выведаў з некалькіх брашур па медыцыне, якія набіраў на працы.

Але ў глыбіні душы Язэп Гутар яшчэ не згубіў рэшткі веры, а продкі яго былі ўніяты, і яго самога бацькі калісьці паспелі ахрысціць ва ўніяцкай царкве, а мясцовая — нядаўна была ўшчэнт разбураная і разабраная па бярвеннях. Знік кудысьці назаўсёды і ўніяцкі святар. Вера забараняла яму самазабойства, і машыніст Гутар з таго быў у цяжкім одуме, а параіцца хоць бы з тым святаром — не выпадала. Сам парадак жыцця выклікаў у яго цьмяны неспакой і трывогу, якія пераходзілі ў страх, чаго ён саромеўся, але навокал так жылі ўсе — нават дырэктар друкарні Гурскі, начальнік райліту Шабун, рэдактар "Камуністычнай працы" Берасценка і яшчэ людзі, нашмат вышэйшыя і, наадварот, прасцейшыя за іх.

Машыніст друкарні Гутар баяўся не так смерці, як застацца аднаму і бездапаможнаму перад хваробай, ляжаць саслабеламу ў ванітах і брудзе, бо ніхто не прыйдзе на дапамогу. Хіба што пасля пахаваюць наспех, каб захапіць пакойчык у бараку, які ён займаў.

Якраз цяпер Язэп Гутар зноў павінен быў затрымацца, бо наступнай раніцай выходзіў нумар з выступленнем генеральнага сакратара ЦК Сталіна на нарадзе камбайнераў, і вычытваць яго рэдактар раённай газеты Берасценка, былы міліцыянер, які скончыў курсы лікбезу, уедлівы і зласлівы, будзе некалькі разоў. Урэшце, тэкст выступу быў набраны ўчора, але Гутар ведаў, што гранкі панясуць у рэдакцыю зноў і зноў, а сам ён будзе завіхацца тут усю ноч.

Цяпер жа ён набіраў нешта кшталту ўступу да той нарады, што адбылася ў далёкай Маскве.

«...Фанфары ўзняліся ўверх разам са змешчаным ззаду “Прывітаннем” у выглядзе прамянёў, якія разыходзіліся па ўсёй прасторы залы. Наперад выйшаў вядучы і сказаў кароткі ўступ, пасля якога загучала “Песня пра Сталіна”:

Вядзі нас, любімы,
Табой мы з’яднаны.
Ты наша жыццё,
Дарагі правадыр...»

Зноў, як і раней, машыніст Язэп Гутар адчуў, як яго ахоплівае млосць. Рот напоўніўся слінай. Хацелася кінуць усё і пайсці адсюль куды-небудзь да ракі ці яшчэ далей — у лес, легчы там на траву, глядзець і слухаць, як ціха варушацца і шумяць пад ветрам вершаліны соснаў. Але ж нешта змушала яго гібець тут, у друкарні. Надзея на лепшае? А раптам хвароба пройдзе сама? Спадзяванне на гэта? Страх? Так, хутчэй за ўсё — менавіта страх, чамусьці з агідай да сябе падумаў ён.

Ён зноў працягваў набіраць афіцыйны тэкст, дасланы са сталічнага тэлеграфа, пра тое, як і ў якім складзе сядзеў у зале Прэзідыум на чале з таварышам Сталіным, як усе ўставалі некалькі разоў і віталі таго працяглымі апладысментамі, як на сцэне ззаду Прэзідыума паўстала высокая піраміда, упрыгожаная наверсе імгненна раскрытым сцягам з вялікім партрэтам таварыша Сталіна і пад ім — сцягам Саюзных рэспублік.

***

Пад вечар рэдактар Берасценка ў трэці раз вычытваў гранкі. Але нумар не падпісваў, рыхтаваўся чытаць зноў, пасля карэктара.

Адчуваючы ўжо знаёмыя прыкметы вялікай стомленасці і незадаволенасці, машыніст друкарні Язэп Гутар па заканчэнні працоўнага дня адважыўся і пайшоў да дырэктара Гурскага.

Сакратарка пусціла.

— Можа, я пайду ўрэшце дадому, — нерашуча спытаў ён у дырэктара, хутчэй прапанаваў.

Дырэктар Гурскі ўзняў галаў з-за стала і кінуў няўцямны позірк. Яго лысая галава блішчэла ад поту.

— Не, братка, — сказаў ён нават прыхільна. – Сам бачыш, які важны і адказны матэрыял зараз ідзе ў газеце. Ты ўжо пацярпі. Узгадні ўсё з Берасценкам.

— Дык я схажу да таго?

— Схадзі, — дазволіў дырэктар Гурскі.

Урэшце, Гутар на дырэктара асаблівай крыўды не трымаў, бо апошні паводзіў сябе пад настрой нават прыстойна і падначаленых моцна не шчаміў. Іншым быў Берасценка. Глядзеў заўсёды з-пад ілба чорнымі, мутнымі ад падсвядомай злосці вочкамі. Буйныя цёмныя валасы часам звісалі яму аж да носа, і тады ён закідваў іх растапыранай далонню ўверх, і казаў пры гэтым нешта кшталту "правільна!" альбо "няправільна!", і пачынаў уядаць залежна ад таго суразмоўцу ці падначаленага, страшыць, кпіць з таго і пагражаць.

Язэп Гутар моўчкі выйшаў з кабінета дырэктара. На падворку раптоўны прыступ слабасці і млосці ў страўніку зноў наваліўся на яго. Пацягнула на ваніты. Сліна была цягучая і з непрыемным пахам. "Вось і скончана ўсё", — неяк раўнадушна падумаў ён. Але самае галоўнае чакае яго

наперадзе. Бо смерць, як не круці, — найважнейшая падзея ў жыцці.

Ён раптам успомніў, як днямі недзе ў нейкай брашуры, калі набіраў, выпадкова вычытаў пра японскіх самураяў, якія ў момант крайняй небяспекі, у перыяд цяжкай хваробы альбо перад рытуальным самазабойствам — сэппуку — стваралі кароткі верш, так званы дзісэй. Гэта ў брашуры падавалася ў карыкатурным выглядзе, са здзекам і кпінамі ў бок японцаў, — ужо рыхтаваліся да вайны з імі, але ён ведаў, што смяяцца над такім ганебна. Вядома, меркаваў цяпер наборшчык Гутар, самураі былі іншай веры, якая, як ён з цяжкасцю ўспомніў, называлася “хагакурэ бусіда”, і тое было хутчэй не веравызнанне, а нейкі найвышэйшы маральны кодэкс. Але яму, хрысціяніну, веравызнанне ўвогуле забараняе самазабойства. Дык ён вольны ці не? Навошта ён пражыў свае сорак гадоў? Каб зараз пакорліва сысці, нібы чарвяку ў гной, і ніхто ніколі пра яго не ўспомніць?

Гадоў каля дваццаці таму Язэп Гутар, сын дробнага рамесніка з Беласточчыны, спакусіўся на заклікі савецкіх агітатараў і падаўся на Усход. Бацькі ўсяляк адгаворвалі яго, але хлопец не паслухаўся. У яго, праўда, хапіла розуму перайсці мяжу ноччу і не трапіць на вочы стукачам з памежных вёсак. Далёкі сваяк, канторшчык у горадзе, да якога ён абачліва спачатку з’явіўся, вельмі спалохаўся, аж збялеў, але спехам арганізаваў яму неабходную даведку, папрасіў толькі паклясціся, што ні ў якім разе яго не выдасць, і параіў адразу сысці, нават з’ехаць далей і там знайсці якую працу.

Ён і сам хутка зразумеў сваю фатальную памылку, але шляху назад ужо не было. Неяк, пад штодзённым страхам, упісаўся ў жыццё, ажаніўся, скончыў нават паліграфічную вучэльню.

“І гэта ўсё? — думалася цяпер яму. — Пражыць тут больш за два дзясяткі гадоў у суцэльнай хлусні і страху? А неўзабаве спруцянець, і нават некалькі вершаваных радкоў, як у тых самураяў, пасля яго не застанецца?”

***

Рэдакцыя газеты, дзе знаходзіўся кабінет рэдактара Берасценкі і некалькі невялічкіх пакойчыкаў супрацоўнікаў, месцілася побач з друкарняй, амаль у цэнтры старой часткі горада. Раней, яшчэ да рэвалюцыйных падзей, тут, як казалі старыя, знізу быў шынок, а непасрэдна ў верхнім паверсіку — бардэль ці публічны дом, дзе гасцей і падпітых наведвальнікаў адразу сустракалі некалькі дзевак. Ззаду, у глыбіні — друкарня, а вышэй, на пагорку, грузна стаяў Дом піянераў — былая сінагога.

Машыніст друкарні Гутар пакінуў за сабой прахадную і праз некалькі дзясяткаў крокаў апынуўся перад будынкам рэдакцыі. Боль у страўніку з новай сілай працяў яго, але ён стрываў. Дома вып’е чаго-небудзь: гарачай гарбаты, амаль кіпню, ці шклянку гарэлкі. Тады яму звычайна станавілася лепей.

Унізе, у былым шынку, гандлявалі і цяпер. На палічках было бедна: слоікі з гуркамі альбо памідорамі, капуста, танны яблычны сідр ды гарэлка.

Язэп Гутар збочыў і падняўся па прыступках у рэдакцыю. Некалькі супрацоўнікаў абодвух полаў сядзелі за сталамі і нешта пісалі ці званілі па тэлефонах. Злева, у калідоры, за перагародкай чулася ляпанне друкарскай машынкі. Дзверы ў кабінет рэдактара былі зачынены. Гутар асцярожна пагрукаў і адчыніў.

Рэдактар райгазеты Берасценка сядзеў за сталом і чытаў гранкі. Мутныя яго вочкі, у кутках якіх кроплямі запёкся гной, утаропіліся ў наборшчыка. Рука звыкла зграбла пасмы валасоў і закінула іх назад, ад чаго агаліўся нізкі, на два пальцы, вузенькі лоб.

— Я што — выклікаў цябе? — незалюбіў ён.

— Сам прыйшоў. Ёсць, значыць, патрэба.

— І што ты хочаш, Гутар? — незадаволена і з прыхаванай зласлівасцю пацікавіўся рэдактар.

— Хачу дадому, — сказаў Язэп Гутар. — Мая змена даўно скончылася.

— А ты бачыш, што я зараз чытаю?

— Я дагары нагамі не бачу.

— Гэта як — дагары нагамі? — зласна ўзняў галаў рэдактар Берасценка.

— Вы чытаеце ўжо ў чацвёрты раз.

— Нарываешся на тэрмін за такія размовы?

— Што так?

— Прамова самога таварыша Сталіна. І чытаць яе я буду і ў пяты, і ў шосты, і нават, калі трэба, у дзясяты раз.

— Я да раніцы сядзець і чакаць не буду. Падпісвайце нумар.

— А вось за такія контррэвалюцыйныя выказванні дакладна сядзеш. У турму.

— Не шыйце палітыку, — сказаў наборшчык Гутар. Боль у страўніку раптам адпусціў яго, і ён адчуў, што разам з ім знік і страх.

— Няправільна, — з нянавісцю абвесціў Берасценка.

— І вас "закрыць" могуць, — аспрэчыў таго Гутар. — Ад турмы не заракаюцца.

Запанавала пагрозлівая паўза.

— Разбяромся з табой. Але пасля. А цяпер пайшоў прэч. На сваё працоўнае месца.

І раптам роблена зароў:

— Лінію скажаць?! Партыі? Не дазволім!

К ночы, як на неба выплыла ярка акрэсленая поўня, рэдактар Берасценка прачытаў газету ў сёмы раз і, урэшце, падпісаў нумар.

Друкарня працавала. Наборшчыка Гутара зноў званітавала. Але моцнай слабасці, як апоўдні, ён чамусьці не адчуваў. Да гэтага часу ён ужо ведаў, што яму рабіць.

Ён пачаў лічыць. Імя Сталіна паўтаралася ў газеце трыццаць сем разоў. Язэп Гутар акуратна, імкнучыся не прапусціць, старанна перабраў кожнае. Ён спяшаўся. Змяняў літару "т" на "р". Усяго адну літару. Трыццаць сем правак. Не так ужо і шмат.

...Машыны і механізмы між тым працавалі. Падвозіліся рулоны з паперай. Як ён ведаў, раніцай — а зверху, пачынаючы ад "самога", патрабавалі, каб у падпісчыкаў да восьмай гадзіны ўжо ляжаў у паштовай скрыні свежы нумар — усе атрымаюць газету.

Язэп Гутар пайшоў дамоў. У сваім барачным пакойчыку наборшчык Гутар сабраў паперы, лісты і дакументы і ўсё спаліў. Потым проста прылёг

на свой жалезны жаўнерскі ложак, засцелены трафейнай нямецкай коўдрай і на нейкі час знерухомеў.

Ён думаў пра смерць. Пра тое, што, бадай, анічога ў свеце не вартае яе па значнасці. Успомніў, як памірала жонка. Лекара ён, калі б і хацеў выклікаць, то не здолеў, бо таго перадусім забралі наўпрост з бальнічкі. Казалі потым звычайнае — быццам той аказаўся законспіраваным ворагам народа, агентам дэфензівы.

Жонцы рабілася горш з кожнай хвілінай, а ён не мог ёй дапамагчы. Фельчар толькі развёў рукамі. Позна. Дый у самога фельчара ў сумцы амаль не было аніякіх лекаў. Жонка працавала да апошняга. На фабрыцы за нявыхад заводзілі справу, і так усё і атрымалася.

Наборшчык Гутар успомніў, як трымаў яе за руку, дыханне ў яе станавілася ўсё больш цяжкім, з хрыпамі, а сэрца білася часта-часта, нібы стракатала швейная машынка. А потым яна глыбока ўздыхнула некалькі разоў і — сцішылася назаўсёды.

Пачынала світаць. Праз акно ўжо віднелася шэрае неба без зорак. Кудысьці ўбок споўз месяц.

Наборшчык Язэп Гутар ведаў, што адбудзецца раніцай. Ужо хутка. Вельмі хутка. Калі пачнуць чытаць газету. Спачатку забегаюць шматлікія стукачы, пачнуць паведамляць у мясцовае ўпраўленне НКУС альбо непасрэдна сваім куратарам. Стукачоў, на яго погляд, паўсюдна было як блох у бадзяжнай сучкі. Ніхто не давяраў нікому. Такі настаў час. У кожным квартале кварткам з'яўляўся сакрэтным інфарматарам. Інфарматар, але ніжэйшага рангу, пражываў у кожным пад'ездзе,

сачыў за жыльцамі. Любыя фабрыка, завод, калгас налічвалі іх дзясяткамі. Былі інфарматарамі шматлікія кіроўцы, паштавік, лазеншчык у гарадской лазні, дырэктары школ і некаторыя настаўнікі, святар у царкве, які абавязаны захоўваць таямніцу споведзі, але не захоўваў, і піянеры ў летнім піянерскім лагеры. Здаралася, брат даносіў на брата, а сват на кума. Асабліва іншым разам шчыравалі жонкі, абгаворваючы сваіх мужоў.

Вербавалі, вядома, і яго. У сувязі з характарам яго працы. Запрасілі ў кабінет да Шабуна. Начальнік райліту адразу выйшаў, а ён застаўся сам-насам з невысокім страшнаватым чалавечкам у цывільным. Нягледзячы на знешнюю несамавітасць, ад нкусаўца, тым не менш, як ад атрутнага насякомага, дзьмула нялюдскім холадам і пагрозай.

Ён тады здолеў адхрысціцца. Нёс абы-што, уключыў дурня, казаў, што як вып’е гарэлкі, дык становіцца балбатлівым, а не піць не можа. Нкусавец, магчыма, і не паверыў, але адступіўся, ды ён ведаў — гэта ненадоўга, будзе правяраць, капне раптам глыбей, і тады...

Хутка за ім прыйдуць. Вядома, сёння ж забяруць і рэдактара Берасценку, магчыма, начальніка райліту Шабуна і дырэктара друкарні Гурскага. Бадай што прыедуць дзесьці а восьмай, і ён пачуе. Невядома толькі, каго будуць увязніваць першым. Але ж для яго гэта не так ужо і важна. “Пара”, — неўзабаве падумаў ён.

Наборшчык Язэп Гутар падхапіўся з ложка, дастаў з-пад яго сякеру, якой звычайна сёк на зіму дровы, і за грубкай на падлозе прыўзняў адну з дошак. Адтуль ён выцягнуў курковае паляўнічае

ружжо шаснаццатага калібру, набытае раней у адзінокай старой, якая перыядычна ўпадала ў маразм і нават не помніла, ад каго ёй тое ружжо засталося, — наборшчык Гутар трымаў яго на ўсялякі выпадак. Цяпер такі выпадак надышоў. Але патронаў не знайшлося, як ні шукаў. Ніколі ён не шкадаваў, як цяпер.

Усё свядомае жыццё ён іх ненавідзеў. Прыгінаўся, хлусіў, хаваў свае думкі, рабіў памылкі і цяпер расплачваўся за іх. Але заўжды ненавідзеў. Ненавідзеў іх партыйныя і беспартыйныя кніжкі, ідыёцкія фільмы, сцяг, гімн і герб, песні і скокі дураплясаў, з'езды і канцэрты мастацкай самадзейнасці, армейскую службу. Чужынскую мову, якую прынеслі з Усходу. Усё.

Асабліва Вялікага Правадыра.

СРАЛІНА

Ён нават засмяяўся са сваёй прыдумкі, але нервовае напружанне змусіла яго адразу вярнуцца да сваёй галоўнай праблемы.

Як тым старажытным японцам, яму цяпер засталося толькі адно — сваё асабістае рытуальнае сэппуку, меркаваў ён. Яны хутка прыедуць, выламаюць дзверы, і тады праблема вырашыцца сама сабой.

Ён хутка знайшоў нож і агледзеў яго з усіх бакоў. Лязо было вострае, шырокае і даўгое, прыблізна каля трыццаці сантыметраў, дзяржанне драўлянае, з жалезнымі заклёпкамі.

Наборшчык Гутар хацеў было спаласнуць нож вадой, але падумаў, што гэта ўжо нічога не вырашае.

Ён зняў з сябе кашулю, потым хэбэшную саколку, паклаў нож побач і стаў чакаць. Даўно развіднела, за вокнамі чуліся чыесьці галасы. Ён прыслухаўся,

але за дзвярыма па-ранейшаму было ціха. "Машына, — падумаў наборшчык Гутар. — Яны павінны прыехаць на сваім улюбёным для такіх спраў "чорным варанку". Так трапна празвалі нкусаўскую легкавушку ў народзе. Іх будзе трое альбо чацвёра. Звычайна, па чутках, пасылалі траіх.

Ён зноў праверыў, ці добра зачынены дзверы. Хоць было даволі цёпла, ягонае цела, спіна, рукі пакрыліся халоднымі шурпаткамі, а боль у страўніку працяў з нечаканай сілай. Болю ён не жадаў, і таму вынуў з тумбачкі бутэльку, у якой яшчэ было на трэцюю частку гарэлкі, і выпіў. Праз хвіліну боль адпусціў, але якраз у гэты момант ён быццам пачуў гук матора і насцярожыўся. Але зноў усё пацішэла. "Прыходу" ад гарэлкі ён зусім не адчуў, наадварот, у галаве паяснела, думкі пацяклі акрэслена і павольна, толькі ў грудзях дробна дрыжэла і рукі нервова соўгаліся, як у хворага на прыступ ліхаманкі.

Раптоўны стук у акно змусіў яго ўскочыць з месца, падысці ўсутыч да шкла і крыху адгарнуць край фіранкі. Праз вузкую шчыліну ён убачыў суседскага хлопчыка і адгарнуў больш. Хлопчык нешта казаў, але ён не пачуў. Урэшце сэнс яго слоў дайшоў да свядомасці. Хлопчык паказваў у бок дзвярэй і вымаўляў, амаль ужо крычаў:

— Запалкі! Адчыніце, дзядзька! Маці просіць пазычыць запалак! Так, запалак!

Перад тым, як адчыніць, наборшчык Гутар падышоў да другога акна (а іх у ягоным пакойчыку было два) і таксама адгарнуў фіранку. Акно выходзіла на падворак, і раптам у самай глыбіні яго, за клёнам і кустоўем акацый ён убачыў ледзь прыкметны "чорны варанок".

І ён адразу зразумеў: яны прыехалі і, каб заспець яго знянацку, прымусілі суседскага хлопчыка канючыць пад акном. А самі, пэўна, ужо стаіліся за дзвярыма і чакаюць, калі ён адчыніць. “Слугі Сатаны, — успомнілася яму, — вось прыйшлі слугі Сатаны і павялі яго...”

Бязмежная туга нечакана ахапіла наборшчыка Гутара. Але марудзіць не выпадала. Ён адышоў падалей ад дзвярэй, сеў на падлогу з нажом у руках і пачаў думаць пра смерць жонкі і некаторых іншых людзей, адыход якіх з жыцця назіраў сам-насам. Ды часу ў яго ўжо не было — і думаць не выпадала.

У дзверы пастукалі. Але стук быў настойлівы і гучны — так не стаў бы грукаць хлопчык. Ён чакаў. На якую секунду-другую пашкадаваў, што не мае драбавіка ці якой іншай зброі. Іх варта было сустракаць толькі так. Але чамусьці ніхто навокал не сустракаў — ва ўсялякім разе такіх выпадкаў ён не ведаў, хоць і прыходзілі яны ўсё часцей і часцей.

Стук у дзверы перайшоў у грукат. Дзверы захісталіся, з трэскам паехалі ўбок, і ў святле дня ён убачыў цёмныя постаці служак Сатаны: яны былі ў цывільным і з “наганамі” ў руках.

І тады наборшчык Гутар аберуч узняў нож, і з сілай апусціў яго ў правы бок жывата, і адразу павярнуў, рассякаючы жыццёва важныя органы. Так, як рабілі гэта далёкія старажытныя ваяры.

Літаратурна-мастацкае выданне

**СТАНКЕВІЧ Юры Васільевіч**

**БРАМНІК ЗАЎЖДЫ САМОТНЫ**

*Аповесць, апавяданні*

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактар *Віктар Жыбуль*
Карэктар *Марыя Гілевіч*
Мастак *Кацярына Дубовік*
Вёрстка *Наталля Кусцінская*

Падпісана да друку 24.02.2014. Фармат 84x108 1/32
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 7,56. Ул.-выд. арк. 4,36.
Наклад 500 экз. Заказ 2349.

Прыватнае выдавецкае унітарнае
прадпрыемства "Галіяфы".
Запіс № 1/48 у Дзяржаўным рэестры выдаўцоў,
вытворцаў і распаўсюджвальнікаў
друкаваных выданняў.
Вул. Брылеўская, 11-44, 220039, г. Мінск.
E-mail: vish@bk.ru. www.galiafy.by

Друк ТДА "НоваПрынт".
ЛП № 02330/0552786 от 25.02.2009.
Вул. Геалагічная, 59-4-10, 220138, г. Мінск.



Бадай што, пасля таго, як скончу выступаць, ці ў выніку якога няшчаснага выпадку, траўмы мне давядзецца застацца сам-насам з цяжкасцямі, і, магчыма, нікому з тых, хто цяпер апякае мяне, мае праблемы не вельмі будуць патрэбныя. Але брамнік, як я даўно зразумеў, часам адзінокі. Нават — заўсёды самотны. Бо ён вартаўнік, і на ім адным адказнасць за тую браму, якую ён сцеражэ. Неістотна — якую.

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

9 789857 021253

юры станкевіч

БРАМНІК ЗАЎЖДЫ САМОТНЫ